Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
СЕРАДА
№ 208 (26073)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

# Дзелавы цэнтр «Мінск-Сіці» будзе ўзведзены на працягу 10 гадоў

**Рэалізацыю праекта па стварэнні дзелавога цэнтра «Мінск-Сіці» неабходна паскорыць. Такую задачу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паставіў 30 кастрычніка на нарадзе па гэтым пытанні, што праходзіла з удзелам кіраўніцтва расійскай кампаніі ТАА «ІТЭРА Груп».**

«Будаваць трэба значна хутчэй, прапанаваныя 12 гадоў — недазвольная раскоша», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнт даручыў да 1 студзеня 2010 года завяршыць усе работы па пераносе Мінскага авіярамонтнага завода, каб ужо ў 2010 годзе разгарнуць шырокамаштабную забудову гэтай тэрыторыі. На плошчы больш як 300 га плануецца стварыць унікальны гарадок, дзе будзе пабудавана больш як 1,5 млн кв. м камфартабельнага жылля, узведзены аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, размесяцца офісы не менш як тысячы кампаній. «Мінск-Сіці» стане і буйным сацыяльным праектам, які дасць магчымасць стварыць больш як 55 тыс. новых рабочых месцаў. Акрамя таго, прыкметна зменіцца і прылеглая тэрыторыя.

Паводле слоў мэра Мінска Міхаіла Паўлава, гэта будзе самы маштабны праект у сферы будаўніцтва, аналагаў якому ў рэспубліцы яшчэ не было. Для беларускіх спецыялістаў удзел ва ўзвядзенні такога ўнікальнага аб'екта стане сур'ёзнай школай, якая дасць магчымасць у будучым рэалізаваць і больш складаныя праекты.

Асноўным падрадчыкам будаўніцтва выступіць расійская кампанія ТАА «ІТЭРА Груп», з якой Мінгарвыканкам створыць сумесную кампанію. Плануецца таксама прыцягнуць некалькі субінвестараў. Аб'ём інвестыцый у будаўніцтва дзелавога цэнтра «Мінск-Сіці» складзе каля $7 млрд. Як адзначыў Міхаіл Паўлаў, «гэта рэальна пралічаны праект», які будзе акупляцёўлены поўнасцю за кошт інвестараў. Толькі на этапе праектавання затраты складуць каля $200 млн. Кошт праекта ўключае таксама кампенсацыю пераносу авіярамонтнага завода з захаваннем усіх рабочых месцаў.

На стварэнне гэтага ўнікальнага комплексу адведзена не больш як 10 гадоў, аднак асобныя аб'екты будуць здавацца ў эксплуатацыю і раней за гэты тэрмін. Галоўны архітэктар Мінска Віктар Нікіцін паведаміў, што прапанаваны расійскім бокам праект поўнасцю адпавядае таму архітэктурнаму рашэнню, якое было распрацавана мінскімі спецыялістамі, і сёння няма ніякіх перашкод для пачатку праектавання і будаўніцтва аб'ектаў «Мінск-Сіці». У сваю чаргу кіраўнік ТАА «ІТЭРА Груп» Ігар Макараў запэўніў Прэзідэнта, што кампанія мае ўсе магчымасці, у тым ліку фінансавыя, для таго каб паспяхова рэалізаваць праект і гатова неадкладна пачаць работу.

У цэлым Аляксандр Лукашэнка адобрыў падыходы па стварэнні сталічнага дзелавога цэнтра і паставіў задачу падрыхтаваць адпаведны комплексны нарматыўны дакумент, які дасць магчымасць пачаць будаўніцтва.

## НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

Кіраўнікі Мінскай вобласці не дапусцілі значных правалаў у рабоце, аднак яны павінны дабіцца яшчэ большага прагрэсу, сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Генадзь Нявыглас на пасяджэнні Мінскага аблвыканкама. Генадзь Нявыглас заклікаў кіраўнікоў аблвыканкама, абласных структур, старшыняў райгарвыканкамаў працаваць на перспектыву. «Напрыклад, цяпер ёсць праблемы з забеспячэннем перапрацоўчых прадпрыемстваў вобласці малаком у сувязі з ростам паставак на мінскія малаказаводы, — адзначыў ён. — Выйсце адно — атрымліваць больш малака, і тады яго будзе дастаткова ўсім.

**БЕЛТА.**

# БОЛЬШ НАВІН — СВЕЖЫХ І ДОБРЫХ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

*г. Крычаў*

# У НОВЫМ ГОДЗЕ БЕЛАРУСКІЯ ГАЗЕТЫ БУДУЦЬ ВЫХОДЗІЦЬ НА АЙЧЫННАЙ ПАПЕРЫ

Вытворчасць паперы і вагонабудаўніцтва былі ў цэнтры ўвагі кіраўніка ўрада Беларусі Сяргея Сідорскага, які 30 кастрычніка наведаў з рабочым візітам Магілёўскую вобласць. У Шклове прэм'ер пабываў на пляцоўцы, дзе завяршаецца будаўніцтва завода па вырабе газетнай паперы. З 1 снежня там пачнецца абкатка машыны, якая выпрабуе паперу. У сувязі з гэтым С. Сідорскі даручыў да гэтага часу завяршыць работы на ачышчальных збудаваннях. Мантажная арганізацыя «Петразаводскмаш» абяцае да 20 снежня завяршыць наладку машыны, а 25 снежня — прадэманстраваць першую паўнавартасную прадукцыю новага завода.

Сяргей Сідорскі наведаў яшчэ адно шклоўскае прадпрыемства — папяровую фабрыку «Спартак». Там плануецца мадэрнізацыя вытворчасці. Гэтая фабрыка вядома з 1898 года. Цяпер там вырабляецца санітарна-гігіенічная папера і гофракардон. Праект, які дазволіць павялічыць аб'ём вытворчасці, падняць якасць прадукцыі, ацэньваецца ў больш чым 30 млн долараў. Ён будзе ажыццёўлены ў 2008—2009 гадах. Для рэалізацыі праекта плануецца прыцягнуць крэдытныя рэсурсы, сродкі інавацыйных фондаў.

У Магілёве кіраўнік урада пабываў на Магілёўскім аўтазаводзе імя Кірава, які цяпер уваходзіць у склад БелАЗа. На яго вытворчых плошчах месціцца вагонабудаўнічы завод, які перш за ўсё цікавіў Сяргея Сідорскага. Цяпер у Беларусі ёсць вялікая патрэба ў чыгуначных вагонах, якіх пакуль вырабляецца недастаткова.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Шклоўскі раён.*

Аляксандр Косінец:

# «Сённяшнім студэнтам і аспірантам давядзецца ствараць навукаёмісты прадукт, які вызначыць канкурэнтаздольнасць нашай эканомікі»

**30 кастрычніка ў сталічным выставачным комплексе «Белэкспа» адкрылася выстава «Навука і інавацыі Беларусі», прымеркаваная да І з'езда айчынных навукоўцаў. На выставе прадстаўлены дасягненні беларускіх прадпрыемстваў і арганізацый, Нацыянальнай акадэміі навук, міністэрстваў адукацыі, прамысловасці, будаўніцтва, энергетыкі, архітэктуры, «Белнафтахіма» і іншых ведамстваў.**

Як адзначыў на адкрыцці выставы намеснік прэм'ер-міністра, старшыня арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні І з'езда навукоўцаў Аляксандр Косінец, экспазіцыя налічвае больш за 500 навуковых распрацовак, якія забяспечваюць канкурэнтаздольнасць эканомікі нашай дзяржавы, рост сацыяльнага дабрабыту і якасці жыцця насельніцтва. «Гэта інфармацыйныя, камунікацыйныя, сельскагаспадарчыя, касмічныя, лазерныя тэхналогіі, мікраэлектроніка, аўтамабілебудаванне, распрацоўкі, якія паказваюць дасягненні нашай медыцыны і ветэрынарыі. У выставе бяруць удзел прадстаўнікі розных міністэрстваў і ведамстваў, але самае прыемнае, што ўдзельнічаюць студэнты, аспіранты, магістранты. Будучыня — за імі, і ім давядзецца ствараць навукаёмісты прадукт, які вызначыць канкурэнтаздольнасць нашай эканомікі, зазначыў Аляксандр Косінец. Паводле слоў намесніка прэм'ер- міністра, выстава — гэта дэманстрацыя дасягненняў за гады суверэнітэту нашай краіны. «Асабліва, пачынаючы з 1994 года, калі ўдалося дасягнуць пэўных поспехаў у аўтамабілебудаванні і трактарабудаванні, забеспячэнні харчовай бяспекі, энергабяспекі, прыбора- і станкабудаванні, касмічных і нана-тэхналогіях. Гэта і дэманстрацыя таго, з якімі дасягненнямі ідуць вучоныя на з'езд. А непасрэдна на з'ездзе трэба высветліць, якія праблемы неабходна вырашыць у навуковым асяроддзі для таго, каб заўтра ў нас быў яшчэ больш канкурэнтаздольны прадукт, які забяспечыць выхад на сусветныя рынкі і дазволіць вырашыць задачу імпартазамяшчэння».

Старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч заўважыў, што на парадак дня з'езда вынесена адно пытанне: «Роля і задачы навукоўцаў у інавацыйным развіцці краіны». Такім чынам, размова будзе весціся і аб інтэлектуальнай уласнасці, і аб запатрабаванасці навуковых распрацовак, і аб тым, як гарманічна спалучыць навуку, адукацыю і вытворчасць. Міхаіл Мясніковіч высока ацаніў патэнцыял беларускай навукі. «Калі нашых навукоўцаў з задавальненнем запрашаюць, заманьваюць нават, вядучыя навуковыя цэнтры свету, гэта гаворыць пра тое, што патэнцыял вельмі высокі. Задача сёння — максімальна выкарыстаць такі патэнцыял. А гэта залежыць і ад арганізацыі навуковай дзейнасці, і ад сувязі рэальнага сектара эканомікі з навукова-тэхнічным прагрэсам. Больш за дзесятак прадстаўнікоў вядучых навуковых цэнтраў свету будуць гасцямі з'езду беларускіх навукоўцаў.

Старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук адзначыў, што ўвесь дыпламатычны корпус краіны таксама пацвердзіў свой удзел у сустрэчы навукоўцаў. Міхаіл Мясніковіч выказаў меркаванне, што такая сумесная праца спецыялістаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, адукацыі, галіновай навукі, генеральных канструктараў, вядучых навукоўцаў і аспірантаў зломіць карпаратыўную замкнёнасць, якая тармозіць развіццё. «Нягледзячы на тое, што з'езд — афіцыйнае мерапрыемства, рэальна гэта тая падзея, падчас якой звяраюцца ўсе меркаванні».

Адначасова ў выставачным цэнтры «Белэкспа» праходзяць 11-я міжнародная выстава «Аўтабелсэрвіс» і 4-я міжнародная выстава «Белкамунтэх», дзе возьмуць удзел прадстаўнікі 35 краін свету.

**Алена КРАВЕЦ.**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЯЎ

### КАНФЛІКТ КАЛЯ ЛАГЕРА

**Група расійскіх міратворцаў учора мела сутыкненні з прадстаўнікамі МУС Грузіі ў раёне вёскі Ганмухуры каля адміністрацыйнай мяжы з Абхазіяй.**

Паводле версіі расійскага боку, патруль міратворцаў, які займаўся санітарнай праверкай мясцовасці, затрымаў і абязброіў у гэтым раёне пяцярых грузінскіх паліцэйскіх, якія пагражалі расстраляць расіян і спаліць іх БТР. Прадстаўнікі МУС Грузіі ў сваю чаргу заявілі, што расіяне збілі траіх іх супрацоўнікаў і хацелі акружыць з удзелам больш як дзесятка адзінак бранятэхнікі мясцовы маладзёжны патрыятычны лагер.

Улады Грузіі ў свой час заяўлялі, што лагер створаны для правядзення культурных мерапрыемстваў патрыятычнага кшталту. Аднак ААН у ліпені гэтага года заклікала Грузію ўбраць лагер, каб «скараціць магчымасць узнікнення інцыдэнтаў».

### У ІРАК ЦІ НА ВУЛІЦУ

**У пятніцу дзярждэпартамент ЗША аб'явіў, што будзе накіроўваць дыпламатаў замяшчаць вакантныя пасады ў амерыканскай амбасадзе ў Багдадзе пад пагрозай звальнення.**

Ведамства не змагло знайсці добраахвотнікаў прыкладна на 50 пасад у амбасадзе. Кіраўніцтва разаслала кандыдатам пісьмы з запрашэннямі, але калі за 10 дзён ахвотнікаў не знойдзецца, спецыяльная камісія назначыць супрацоўнікаў амбасады ў загадным парадку. Да тых, хто адмовіцца, будуць прынятыя адміністрацыйная меры пакарання, аж да звальнення з дзяржслужбы.

### ДЗЯЦЕЙ — НА ОРГАНЫ?

**Улады афрыканскай краіны Чад абвінавацілі 16 грамадзян краін Еўрасаюза ў выкраданні дзяцей.**

Еўрапейцы хацелі адправіць з краіны ў Францыю самалёт, на борце якога знаходзіліся 103 дзіцяці ва ўзросце ад года да 10. Прэзідэнт Чада Ідрыс Дэбі выказаў меркаванне, што «выкрадальнікі збіраліся прадаць дзяцей педафілам ці забіць для ўнутраных органаў» і паабяцаў ім суровае пакаранне.

Дзевяці грамадзянам Францыі (прадстаўнікам дабрачыннай арганізацыі Zoe's Ark) і тром журналістам прад'яўлены абвінавачванні ў выкраданні непаўналетніх і махлярстве, а экіпажу самалёта ў складзе сямі іспанцаў — у саўдзельніцтве. Еўрапейцы сцвярджалі, што ўсе дзеці былі сіротамі, якіх у Францыі чакалі прыёмныя бацькі, аднак прадстаўнікі UNISEF, якія пагутарылі з дзецьмі, заявілі, што нямa ніякіх доказаў, што дзеці не мелі бацькоў.

Афіцыйна

## ПЫТАННІ ГАРМАНІЗАЦЫІ ЗАКАНАДАЎСТВА Ў СФЕРЫ БАРАЦЬБЫ З ТЭРАРЫЗМАМ, ЗЛАЧЫННАСЦЮ І НАРКАБІЗНЭСАМ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ НА МПА СНД

Міжпарламенцкая асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў праходзіць 30—31 кастрычніка ў Санкт-Пецярбургу. Удзел у ёй прымае дэлегацыя Нацыянальнага сходу Беларусі на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Вадзімам Паповым і старшынёй Савета Рэспублікі Генадзем Навіцкім.

# ЕЎРАПЕЙСКІ МЕТРАПАЛІТЭН ДЛЯ ЕЎРАПЕЙСКАГА ГОРАДА

**Гэтай восенню спраўляюць 30-годдзе як будаўнікі мінскага метрапалітэна, так і тыя, хто праектаваў сталічную падземку — калектыў ААТ «Мінскметрапраект».**

**Усе гэтыя гады праекціроўшчыкі пастаянна былі побач з будаўнікамі і эксплуатацыйнікамі: кансультавалі, ажыццяўлялі аўтарскі нагляд, уносілі неабходныя карэктывы ў праектную дакументацыю — інакш кажучы, жылі адным жыццём.**

**Зараз мінскае метро перавозіць каля 800 тысяч пасажыраў у суткі, што складае 36 працэнтаў агульнага аб'ёму пасажыраперавозак гарадскога грамадскага транспарту. Гэта сур'ёзны поспех, раздзяліць які маюць права і праекціроўшчыкі.**

***Матэрыял з праектнага інстытута чытайце на 6-й старонцы.***

# РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## У СТРУКТУРЫ БДУ НАЛЕТА БУДЗЕ СТВОРАНЫ ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ

Як пракаментаваў карэспандэнту **БЕЛТА** рэктар ВНУ прафесар Васіль Стражаў, у краіне ўзнікла неабходнасць стварэння факультэтаў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў менавіта ў складзе ВНУ — універсітэтаў і акадэмій. Сёння Савет вучоных БДУ прыняў рашэнне аб стварэнні Інстытута журналістыкі, у склад якога ўвойдуць два факультэты — журналістыкі (для тых, хто атрымлівае вышэйшую адукацыю) і факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Плануецца, што ўзначаліць новы інстытут дэкан факультэта журналістыкі Сяргей Дубовік.

## СУД АБАВЯЗАЎ 10 БЫЛЫХ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ ПАГРАНСЛУЖБЫ БЕЛАРУСІ ПАКРЫЦЬ УРОН НА СУМУ БОЛЬШ ЯК BR6 МЛРД

**Судом Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці разгледжана крымінальная справа па іску Беларускага ваеннага пракурора да 10 былых ваеннаслужачых органаў пагранічнай службы аб пакрыцці ўрону, які яны нанеслі, прапускаючы праз мяжу тавары без мытнага афармлення і платы плацяжоў. Суд задаволіў іск у поўным аб'ёме і абавязаў спагнаць з вінаватых больш як Br6 млрд.**

Як паведамілі ў Беларускай ваеннай пракуратуры, у красавіку—чэрвені 2004 года ваеннаслужачыя пагранічнай службы ў пункце прапуску «Каменны Лог» за хабар прапускалі без ажыццяўлення кантролю аўтамабілі з таварамі, якія належалі адной з расійскіх фірмаў. Тым самым яны аказвалі хаўрусніцтва бізнэсменам ва ўхіленні ад платы мытных плацяжоў, што нанесла ўрон дзяржаве ў асабліва буйным памеры. Раней прыгаворам Мінскага міжгарнізоннага ваеннага суда былыя ваеннаслужачыя былі асуджаны да пазбаўлення волі на тэрміны ад 6 да 8 гадоў, патлумачылі ў пракуратуры. Аднак падчас гэтага судовага разгляду не было прынята рашэнне па грамадзянскім іску аб пакрыцці маёмаснага ўрону ў інтарэсах дзяржавы.

**Кар. БЕЛТА.**

## АД ТРЫКАТАЖУ ДА ТУРЭМНЫХ КРАТАЎ

**Чарговую партыю кантрабанднага адзення выявілі беларускія памежнікі сумесна з мытнікамі і міліцыянерамі.**

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, у цягніку «Прага— Масква» супрацоўнікамі праваахоўных органаў былі знойдзены 20 мяшкоў з імпартнымі трыкатажнымі вырабамі агульным коштам больш за 100 мільёнаў рублёў. Праз некаторы час з'явіўся і гаспадар кантрабанднага тавару. Грамадзянін Расіі прапаноўваў беларускім праваахоўнікам 2,5 тыс. долараў за вяртанне трыкатажу. У момант перадачы першай «траншы» хабару ў памеры 1200 долараў расіянін быў затрыманы. Такім чынам кантрабандыст не толькі страціў тавар і грошы, але, магчыма, будзе пазбаўлены волі. За спробу подкупу супрацоўнікаў праваахоўных органаў яму пагражае да сямі гадоў зняволення. Варта адзначыць, што за апошні месяц беларускімі памежнікамі, мытнікамі і міліцыянерамі было спынена ўжо чатыры спробы буйной кантрабанды імпартнага адзення праз нашу тэрыторыю ў Расію. Агульны кошт затрыманага тавару перавысіў паўмільярда рублёў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## ЗАКАЗ НА ЗАБОЙСТВА. КАБ АВАЛОДАЦЬ КВАТЭРАЙ

**Аператыўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй УУС Гродзенскага аблвыканкама і Слонімскага райаддзела міліцыі прадухілілі заказное забойства.**

Кіраўніцтву крымінальнай міліцыі Слонімскага РАУС стала вядома: мясцовы жыхар сумесна з сужыцелькай спрабуе знайсці выканаўцу забойства сваёй 17-гадовай пляменніцы, каб авалодаць яе кватэрай, якая дасталася дзяўчыне ў спадчыну. Паслугі кілера былі ацэнены ў 600 амерыканскіх долараў.

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Гродзенскага УУС, па ўзгадненні з пракуратурай было вырашана правесці следчы эксперымент. Патэнцыяльны кілер атрымаў ад заказчыка забойства 100 долараў авансу з фатаграфіяй і нумарам мабільнага тэлефона дзяўчыны, а таксама перароблены для стральбы шарыкамі пнеўматычны пісталет і шнур-пятлю.

Пасля праведзенай інсцэніроўкі забойства «выканаўца» прадэманстраваў заказчыку запіс на мабільным тэлефоне з адпаведным доказам, пасля чаго «кілеру» была перададзена асноўная сума — 500 долараў. У гэты момант на запясцях заказчыка і зашчоўкнуліся наручнікі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# «Беларусам стане даступны сучасны, цёплы, экалагічна чысты будаўнічы матэрыял»

## ААТ «Завод керамзітавага гравію г. Новалукомль» адзначыць свой 30-гадовы юбілей

***За трыццаць гадоў работы прадпрыемству ўдалося выпусціць амаль 11 мільёнаў кубаметраў керамзітавага гравію. Каб лепш сабе ўявіць — гэта чыгуначны састаў, даўжынёй каля трох тысяч кіламетраў.***

***Нягледзячы на тое, што керамзітавы гравій — матэрыял не «гучны», сёння цяжка знайсці будаўнічы аб'ект, на якім ён не выкарыстоўваўся б. Усе буйнейшыя будоўлі апошняга часу, якія на слыху ў беларусаў, паспяхова прымянялі дробненькія гліняныя каменьчыкі з Новалукомля. Не абышліся без іх і на ўзвядзенні Нацыянальнай бібліятэкі, оперnага тэатра, падземнага горада на плошчы Незалежнасці (гандлёвы цэнтр «Сталіца»)…***

**Прадстаўнікі працоўнай дынастыі ЦІМАФЕЕВЫХ Рыгор Пятровіч і яго сын Дзмітрый.**

— У Беларусі рэалізуюцца інвестыцыйныя праекты па набыцці аўтаматызаваных тэхналагічных ліній нямецкай вытворчасці для вытворчасці сценавога матэрыялу на аснове керамзіту. Гэта значыць, што будаўнічы матэрыял еўрапейскага ўзроўню ў вялікай колькасці хутка з'явіцца на айчынным рынку, — расказаў **дырэктар прадпрыемства Міхаіл ЛАЗАРАШВІЛІ**. — Выпуск керамзітавых блокаў наладзяць заводы Мінск-жалезабетон і Эфектыўных прамысловых канструкцый. Іх агульная магутнасць складзе каля 300 тысяч кубаметраў. Гэта вельмі многа. Для параўнання — на даволі вялікі катэдж дастаткова 100 метраў кубічных.

З аднаго боку такая сітуацыя на рынку будаўнічых матэрыялаў не можа не радаваць — беларусам стане даступны сучасны, цёплы, экалагічна чысты матэрыял. Аднак у такой узрастаючай патрэбе на керамзітавы гравій з пункту гледжання прадпрыемства ёсць і адваротны бок. Справа ў тым, што завод традыцыйна з'яўляецца экспарцёрам. Яшчэ ў сярэдзіне 80-х наша прадпрыемства пачало пастаўляць сваю прадукцыю ў Швецыю. Пазней заключэнне Нямецкага інстытута экспертызы будаўнічых матэрыялаў, якое дало нам права на СЕ маркіроўку, па сутнасці адкрыла дзверы нашай прадукцыі на рынкі краін Еўрапейскай супольнасці. Апошнім часам доля экспарту дасягнула 50 працэнтаў у агульных аб'ёмах рэалізацыі. Прычым, гэта экспарт менавіта ў краіны Еўрасаюза. Нам вельмі выгадна прадаваць прадукцыю за мяжу. Аднак мы будзем вымушаны істотна скараціць экспарт ці ўвогуле ад яго адмовіцца, каб насыціць унутраны рынак...

**— Тут паўстае заканамернае пытанне – чаму завод не развівае вытворчыя магутнасці?**

**Няспынным патокам рухаюцца з кар'ера аўтасамазвалы з глінай у накірунку да керамзітавага завода.**



— Мы гэтым актыўна займаемся ўжо не першы год. Сітуацыю з развіццём рынку будматэрыялаў і выкарыстаннем керамзіту ў іх вытворчасці мы прадугадалі. Больш за тое, самі актыўна займаліся папулярызацыяй нашай прадукцыі не толькі за мяжой, але і ў Беларусі. Так, у 2005 годзе мы павялічылі нашы магутнасці на 40 працэнтаў — з 350 тысяч кубаметраў да 600 тысяч у год. Такі скачок лёгка не даўся. І пасля гэтага прарыву мы лічылі, што такога павялічанага выпуску керамзітавага гравію хопіць на некалькі гадоў. Так яно ўласна і адбылося. 2008 год паставіў перад прадпрыемствам новыя задачы. Для насычэння патрэбы ўнутранага рынку ў керамзітавым гравіі, намі былі прыцягнуты інвестыцыі ў стварэнне вытворчасці керамзіту ў Гродзенскай вобласці ў горадзе Ліда. На базе напаўзакінутага керамзітавага завода створана сумеснае прадпрыемства, дзе грашовыя інвестыцыі зрабіў латвійскі бок, а "ноў-хаў" — інжынерная падрыхтоўка — нашага прадпрыемства. Вельмі важна, што яна ацэнена ва ўласнасці СП. Іншымі словамі, мы ўжо атрымліваем грошы не толькі за прадукцыю, але і за "мазгі". Для нашай краіны гэта своеасаблівы прэцэдэнт. У красавіку-маі будучага года адбудзецца пуск гэтага завода. У строй будуць уведзены магутнасці па выпуску каля 200 тысяч метраў кубічных керамзітавага гравію. Вельмі спадзяюся, што сумарны выпуск прадукцыі нашымі двума заводамі дазволіць ужо ў бліжэйшы час, па-першае, задаволіць патрэбу айчынных спажыўцоў керамзіту, а па-другое, не згубіць такую важную для нас нішу на замежных рынках. Хоць, безумоўна, пра далейшую будучыню "цёплага матэрыялу", нарошчванне магутнасцяў трэба думаць ужо сёння. У свой час у рэспубліцы нават была прынятая адпаведная праграма. Цяпер нам давядзецца гэта рабіць самім.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.10.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 151,00 |
| 1 еўра | 3 096,58 |
| 1 латвійскі лат | 4 407,79 |
| 1 літоўскі літ | 896,51 |
| 1 чэшская крона | 114,99 |
| 1 польскі злоты | 853,01 |
| 1 расійскі рубель | 87,00 |
| 1 украінская грыўня | 425,86 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,7238 |
| 10 UAH | 48,9212 |
| 1000 BYR | 11,4828 |
| EUR | 35,5874 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 30.10.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпісьмецца на часопіс «Главный бухгалтер». ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

## Сямейны псіхолаг
Святлана Анішчанкава

# Каханне з прысмакам жыцця, або Хто галоўны

Вяселле, кветкі, шчасце, абяцанні заўсёды даўняць адзін аднаму ўсе свае клопаты і радасці... Пярсцёнкі надзеты — замкнулася кола: «цяпер мы разам назаўсёды». Справа зроблена, улегліся хваляванні, спадае захапленне дачынення да дарослага незалежнага жыцця, пажылі крыху ў казцы і хопіць, час станавіцца «сур'ёзнымі людзьмі». Маладыя пачынаюць з апаскай прыглядацца адно да аднаго. Дзіўныя словы, незразумелыя рэакцыі, да гэтага часу непрыкметныя ў эйфарыі страсці, гульні ў нявесту і жаніха — дзіўна рэчуць вуха. Вось яна ўстала раніцай у дрэнным настроі, такая звычайная, у халаце, а дзе ж тая прыгажуня, якая здавалася ідэалам? Любімыя заспаныя вочы, першыя родныя маршчынкі — гэта будзе пасля (калі пашанцуе). А пакуль...

Згодна са статыстыкай, маладыя пары ва ўзросце 20—25 гадоў перажываюць свой першы «крызіс» праз 3—6 месяцаў пасля шлюбу, калі натуральнае бытавое асяроддзе прапануе прайсці першыя абавязковыя іспыты на трываласць. Усім вядома — сапраўднае каханне прымае ўсе недахопы.

Сямейная пара пачынае «прынюхвацца» адзін да аднаго — ідзе барацьба «ўсіх часоў і народаў», пераможцаў у якой — няма. Мужчына і жанчына адначасова, але па-рознаму, незалежна адзін ад аднаго вызначаюць, як жыць — разам ці паасобку, але побач. І як правіла менавіта ў гэты перыяд закладваецца база далейшых сямейных адносінаў — шчаслівых або тых, што вядуць да драмы.

Вось тут мудрае вока бацькоў і павінна ўлавіць змяненні, якія адбываюцца з маладымі, і падтрымаць стваральную форму развіцця маладой сям'і або пастарацца памяркоўна прыняць «няўдалую спробу» стварыць сям'ю. Але, як правіла, адыгрываўшы прыгожае вяселле, патраціўшы нямала сілаў і сродкаў на правядзенне «першага акта тэатральнага прадстаўлення», мудрыя бацькі са словамі «злюбіцца-сцерпіцца» знаходзяцца ў глыбіні сваіх жыццёвых клопатаў, пакідаючы «варыцца» ва ўласных праблемах і канфліктах маладых напужаных закаханых. А тыя, зачыніўшы на замок «пакой кахання», грукаюць «дзвярыма» недаверу, падазронасці, няўменне саступаць, дараваць і прымаць. Мы ж бачым збоку, што ўсё гэта тое ж каханне, толькі з прысмакам сапраўднага жыцця, у якім бывае рознае, і мы гэта «рознае» ўжо прайшлі, нам яно знаёмае і не страшнае, нам сумна — «але, на жаль, нічога не зробіш, трэба і ім праз гэта прайсці...» А ці трэба? Ці трэба высвятляць: каму мыць посуд ці прыбіраць у кватэры? У каго тата выносіць смецце? Гэтыя бытавыя нюансы, нязначныя дробязі, так знаёмыя нам з дзяцінства, вымотваюць эмацыянальна значна больш, чым просты механічны працэс мыцця трох талерак і два крокі да смеццевага бачка. Але не, мы прывучаны ў шлюбе спаборнічаць, высвятляць, часта несвядома, хто галоўны.

Горш за тое, калі пара па нейкай дзіўнай прычыне знаходзіцца ў гармоніі, не марнуе сябе дробязямі, калі магутны інстынкт жыцця расцвітае, перамагаючы недарэчнасці, нам становіцца неяк няўтульна і трывожна, мы спяшаемся схавацца за банальныя фразы: «дзе твая жаночая гордасць?!.» ці «вось у Танькі муж — сапраўдны мужчына, а твой — «подкаблучник» і г.д. Куды падзеліся мудрыя добрыя людзі, якія, прайшоўшы значны адрэзак жыцця, прыйшлі без дапамогі псіхалогіі да ісціны аб тым, што падтрымка блізкага — гэта наш адзіны шанц быць шчаслівым. Чаму многія так і не захацелі навучыцца спачуванню і разуменню чалавека ва ўсёй яго сапраўднай прастаце з заслугамі і недахопамі? Чаму мы працягваем глядзець на свет праз прызму сваіх комплексаў і глыбока схаванага пачуцця віны? Магчыма, пабаяліся быць «нягордай», быць «подкаблучником», пабаяліся сказаць з пяшчотай: «Я цябе кахаю», і з гордасцю: «Дзякуй, што ты — ёсць»? Але быць шчаслівым — ніколі не позна!

Заканчэнне «тэатральнага паказу», які так прыгожа пачаўся, рознае ва ўсіх. Ці будзе асноўная частка радаснай, у многім залежыць ад пераемнасці пакаленняў, мудрай непрыкметнай падтрымкі старэйшых, разумення сямейных каштоўнасцяў — таго багацця, якое з'яўляецца самай дарагой спадчынай.

Беражыце сябе і будзьце шчаслівыя.

**Ваша С.С.**

# Экзаменатарам загадана не эканоміць час

**Дзяржаўтаінспекцыя ўзмацніла патрабаванні да здачы практычнага экзамену на атрыманне пасведчання кіроўцы аўтамабіля.**

Як паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ МУС Беларусі Яўген Карповіч, зараз на прыём іспыту па кіраванні транспартным сродкам у гарадскіх умовах на аднаго курсанта адводзіцца не менш за 20 хвілін. Паводле яго слоў, ранейшая «норма» для прыёму практычнага іспыту фактычна не мела дакладнай мінімальнай мяжы: на вызначэнне ўзроўню майстэрства курсанта адводзілася да 20 хвілін. Інакш кажучы, жорсткага патрабавання не было, і таму нярэдка для атрымання запаветнага пасведчання курсанту дастаткова было праехаць усяго некалькі сотняў метраў. Зразумела, што ў выніку такой паспешлівасці на дарогах краіны з'явілася даволі небяспечная «група рызыкі на колах». Як паведаміў Яўген Карповіч, кіроўцы са стажам да 1 года трапляюць прыкладна ў кожнае чацвёртае ДТЗ. А самае трывожнае, што сёлета назіраецца тэндэнцыя да павелічэння колькасці ахвяраў аварый, здзейсненых учарашнімі выпускнікамі аўташкол. Напрыклад, летась кіроўцамі са стажам да 2 гадоў здзейснена амаль 500 ДТЗ, у выніку якіх загінулі 97 чалавек. У гэтым годзе смяротнымі ахвярамі малавопытных кіроўцаў сталі ўжо амаль 70 чалавек. Таму кіраўніцтва Дзяржаўтаінспекцыі і загадала экзаменатарам не эканоміць часу на прыём іспытаў па кіраванні легкавым аўтамабілем. Прадстаўнік ДАІ заявіў, што прыкладна на пачатку снежня гэтага года ўступіць у сілу новая рэдакцыя Палажэння аб прыёме кваліфікацыйнага экзамену на атрыманне права кіравання механічнымі транспартнымі сродкамі. Калі гэты дакумент будзе канчаткова зацверджаны кіраўніком МУС, то здача практычнага экзамену будзе адбывацца ў асноўным толькі на гарадскіх вуліцах і на дарогах за межамі населеных пунктаў. На пляцоўцы дастаткова будзе толькі крануцца з месца на пад'ёме. Уменне заязджаць задні ходам у гараж і дыяганальна паркавацца «даішнікі» правяраць не будуць. Увогуле, як паведаміў Яўген Карповіч, кіроўцы са стажам да 1 года плануе зусім адмовіцца ад практыкі здачы курсантамі іспытаў на пляцоўцы. Бо звычайна аварыі, прычым, з трагічнымі наступствамі, нявопытныя кіроўцы ўчыняюць не падчас паркоўкі, заязду ў гараж ці пры краненні з месца на пад'ёме, а ў момант руху на вялікай хуткасці па аўтамагістралях, а таксама па вуліцах населеных пунктаў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# ТЭХНАПАРК НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

**Напярэдадні І з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь у Гродне адбылося пашыранае пасяджэнне Саветаў трох дзяржаўных універсітэтаў — аграрнага, імя Янкі Купалы і медыцынскага.**

Удзельнікі пасяджэння выказаліся за тое, каб сумесна з аблвыканкамам вырашыць пытанне аб стварэнні ў вобласці Тэхнапарка, а таксама да канца гэтага года сфарміраваць заданні рэгіянальнай навукова-тэхнічнай праграмы Гродзенскай вобласці «Распрацоўка тэхналогій тэхнічных сродкаў, якія забяспечваюць устойлівае інавацыйнае развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і сацыяльнай сферы». Дэлегатам І з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь рэкамендавана абмеркаваць на секцыйных пасяджэннях пытанні фінансавання фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка параіў вучоным часцей сустракацца з кіраўнікамі прадпрыемстваў і запэўніў, што будзе забяспечана фінансавая падтрымка ўкараненню новых тэхналогій, у прыватнасці, што датычыцца перапрацоўкі мяса і малака. Паводле яго слоў, грошай на тэхналогіі хапае, былі б толькі цікавыя праекты.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## КЛІН КЛІНАМ ВЫБІВАЮЦЬ

У Гомелі стартавала першая ў Беларусі праграма па лячэнні нарказалежных асобаў метадонам, паведаміў галоўны ўрач Мінскага гарадскога наркалагічнага дыспансэра Сяргей Малочка. Прайсці курс захацелі толькі сем чалавек, хоць праграма разлічана на лячэнне адразу 50 наркаманаў. Асцярожнасць аматараў «кайфу» тлумачыцца іх бояззю трапіць на афіцыйны ўлік.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# У Казахстана і Беларусі аднолькавыя мэты і падобныя шляхі іх дасягнення

Аб гэтым, у прыватнасці, гаварыў кіраўнік дыпламатычнай місіі гэтай дзяржавы ў Мінску Булат Іскакаў. На прэс-канферэнцыі з нагоды святкавання Дня Казахстана ён адной са стратэгічных задач сваёй дзяржавы назваў планы яе кіраўніцтва да 2030 года ўвайсці 50 самых развітых і канкурэнтаздольных краін свету. Ужо вызначаны 30, як сказаў пасол, «прарыўных» праектаў. У выніку павінен істотна змяніцца сыравінны характар эканомікі, прыярытэт атрымае развіццё навукаёмістых галін...

Заўважым, падобныя ў нечым амбіцыйныя мэты і ў нашай краіны. Ужо нават па гэтай прычыне Казахстан для нас — важны эканамічны і палітычны партнёр. Як і мы, Казахстан імкнецца замацаваць сваю прысутнасць на перспектыўных рынках Расіі, Кітая, Індыі... Невыпадкова, паводле слоў Булата Іскакава, адносіны абедзвюх краін набралі ўстойлівую пазітыўную дынаміку развіцця.

За апошнія пяць гадоў аб'ём гандлёвага тавараабароту вырас амаль у дзесяць разоў — з 36,6 млн долараў ЗША ў 2001 годзе да 334 млн долараў ЗША ў 2006-м. Ёсць усе умовы ў блізкай перспектыве давесці гэты паказчык да 1 млрд долараў ЗША.

Як адзначыў Булат Іскакаў, моцны імпульс двухбаковым адносінам у сферы эканомікі надаў нядаўні візіт у Казахстан прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага. Увогуле Казахстан зацікаўлены ў росце паставак беларускіх трактароў, камбаўнаў, іншай сельскагаспадарчай тэхнікі, наладжванні пунктаў яе сэрвіснага абслугоўвання ў рэгіёнах. У гэтым сэнсе знакавай падзеяй стаў удзел Сяргея Сідорскага ў цырымоніі адкрыцця сумеснай зборчай вытворчасці беларускіх трактароў у горадзе Паўладар. Там мяркуецца пакуль выпускаць 1000 «Беларусаў», а ўжо праз два гады давесці гэту лічбу да 5000.

Таксама пасол лічыць перспектыўным супрацоўніцтва ў паліўна-энергетычнай сферы. Казахстан станоўча ацэньвае патэнцыял нашай краіны па транспарціроўцы нафты і газу, магчымасці Беларусі ў галіне нафтаперапрацоўкі. Адсюль і сумеснае рашэнне аб стварэнні спецыяльнай групы, якой трэба будзе вызначыць прынцыпы і ўмовы транзіту, паставак казахстанскай нафты і г.д.

Нядаўна ў Астане выдзелены зямельны ўчастак (каля 12 гектараў) для будаўніцтва гандлёва-выставачнага цэнтра Беларусі...

Для ўвекавечвання памяці воінаў-казахстанцаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі, у Мінску будзе ўсталявана стэла.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# ДЗЕНЬ УСІХ СВЯТЫХ
## і некалькі слоў пра Хэлоўін

**1 лістапада Каталіцкі Касцёл адзначае ўрачыстасць Усіх Святых. У гэты дзень вернікі дзякуюць Богу за дар святасці і ў адной літургічнай службе аддаюць пашану ўсім святым — як вядомым, так і невядомым.**

Дзень 1 лістапада нагадвае хрысціянам аб закліку да святасці. Кожны з вернікаў, жыве ён у шлюбе альбо абраў шлях манаства ці свяшчэнства, закліканы да святасці. Тэалогія кажа, што кожны атрымаў дар збаўлення, бо Хрыстос прынёс сябе ў ахвяру за ўсё чалавецтва. Аднак ад кожнага чалавека паасобку залежыць, наколькі ён прымае ад Бога гэты дар святасці.

Наступны дзень, 2 лістапада, прысвечаны ўспаміну ўсіх памерлых вернікаў. Згодна з традыцыяй, у гэты дзень прынята наведваць могілкі і асаблівым чынам маліцца за памерлых.

Каталікі перад святамі прыбіраюць магілы сваіх родных і блізкіх, а таксама занядбаныя магілы паблізу. Святары нагадваюць, што згодна з каталіцкай традыцыяй недапушчальна прыносіць і спажываць на могілках ежу і спіртныя напоі, а таксама класці іх на магілы. Годным успамінам пра памерлых з'яўляецца запаленая на магіле свечка (або зніч) і кветкі, але перш за ўсё — малітва за супакой душы.

— На жаль, апошнім часам у Беларусі пачалі з'яўляцца праявы чужых звычаяў, не характэрныя для нашай культуры, якая мае хрысціянскія карані, — заўважае адказны за СМІ пры Сакратарыяце Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі ксёндз Аляксандр Амяльчэня. — З кожным годам у нашай краіне ўсё больш маштабна адзначаецца так званы «хэлоўін» — свята, запазычанае з Амерыкі. Гэтаму спрыяе такама магутная рэкламная кампанія «індустрыі жахаў», штогадовыя прыбыткі якой у Злучаных Штатах складаюць да паловы мільярда долараў. І хоць для большасці людзей «хэлоўін» — гэта толькі пэўная забава, аднак у рэчаіснасці ўсё значна больш небяспечна, чым здаецца.

Справа ў тым, тлумачыць ксёндз Аляксандр, што старажытнае кельцкае свята было прынятае сатаністамі, якія ў гэтую ноч праводзяць свае жахлівыя абрады, звязаныя з прынясеннем у ахвяру жывёл і людзей. Амерыканская паліцыя канстатуе, што напярэдадні «хэлоўіна» знікае значна больш хатніх жывёл і маленькіх дзяцей, чым у іншы час. Складанне ў ахвяру сатане маленькіх дзяцей у ноч «хэлоўіна» — гэта не байка, што і пацвярджаецца сведчаннямі былых адэптаў сатанінскіх сектаў. Асабліваю ўвагу гэтаму свяцу надаюць таксама і тыя, хто цікавіцца акультызмам, магіяй, спірытызмам.

Кожны хрысціянін павінен памятаць, што ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных адзначэнню «хэлоўіна», несумяшчальны з яго вераю, — падкрэслівае айцец Аляксандр. — Таму на Захадзе сярод хрысціянскай моладзі як прэстэж супрацьстаяння насаджэння антыхрысціянскіх каштоўнасцяў праводзіцца акцыя пад назваю Holly Win — «Святая перамога». У гэтую ноч тысячы маладых хрысціянаў у розных гарадах Еўропы збіраюцца ў храмах на ўсю ноч для малення, прысвечанае перамозе Хрыста над смерцю, сатаной і пеклам. Пераможцамі сатаны з'яўляюцца таксама і ўсе святыя, урачыстасць якіх святкуецца 1 лістапада. Любыя спекуляцыі на тэму таго, што «хэлоўін» нібы паходзіць з каталіцкай традыцыі, не адпавядаюць сапраўднасці.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Дзённік Вікі Ц.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Я гляджу на яго напалову замілавана, напалову з нянавісцю. Хто ўчора раптоўна, без папярэджання «памёр», і я праспала самым бессаромным чынам? Хто вечна губляецца так, што ператрасеш увесь дом, перш чым знойдзеш, дый тое па крыку? А зараз хто ўпарта робіць выгляд, што ён «не пры справах», і пакуль не паесць, з навакольным светам стасавацца адмаўляецца? Дарэчы, куды падзеліся толькі пазаўчора выдадзеныя табе грошы? І калі ты ўжо наясіся, мой персанальны энергетычны крывасмок...**

# Зямля, зямля, палёт нармальны...

*31.10.2007*

Тэлефон даўным-даўно перастаў быць выключна зручным сродкам сувязі. Цяпер гэта і статусная прымета — у каго плацінавы Vertu, у каго дапатопная мадэль, больш падобная да рацыі радыстki Кэт, і модны сімвал — зменныя каляровыя панэлі, цюнінг, аэраграфія, ланцужкі, каменьчыкі і ўсё астатняе, што падкрэслівае густ уладальніка, і жаданая цацка — як некалі дзеці марылі пра джынсы, так зараз радасна віскочуць ад мабільнікаў з наварочанай камерай, FM-прыёмнікам і MP3-прайгравальнікам.

А яшчэ гэта — нябачны павадок, на які мы прывязваемся абсалютна добраахвотна. Вось пасярод вуліцы разгублена застывае дзяўчына, прыціскаючы да вуха трубку. Мяркуючы па ўсім, пачула пытанне — лідар у хіт-парадзе недарэчнасцяў — «Ты дзе?». Больш ідыёцкім можа быць толькі адказ: «Я тут». Вось хлопец у маршрутцы, беспаспяхова прыніжаючы голас, апраўдваецца перад нябачным абвінаваўцам — але мадэль тэлефона старая, і раўнівыя «наезды» міжволі чуе ўся маршрутка. Вось заклапочаную жанчыну з клункамі работа дагнала ўжо ля самых дзвярэй пад'езда, і яна спрабуе ўзгадніць бухгалтарскі баланс на адлегласці. Нікога даўно не здзіўляюць мабільныя трэлі пасярод канцэрта ці кінасеанса, на лекцыі ці ў музеі, ці хоць бы, пардон, з кабінкі «Эм і Жо». Тэлевядучы Андрэй Малахаў нават расказваў пра выпадак, калі здымачная група прыйшла на хаўтуры калегі, і непасрэдна на могілках вымушана была дамаўляцца па тэлефонах пра заўтрашнія здымкі; а што зробіш — жыццё... Тэлефон штодня кантралюе цябе лепш за ўсе спецслужбы, разам узятыя, падключае да агульнай матрыцы, не прымаючы ў разлік часовую і прасторавую адлегласці. Варта толькі выйсці кудысьці на хвіліначку, як раздаецца кантрольны званок: ты дзе, ты навошта, ты калі вернешся? Ды яшчэ навакольныя абураюцца, калі не бярэш трубку, як быццам лічаць, што доступ да цела павінен быць ім забяспечаны кругласутачна. Некалі, яшчэ ў да-пэйджынгавую эпоху, добра было пагаварыць хоць бы ўвечары — калі ў сураз-моўцы быў хатні тэлефон; калі не было, то і ў госці зазірнуць не грэх. Зараз усё інакш: мы злуемся, тэлефануючы трэці раз за гадзіну і чуючы ў адказ механічнае: «Абанент часова недаступны». Як гэта — недаступны, калі справа тэрміновая і неадкладная?! Часам, каб узяць перадышку ад паўсядзённай мітусні, дастаткова ўсяго толькі на дзень выключыць гэту неонававокую пачвару. І добра было б яшчэ выдаваць на лінію паведамленне: «Абанент спіць, есць, знаходзіцца ў неадэкваце альбо проста не хоча ні з кім размаўляць». А часам сотавы, наадварот, выключаецца самастойна — як правіла, калі чакаеш важнага званка. Быццам помсціць, як жывая істота.

Прыметы часу: у кампаніі маладых людзей у лепшым выпадку ў аднаго ёсць гадзіннік, астатнія звяраюць час па экране мабільнага тэлефона. Прывыкаючы да калькулятара ў панэлі інструментаў, забываюцца нават на школьную табліцу множання. Пра «склерознік» — запіс электронных напамінаў самому сабе — і казаць лішні раз не трэба. Яшчэ адна адметнасць: раней лічылася крутым, калі ў чалавека некалькі мабільнікаў. Зараз гэта, як правіла, дазваляе эканоміць, падключыўшыся да розных аператараў. Мець усяго адзін апарат і адну сім-карту дазваляюць сабе толькі багатыя і лянівыя, усе астатнія дакладна разлічваюць, на які тарыф і да якога аператара больш выгадна падключацца. Адна з сябровак ніколі не размаўляе са мной больш за хвіліну — не таму, што размова непрыемная, а таму, што ёй гэта хвіліна каштуе 450 рублёў. Мне, праўда, 260 — але ж да гэтай дзяўчыны трэба яшчэ ўмець дазваніцца...

Яшчэ адна прымета: у дзяцінстве мы завучвалі свой адрас, індэкс і тэлефон на памяць так, каб ад зубоў адскоквала («калі раптам заблудзішся, скажаш міліцыі свой адрас», — вучылі нас бабулі). Зараз усё больш людзей не памятаюць свой мабільны нумар — у кагосьці яны мяняюцца, як пальчаткі, у кагосьці проста ў галаву не ўкладваюцца дванаццаць лічбаў. Выйсце знаходзіцца: «Мой нумар? Давай лепш я табе ператэлефаную, запішаш». Але асадак, як кажуць, застаецца.

Навучаюся ўжо новаму — сотаваму — этыкету тэлефонных размоў, мы паступова развучаемся весці размовы звычайныя. Пакаленне next віртуозна набірае на хуткасць SMS-кі, але ўсё горш піша сачыненні, і ўжо мала ведае, што ўяўляе з сябе эпісталярны жанр. Чуючы «достать чернил и плакать», смяюцца — чарніла ў сучаснай моладзі не выклікае асацыяцый з пісьмом. Гэта, бадай, найгоршая прымета часу — падмена жывых стасункаў хуткаснымі «перазвонамі». З адным маім сябрам мы не бачыліся ўжо гады тры. Жывём у адным горадзе, нават на адной лініі метро. Ведаем нумары мабільных тэлефонаў адзін аднаго. І гэтага як быццам дастаткова — калі што, заўжды можам звязацца. Калі што. Калі — што? Так і застаецца гэта магчымасць ілюзорнай. І нават калі гульня ў адзін пальчык і некалькі кнопак скончыцца паспяхова, што мы з ім скажам у эфір? «Прывітанне, як жыццё? — Нармальна. А ў цябе? — І ў мяне нармальна. Ну, да сувязі». Вось і пагаварылі. Нармальна так...

**14 ноября 2007 г.**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «КАМВОЛЬ»**

**Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4 этаж главного корпуса.**

*Повестка дня:*

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Камволь».

*Докл.: Бердникова Н.А. — зам. генерального директора по экономическим вопросам.*

2. О внесении изменений в Устав Общества.

*Докл.: Козорезова О.Н. — начальник юридического отдела.*

3. О ликвидации УП «Камвольтекс».

*Докл.: Козорезова О.Н. — начальник юридического отдела.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, ком. 204, тел.: 223 14 20, 2-97.

***Начало работы собрания 15.00.***

Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45.

*Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 01.11.2007 г.*

**Для регистрации при себе иметь паспорт.**




## Аўтаадказчык

### НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ ГЛУШЫЦЬ

**Некаторыя аўтааматары раяць перад тым як заглушыць машыну, даць ёй хвіліну-другую папрацаваць на халастых абаротах. А я, наадварот, перад тым як выключыць рухавік, некалькі разоў цісну на педаль газу. Так, дарэчы, робяць многія мае знаёмыя. Які спосаб усё ж правільны?**

**Ірына Фёдарава,** *г. Мінск*

Вопытныя аўтааматары раяць усё ж не выключаць рухавік на вялікіх абаротах, а даць яму папрацаваць на халастых. Чым гэта абумоўлена? Па-першае, калі рухавік заглушыць на вялікіх абаротах, то імгненна спыніць працу і помпа, якая яго ахалоджвае. А гэта значыць, што адбудзецца кароткачасовы перагрэў рухавіка. Іншая справа, калі заглушыць аўто на халастых. У такім выпадку тэмпература рухавіка паспявае паступова стабілізавацца і дэталі не псуюцца. Па-другое, выключэнне рухавіка на вялікіх абаротах можа прывесці да пашкоджання «электрыкі» аўтамабіля, бо рэле-рэгулятар у такім выпадку не здолее стабілізаваць напружанне ў бартавой сетцы.

## Аўтабяспека

### НЕ БАЛБАЧЫ!

Сёлета на тэрыторыі Брэсцкай вобласці да адміністрацыйнай адказнасці за размовы па мабільным тэлефоне прыцягнуты 1932 кіроўцы.

Такую інфармацыю паведаміла інспектар ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама Наталля Сахарчук. Паводле яе звестак, многія кіроўцы не ўсвядамляюць, што размова па мабільніку істотна ўплывае на бяспеку дарожнага руху: рэакцыя пагаршаецца амаль на трэць. Дарэчы, сёлета на Брэстчыне менавіта па віне «балбатуноў» здзейснена тры аварыі.

## Аўтарэйтынг

### ЛЕПШАЯ З ПАТРЫМАНЫХ

Англійскае выданне «WhatCar» падвяло вынікі конкурсу на тытул самага лепшага патрыманага аўтамабіля ва ўзросце ад трох да пяці гадоў. У конкурсе прынялі ўдзел 48 найбольш папулярных на другасным рынку аўтамабільных марак. Лепшай мадэллю сярод усіх намінантаў аўтарытэтнае журы прызнала «Mazda6» з аб'ёмам рухавіка 2 тыс.куб.см. Гэты аўтамабіль практычна не губляе свайго кошту на працягу першых пяці гадоў эксплуатацыі, вельмі надзейны і не карыстаецца папулярнасцю ў аўтазладзеяў.

## Аўтакур'ёз

### ПАКАРАННЕ НА ТРЭНАЖОРЫ

Дарожная паліцыя польскага горада Шчэцын практыкуе даволі арыгінальны спосаб выхавання кіроўцаў, якія ігнаруюць рамяні бяспекі.

Непрышпіленым парушальнікам прапануюць на выбар: альбо заплаціць штраф у памеры 100 злотых (прыкладна 35 долараў), альбо прайсці выпрабаванне на спецыяльным трэнажоры, які імітуе сутыкненне транспартных сродкаў. Як запэўніваюць паліцэйскія, пасля такога выхаваўчага працэсу кіроўцы на ўласнай скуры адчуваюць патрэбу ў рамянях бяспекі.

## Аўтажарт

*— Паслухайце, калі я куплю ў вас машыну, то вы абяцалі, што на працягу года будзеце мяняць усё, што ў мяне сапсуецца альбо паломіцца. Гэта сапраўды так? — удакладняе кліент у аўтадылера.*

*— Безумоўна, калі паломкі адбыліся па нашай віне.*

*— У такім выпадку, калі ласка, замяніце мне чатыры зубы і дзве рабрыны, якія зламаў па віне набытага ў вас аўтамабіля.*

# Парадак вылучэння і прадстаўлення работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2008 года

*Камітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь абвяшчае конкурс работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2008 года.*

*Вылучэнне і прадстаўленне работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь, афармленне дакументаў і прыкладаемых да іх матэрыялаў павінны адпавядаць дадзенаму Парадку вылучэння і прадстаўлення работ на саісканне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2008 года, распрацаванаму ў адпаведнасці з Палажэннем аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 года № 300 «Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь».*

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь (далей — Дзяржаўная прэмія) з'яўляецца сведчаннем вышэйшага прызнання заслуг дзеячаў навукі, тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры перад грамадствам і дзяржавай.

Прэмія прысуджаецца грамадзянам Рэспублікі Беларусь:

тры Дзяржаўныя прэміі ў галіне навукі і тэхнікі за выдатныя работы, адкрыцці і навуковыя дасягненні, вынікі якіх істотна ўзбагацілі айчыннную і сусветную навуку і тэхніку, аказалі істотны ўплыў на развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу і павышэнне эфектыўнасці эканомікі, забеспячэнне здароўя насельніцтва і ахову навакольнага асяроддзя;

тры Дзяржаўныя прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за глыбокія па зместу і адметныя па форме выдатныя работы (творы літаратуры, мастацтва і архітэктуры, дасягненні выканаўчага майстэрства), якія істотна ўзбагацілі нацыянальную і сусветную культуру, садзейнічалі ўстаўленню агульначалавечых каштоўнасцяў і ідэй гуманізму.

1.3. Вылучаныя на саісканне Дзяржаўных прэмій работы прымаюцца да разгляду адпаведнымі падкамітэтамі пры ўмове, што іх вынікі рэалізаваны на практыцы (надрукаваны, асвоены вытворчасцю, пабудаваны, абнародаваны шляхам публічнага паказу, выкананы ці іншым чынам) не менш чым за два гады да спынення прыёму работ на конкурс.

1.4. Аўтарскі калектыў работы, вылучаемай на саісканне Дзяржаўнай прэміі, не можа перавышаць трох чалавек.

1.5. Работы, вылучаемыя на саісканне Дзяржаўных прэмій 2008 года, прымаюцца да разгляду падкамітэтамі па Дзяржаўных прэміях да 1 лютага 2008 года.

**2. Вылучэнне і прадстаўленне работ**

2.1. Прадстаўленне работ на саісканне Дзяржаўных прэмій ажыццяўляецца калегіямі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, калегіяльнымі органамі кіравання іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, а Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі таксама Прэзідыумам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі на матэрыялах вылучэння ўваходзячых у іх склад, падпарадкаваных або падведамасных арганізацый.

У выпадку, калі работа вылучаецца арганізацыяй, якая не мае ведамаснай прыналежнасці, прадстаўленне работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі ажыццяўляе Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры — калегія Міністэрства культуры.

2.2 Вылучэнне работ на саісканне Дзяржаўных прэмій ажыццяўляецца на пасяджэннях калегій, прэзідыумаў, сакратарыятаў праўленняў, мастацкіх, рэдакцыйна-выдавецкіх, навукова-тэхнічных, навуковых саветаў, на сходах калектываў работнікаў па месцы працы саіскальнікаў (суб'ектам вылучэння на саісканне Дзяржаўнай прэміі). Абавязковым з'яўляецца ўдзел у пасяджэнні прадстаўнікоў арганізацый, якія карыстаюцца вынікамі работы, вылучаемай на саісканне Дзяржаўнай прэміі.

*Работа можа быць вылучана сумесна калектывамі некалькіх арганізацый, пры гэтым па агульнай згодзе адна з іх вызначаецца як галаўная, іншыя — як сумежныя арганізацыі.*

2.3. Фарміраванне калектыву саіскальнікаў Дзяржаўнай прэміі правядзіцца з удзелам усіх аўтараў работы. Вылучэнне саіскальнікаў у аўтарскі калектыў з агульнага ліку выканаўцаў работы ажыццяўляецца выходзячы з ацэнкі творчага ўкладу кожнага з іх. У аўтарскі калектыў уключаюцца аўтары, чый творчы ўклад у выкананне работы быў найбольш значны. Не дапускаецца ўключэнне ў аўтарскі калектыў асобаў, якія выконвалі толькі адміністратыўныя, кансультатыўныя або арганізацыйныя функцыі.

Кандыдатура кожнага члена аўтарскага калектыву павінна быць абмеркавана па месцы яго асноўнай працы.

2.4. Рашэнне аб вылучэнні работы прымаецца адкрытым галасаваннем.

Рашэнне аб уключэнні кандыдатур у калектыў саіскальнікаў прымаецца шляхам тайнага галасавання пры наяўнасці кворума, прынятага ў арганізацыі, дзе адбываецца вылучэнне.

2.5. Змяненні ў складзе аўтарскага калектыву вылучаемай работы павінны праводзіцца з абавязковым выкананнем працэдур, прадугледжаных пунктамі 2.1 — 2.4 гэтага Парадку.

**3. Камплектацыя прадстаўляемай работы**

3.1. Работа на беларускай або рускай мове, прадстаўляемая на саісканне Дзяржаўнай прэміі, прымаецца да разгляду адпаведным падкамітэтам у наступнай камплектацыі:

3.1.1. Дакументы вылучэння на саісканне Дзяржаўнай прэміі ў трох экзэмплярах, у тым ліку:

пісьмо-прадстаўленне (п. 4.1.);

пісьмо-вылучэнне ад суб'екта вылучэння (4.2.);

выпіскі з пратаколаў (п. 4.3.);

пратаколы падліковых камісій (п. 4.4.);

анатацыя работы (п. 4.5.);

даведкі аб творчым укладзе кожнага з аўтараў (п. 4.6.);

звесткі пра кожнага з аўтараў (4.7.).

Пералічаныя дакументы пераплятаюцца ў вызначанай паслядоўнасці клеявым спосабам з кардоннай вокладкай у выглядзе асобнага тома «Дакументы вылучэння _____ на саісканне Дзяржаўнай прэміі

*(назва работы)*

Рэспублікі Беларусь 2008 года».

3.1.2. Апісанне работы ў трох экзэмплярах (п. 4.8.).

3.1.3. Надрукаваныя манаграфіі, падручнікі, альбомы, відэа- і аўдыёзапісы, копіі артыкулаў і іншыя матэрыялы і дакументы, якія ўваходзяць у склад работы і характарызуюць яе.

3.1.4. Анатацыя работы ў шасці экзэмплярах (п. 4.9.).

3.1.5. Кароткая анатацыя работы (п. 4.10.).

3.1.6. Улікова-рэгістрацыйны ліст (п. 4.11.).

**4. Афармленне дакументаў**

4.1. Пісьмо-прадстаўленне работы на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2008 года ад калегіі рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання, калегіяльнага органа кіравання іншай дзяржаўнай арганізацыі, падпарадкаванай Ураду Рэспублікі Беларусь, Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі афармляецца на бланку ў трох экзэмплярах па наступнай форме:

«Калегія (Прэзідыум) _____

*(поўная назва органа кіравання)*

вылучае на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2008 года

_____

*(назва віду Дзяржаўнай прэміі)*

1. _____

*(прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, яго вучоная ступень, званне, месца працы)*

2. _____

*(прозв

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

31 кастрычніка 2007 г. № 42 (96)


ДЫЯЛОГ

Фота Мары ЖЫЛІНСКАЙ

Не памылюся, калі скажу, што ўсе праблемы, звязаныя з жыццезабеспячэннем жыхароў падначаленай тэрыторыі, старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Марыя Сандрозд ведае як свае пяць пальцаў... Некалькі гадоў таму, калі Марыю Леанідаўну толькі выбралі на гэту пасаду, ёй давялося суправаджаць у паездцы па раёне кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. «Я ездзіла з ёю, прысутнічала на сустрэчах, слухала, пра што гавораць людзі, на што скардзяцца, — і ўсё запамінала ці пазначала ў блакноце. А потым, седзячы ў сваім кабінеце, раскладвала праблемы па «палічках» і думала, як лепш іх вырашыць, з чаго пачаць...»

**Марыя САНДРОЗД, старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў:**

## «ЗМЯНЯЮЧЫ АСЯРОДДЗЕ, ЧАЛАВЕК ЗМЯНЯЕЦЦА САМ»

Яна і сёння, перш чым узяцца за пытанне, з якім звярнуўся наведвальнік, прапаноўвае яму над гэтым пытаннем паразважаць: ці такое ўжо яно непад'ёмнае, як падаецца на першы погляд, і якую «лепту» можа ўнесці сам заяўнік у яго вырашэнне. Часам здараецца, што праблема вычэрпваецца падчас размовы. Але так бывае не часта — у большасці выпадкаў неабходна больш ці менш працяглы па часе разбор. Каб усё паспець і нічога не ўпусціць, Марыя Леанідаўна ўжо з 7 гадзін раніцы пачынае абзвон спецыялістаў. Чым часцей атрымліваецца дазваніцца і пачуць у адказ на просьбу адназначнае «так», тым больш удалым лічыць яна пачатак дня.

— Звароты грамадзян, — калі мы ўжо з вамі пра гэта загаварылі, — таксама бываюць рознымі. Частка з іх — цалкам абгрунтаваныя, маюць пад сабой пэўную праблему. Іншыя носяць кансультацыйны характар. А некаторыя... Я назвала б іх неабгрунтаванымі, беспадстаўнымі і нават нахабнымі. Ты дапамагаеш чалавеку раз, другі... Тлумачыш, куды звяртацца і што рабіць далей, каб праблема вырашылася. А ён прыходзіць яшчэ і яшчэ, патрабуе больш і больш, забірае час у іншых людзей.

Але ў цэлым па нашым раёне колькасць зваротаў у гэтым годзе скарацілася на 23 працэнты. Прыкладна на столькі ж паменшылася колькасць скаргаў у інстанцыі больш высокага ўзроўню. Ёсць сельскія Саветы, куды сёлета пададзена не болей за тры звароты. Напрыклад, у Сямежаўскім сельсавеце іх было ўсяго два, у Грозаўскім — тры, а ў Браткаўскім — увогуле адзін.

**— Магчыма, там жыхары больш пакладзістыя?**

— Не толькі. Проста яны ўмеюць самі вырашаць свае праблемы. Гэта не азначае, што нельга прыйсці ў сельскі Савет і задаць пытанне старшыні. Можна, безумоўна. Але ты прыйдзі, спытай, атрымай тлумачэнні і сам арганізуйся на вырашэнне пытання. Вось старшыня Браткаўскага сельскага Савета так паставіў работу з людзьмі, што яны могуць вырашаць пераважную большасць праблем, не выязджаючы за межы свайго сельсавета.

**— Няшмат зваротаў — гэта добра. Але часам людзі — па прычыне звычкі ці менталітэту — баяцца лішні раз непакоіць уладу, чакаюць, што справы «як-небудзь наладзяцца». Тут і самім старшыням пярвічнага звяна ўлады неабходна праяўляць пільнасць, зацікаўленасць, бачыць мясцовыя праблемы.**

— Гэта самае галоўнае — бачыць праблемы. Мне здаецца, у нашым раёне мы даўно ўжо працуем з насельніцтвам у так званай адкрытай прасторы. Я маю на ўвазе не толькі «прамыя лініі» і «гарачы тэлефон». Па ініцыятыве абласнога Савета з'явілася новая форма работы з людзьмі — Дзень дэпутата. І я лічу, што гэта цудоўна. Сёння мая задача — з найбольшай эфектыўнасцю выкарыстаць яго ў зносінах з насельніцтвам. Пакуль што, мяркуючы па водгуках, атрымліваецца. Падчас апошняга Дня дэпутата, напрыклад, нашы народныя выбраннікі наведалі шматдзетныя, прыёмныя і апякунскія сем'і, асабіста я пабывала ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу. І гэта былі не проста наведванні «для галачкі», не проста справаздачы, «скінутыя» ў райсавет па факсе. Дэпутаты прыходзілі да мяне, дзяліліся ўражаннямі аб убачаным, раіліся, як лепш афарміць свае заўвагі: дзесьці неабходна арганізаваць падвоз дзяцей у дзіцячы садок, дзесьці — прыступіць бацькоў, якія забыліся пра свой абавязак...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

# ГАСПАДАРЫ З РАДЗІМЫ ПЕСНЯРА

**Механізатар Сяргей Ланкевіч цяпер працуе на ўборцы цукровых буракоў. Работа не менш адказная, чым падчас жніва, калі хлопец сядзеў за «штурвалам» камбайна «Лексі-ён». У сельскагаспадарчы кааператы з адметнай назвай «Радзіма Якуба Коласа», што на Стаўбцоўшчыне, Сяргей прыйшоў уладкоўвацца тры гады таму, адразу пасля службы ў войску.**

**У коласаўскіх мясцінах развіваюць вытворчасць, будуюць жыллё і задумваюцца пра аграгурызм**

Старшыня СВК Аляксандр КАРНІЧЭНКА.

Фота Мары ЖЫЛІНСКАЙ

Яго бацька таксама працуе вадзіцелем у гэтай гаспадарцы, таму сыну доўга выбіраць рабочае месца не прыйшлося. Ланкевічу-малодшаму амаль адразу даверылі складаную замежную тэхніку і не памыліліся — з усімі «камп'ютарамі» ён хутка разабраўся. Вось і цяпер без перашкод засвоіў нямецкі буракаўборачны камбайн «Кляйн», на якім за змену апрацоўвае да 10 гектараў палеткаў з «салодкім коранем». Пры такім раскладзе за дзень можна зарабіць да 140 тысяч рублёў.

### Чым выгадна займацца?

Сельгаскааператыў «Радзіма Якуба Коласа» — сярэдняе па памерах аграпрамысловае прадпрыемства — плошча палеткаў складае каля 5 тысяч гектараў. Да пачатку 1980-х гадоў на гэтых землях было дзве гаспадаркі, якія пасля аб'ядналі паміж сабой. Да больш моцнай «Перамогі» далучылі «Радзіму Якуба Коласа». Але назву вырашылі пакінуць — усё ж памяць пра знакамітага земляка. Такое пераўтварэнне аказалася досыць удалым, напэўна, шмат у чым дзякуючы кіраўніку — тут да сёння ўспамінаюць пра Канстанціна Аляксандравіча Карабко, які кіраваў гаспадаркай больш чым 40 гадоў (!). І, трэба заўважыць, у 80—90-я была створана моцная вытворчая база, якая дазволіла не толькі трымацца ў складаныя часы, але і з поспехам рухацца наперад.

Можна па пальцах пералічыць тыя накірункі сельскагаспадарчай дзейнасці, якія тут не імкнуліся асвоіць. Апроч «традыцыйных» збожжа, мяса і малака, займаліся яшчэ і птушкагадоўляй (у тым ліку і качкамі), вырошчвалі авечак (здавалі дзяржаве воўну), нутрый, быў свой пчальнік (які, дарэчы, захаваўся да гэтага часу), а таксама меркавалі стварыць мясакансервавы цэх і цэх на перапрацоўцы малака. Зразумела, планаў было шмат, аднак не ўсе з іх удалося рэалізаваць. Яшчэ пэўны час таму айчынны аграпрамысловы комплекс перажываў не лепшыя часы, калі многія, дагэтуль моцныя гаспадаркі, паступова пераўтвараліся ў эканамічных «аўтсайдараў». Без дапамогі яны проста не змаглі б падняцца з кален. Але, на шчасце, былі і іншыя прыклады, калі сельгаспрадпрыемствам удавалася выстаяць «сваімі сіламі», захаваць спецыялізацыю, касцяк працоўнага калектыву. У СВК «Радзіма Якуба Коласа» ўсё менавіта так і адбылося. Магчыма, паспрыяў і яшчэ адзін немалаважны фактар — гаспадарцы сапраўды шанцавала з кіраўнікамі. Пагадзіцеся, гэты момант шмат у чым вызначальны. Цяпер сельгаскааператыў узначальвае малады, ініцыятыўны Аляксандр Карнічэнка, які імкнецца ні ў чым не саступаць сваім папярэднікам.

— Усё зроблена з такім прыцэлам, каб развіваць самыя разнастайныя накірункі дзейнасці, якія прыносілі б прыбытак, — заўважае старшыня СВК «Радзіма Якуба Коласа». — Мы дакладна адсочваем рынкавую кан'юнктуру, таму можам дакладна вызначыць, чым выгадна займацца. Аднак тут не ўсё так адназначна: нельга арыентавацца толькі на «аднамомантны» вынік, кожны крок павінен быць сур'ёзна прадуманы, трэба мець на ўвазе доўгатэрміновую перспектыву.

### Жыць па сродках

Гаспадарка пэўны час спецыялізуецца на вырошчванні цукровых буракоў, цяпер пад гэту сельскагаспадарчую культуру адведзена каля паўтысячы гектараў. Гэта даволі значныя плошчы і вялікая адказнасць, паколькі трэба не толькі своечасова сабраць ураджай, але і рэалізаваць вырашчанае. «Салодкі корань» адвозяць на Гарадзейскі цукровы завод. Пры ўсіх цяжкасцях, якія ўзнікаюць апошнім часам, працаваць з цукровымі буракамі выгадна. Таму адпаведную спецыялізацыю скарачаць не плануюць. Прынамсі, у найбліжэйшай перспектыве. Каб атрымліваць больш, трэба заўсёды імкнуцца да таго, каб змяншаць затраты — аксіёма даўно вядомая. Таму грошай на набыццё сучаснай высокапрадукцыйнай тэхнікі ніколі не шкадуюць, паколькі справядліва лічаць, што гэта апраўданыя інвестыцыі. Набылі нямецкі камбайн «Кляйн» (той самы, на якім працуе Сяргей Ланкевіч), а таксама пагрузчык для цукровых буракоў — каб прадукцыя на выхадзе атрымлівалася больш якасная, яе адразу ачышчаюць ад смецця.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

КРУГЛЫЙ СТОЛ

# ДОТАЦИЯ ХОЗЯИНА НЕ СФОРМИРУЕТ

**В доперестроечное время Советы первичного уровня не являлись реальными хозяевами своей «подшефной» территории. Сегодня ситуация коренным образом изменилась. Местная власть, представленная на уровне села сельисполкомом и сельским Советом и имеющая одного председателя, постепенно приобретает реальное наполнение. Помочь работать в сегодняшних непростых условиях призван Указ Президента от 12 января 2007 года № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения».**

Для того, чтобы детально разобраться во всех его нюансах, в рамках учебы председателей местных Советов в Институте высших управленческих кадров Академии управления Республики Беларусь регулярно проводятся встречи с председателем Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь по региональной политике и местному самоуправлению Анатолием Малофеевым. В мероприятии, которое проходит в форме «круглого стола», также принимают участие ответственный секретарь Совета по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики Алексей Степаненко и начальник отдела региональных бюджетов главного управления бюджетной политики Зоя Кругликова.

В начале своего выступления Анатолий Малофеев подчеркнул, что для окончательного решения всех проблем, с которыми сталкиваются председатели в процессе реализации Указа, понадобится несколько лет. Самое главное в этом направлении — создать динамику движения, когда каждый прожитый день, каждый месяц, каждый год будет приносить определенные положительные результаты. Из 58 председателей сельских Советов, присутствовавших на последней встрече, 23 — новички, избранные на эту должность впервые. Им сложнее, отметил Анатолий Александрович, так как председательская работа требует определенного опыта и наработок. С другой стороны, у них нет и консервативных привязанностей к прошлому, что часто усложняет работу председателям со стажем.

Самые горячие споры в процессе обсуждения у присутствующих вызвал вопрос по формированию бюджета первичного уровня. Ясность постаралась внести Зоя Кругликова. Она пояснила, что Указ наконец-то упорядочил систему расщепления бюджетных средств между Советами первичного уровня. Если раньше их формирование осуществлялось по остаточному принципу, то теперь появились единые подходы. Нерешенным все еще остается вопрос по подоходному налогу с заработной платы. На этот год для некоторых сельисполкомов в порядке исключения он был оставлен в качестве доходного источника, но в бюджете 2008 года такой статьи пополнения уже не будет. «Тем не менее, вопрос не закрыт, — отметила Зоя Николаевна, обращаясь к председателям. — Он регулярно поднимается не только на первичном, но и на районном, и на областном уровнях. И вам никто не запрещает выходить на вышестоящие органы власти с предложением вернуть подоходный налог. Но ваша главная задача сегодня — привлечь в бюджет дополнительные источники дохода, упомянутые в Указе. Активней сдавайте в аренду недвижимость, создавайте КУПы, взимайте сбор с заготовителей грибов и ягод. Многие жалуются, что не могут найти заготовителя. Не расписывайтесь в собственном бессилии. Все данные есть в налоговых органах. Даже если юридическое или физическое лицо больше не осуществляет деятельность в районе, база данных по субъектам хозяйствования республики позволяет найти по УНН или названию фирмы любого предпринимателя или организацию».

В бюджете на 2008 год расходы на уличное освещение вынесены из статьи на благоустройство отдельным пунктом. Это позволит председателям заранее знать, сколько конкретно средств им под это заложено.

**Самые горячие споры вызвал вопрос по формированию бюджета первичного уровня.**

Далее Зоя Кругликова рассказала, что представляет собой на практике бюджетный процесс. Вначале разработка расчетных показателей идет на уровне «Минфин—область». После всех согласований и рассмотрения этого вопроса в Совете Министров начинается второй этап проработки бюджета, на уровне «область—район». «К этому моменту вы (председатели сельисполкомов. — **Авт.)** уже должны заранее просчитать свои расходы и доходы, чтобы быть готовыми аргументировано возражать или соглашаться, как только район включится в эту работу. Только после утверждения всех бюджетов, включая первичный уровень, бюджетный процесс заканчивается, обсчитывается консолидированный бюджет республики и принимается Закон «О бюджете».

Что касается норматива бюджетной обеспеченности на одного жителя, механизм его расчета у Минфина есть. Но в связи с тем, что его утверждают Советы базового (районного) уровня, в одних регионах он будет действовать, а в других — нет. Активно взялись за применение этого механизма на практике брестчане. Остальные области пока бездействуют.

— Согласно Указа, теперь введены новые отчисления в бюджет первичного уровня. Если раньше это были отчисления с подоходного налога, то теперь — от местных налогов и сборов. Например, налог с продаж. Добивайтесь того, чтобы вам установили норматив отчислений от этого доходного источника. На подобный шаг пока идут не очень охотно, так как это новый механизм: раньше от местных налогов и сборов ничего не отчислялось. Но теперь, на стадии формирования бюджета-2008, чтобы не увеличивать уровень дотационности, совместно с районом можно проработать этот вопрос и установить норматив.

На предложение вернуть Советам базового и первичного уровня право вводить местные налоги и сборы Зоя Николаевна ответила следующее:

— В Законе «О бюджете» сказано, что этим могут заниматься областные Советы. Это сделано для того, чтобы не было самодеятельности. Возьмем налог с продаж. Подорожали энергоносители — Советы бросились увеличивать налог с продаж бензина. А продавец все это вложил в цену (свои расходы он не уменьшил). В результате цены «поползли». Я считаю, правильно, что право вводить местные налоги и сборы отдали областным Советам.

При обсуждении возможностей пополнения бюджета первичного уровня ряд вопросов возник по сельсоветам Гомельской области. В чернобыльских районах отменен даже налог на землю, а бюджет сельисполкома практически на 100 процентов состоит из дотации. «Почему район забрал подоходный налог? Потому что сам не может свести концы с концами, — заявил **председатель Храковичского сельского Совета Брагинского района Николай Гапоненко.** — Маслосырзавод закрыт, хлебзавод закрыт, пивзавод тоже закрыт. Налоговой базы для поступления в район практически нет».

— Неверно считать, что подоходный налог с заработной платы является основным, — парировала Зоя Кругликова. — Он — один из основных. Посмотрите бюджет района — какие налоги туда зачисляют, и вы увидите, насколько они разные и по видам, и по количеству. Как я уже говорила выше, вопрос по подоходному налогу остается открытым.

— Эта тема очень серьезная и касается сегодня всех чернобыльских районов, — подтвердил Алексей Степаненко. — Те хозяйственные структуры, которые там еще работают, например, выращивают зерно, могут продавать его только на технические нужды. Получается, что в сравнении с предприятиями в «нормальных» районах затраты они несут большие (процентов на 30), а продукцию продают дешевле. И из-за этого страдают. К этим регионам должен быть выработан особый подход.

Еще одной острой темой для Гомельской области является вопрос по сносу ветхих домов, которых там очень много. Пользуясь возможностью, председатели Советов поинтересовались, будут ли финансироваться эти расходы.

— У вас в бюджет эти расходы не закладываются, — пояснила Зоя Кругликова. — Эти средства предусматриваются в иных общегосударственных расходах, финансирование которых должен осуществлять район.

— Подпункт 1.1 Указа № 21 требует детального осмысления и корректировки, — подытожил Анатолий Малофеев. — Что касается чернобыльских районов, этот вопрос нужно отдельно проработать с финансистами. Если же говорить в общем, то финансовой базы для формирования какого-то значимого бюджета первичного уровня сегодня нет. Дотация никогда не сформирует хозяина! Поэтому если вы в январе-феврале не сядете прикидывать свой бюджет на 2009 год, снова окажетесь без средств. Учитесь грамотно, обоснованно отстаивать свою копейку.

**Инга МИНДАЛЁВА.**

# ЛЕПШАМУ САВЕТУ — 500 БАЗАВЫХ ВЕЛІЧЫНЬ

**Мінскі абласны Савет дэпутатаў прыняў рашэнне аб заснаванні конкурсу сярод сельскіх, пасялковых, гарадскіх Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.**

Першы конкурс будзе праведзены ў 2008 годзе. Дэпутаты вырашылі вызначаць пераможцаў штогод да 1 красавіка. Для гэтага кожны год да 10 лютага райсаветы і райвыканкамы будуць падводзіць вынікі работы ў раёне, накіроўваць спіс патэнцыяльных пераможцаў у абласны Савет. Прэзідыум аблсавета ўнясе абагульненую інфармацыю ў аблвыканкам. Устаноўлена шэсць прызавых месцаў, у тым ліку тры — для пярвічных Саветаў дэпутатаў і тры — для органаў грамадскага самакіравання. Пераможцам будуць прысуджаны дыпломы і грашовыя прэміі. Дыплом I ступені для Саветаў суправаджае прэмія памерам 500 базавых адзінак, II ступені — 400 базавых адзінак, III ступені — 300 базавых адзінак. Органам грамадскага самакіравання да дыплома I ступені будзе прыкладацца прэмія да 50 базавых адзінак, II ступені — да 40 базавых адзінак, III ступені — да 30 базавых адзінак.

З гэтых прэмій работнікам Саветаў можа быць выплачана да трэці сумы, у тым ліку старшыні Савета не больш за яго сярэднямесячную зарплату. Астатнія грошы згодна з рашэннем дэпутатаў могуць быць накіраваны на вырашэнне мясцовых праблем.

«Заняць прызавое месца будзе няпроста, — адзначыла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана Герасімовіч. — Так, Саветы дэпутатаў павінны вызначыцца ў выкананні рэгіянальных праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця, забяспечыць належны ўзровень камунальна-бытавога і культурнага абслугоўвання насельніцтва, выконваць нарматывы дзяржаўных стандартаў, весці вялікую работу па добраўпарадкаванні».

Конкурсная камісія будзе ўлічваць вынікі работы па эканоміі і рацыянальным выкарыстанні рэсурсаў, дэмаграфічную сітуацыю, узровень развіцця асабістых падсобных гаспадарак. Згодна з умовамі спаборніцтва Саветы павінны скараціць колькасць пустых і старых дамоў, і зямельных участкаў, што не выкарыстоўваюцца, арганізавана весці работу са зваротамі грамадзян на прынцыпу «аднаго акна».

Работа органаў грамадскага самакіравання, у прыватнасці, будзе ацэньвацца па наступных паказчыках: развіццё грамадскага руху па добраўпарадкаванні і ўтрыманні ў чысціні вуліц, дамоў, прыдамавых тэрыторый, правядзенне суботнікаў, удасканаленне структуры самакіравання, арганізацыя работы па забеспячэнні аплаты камунальных паслуг, удзел у разглядзе зваротаў грамадзян, ахова правапарадку і прафілактыка правапарушэнняў.

**Андрэй МАЛАХОЎСКІ, кар. БЕЛТА.**

ЕСТЬ МНЕНИЕ

# КАК НАПОЛНИТЬ БЮДЖЕТ?

**В соответствии с поручением Президента Республики Беларусь и правительства в Горецком районе, как и в целом по республике, целенаправленно осуществляются мероприятия республиканской, областной и районной программ благоустройства и наведения порядка на земле, улучшения экологической обстановки.**

Много сделано в сельсоветах по санитарной уборке территорий населенных пунктов, эстетическому оформлению и озеленению школьных и дошкольных учреждений. На селе ликвидируются несанкционированные свалки, сносятся пустующие дома, ограждаются кладбища, ремонтируются колодцы. Организованным сбором мусора охвачено 60 деревень. В благоустройство сельсоветов района вложены десятки миллионов рублей...

И результат не заставил себя долго ждать. На глазах преобразились населенные пункты — стали намного чище, приукрасились. Новое «лицо» приобрели агрогородки Овсянка, Добрая, Паршино, Каменка, Ленино. Но эта работа не завершена, она продолжается — здесь подразумевается строительство и благоустройство дорог и тротуаров, электрификация жилых домов индивидуальных застройщиков в новом микрорайоне города Горки. Несмотря на то, что только за прошлый год на 10 улицах райцентра были проведены подсыпка и грейдирование проезжей части, эта проблема остается достаточно острой. Сегодня весь объем работ по благоустройству новых микрорайонов нужно вести в комплексе.

Убрать мусор — это еще далеко не все, что требуется государственной программой благоустройства и наведения порядка на земле. В настоящее время самое серьезное внимание уделяется ремонту и реконструкции объектов производственной сферы — животноводческих ферм и комплексов, мехдворов и зернотоков, благоустройству их территорий и подъездных путей, созданию нормальных санитарно-бытовых условий для работников. Одним из главных направлений остается контроль за условиями труда и быта на производстве, за вредным воздействием неблагоприятных факторов производственной сферы — ведь в центре внимания каждого руководителя должен находиться человек.

**На протяжении последних 5 лет бюджеты сельских Советов дотируются более чем на 50 процентов**

Надо признать, что на многих фермах нашего района эти вопросы еще не решены — остро стоит проблема устройства вентиляции, а содержание паров аммиака в воздухе превышает допустимые уровни в 2—3 раза. (Например, в СПК «Маслаки» практически ни один животноводческий объект не отвечает современным санитарным требованиям.) В настоящее время нуждаются в благоустройстве подъездные пути ко многим фермам хозяйств.

Актуальными для нашего района являются вопросы рационального использования земель — поскольку земля была и остается главным природным богатством. Немало сделали в этом вопросе и сельские исполнительные комитеты. Проведена инвентаризация земли в сельских населенных пунктах — это позволило выявить неиспользуемые участки. В результате прежним землепользователям возвращено 1969 гектаров пустующих земель, в том числе за прошлый год — 383 гектара. В 2006 году сельскохозяйственными предприятиями включено в оборот более 529 ранее неиспользуемых участков.

Вместе с тем вызывает озабоченность количество пустующих домов на селе. Сельисполкомам необходимо активизировать работу по выполнению Указа Президента № 70 «О мерах по упорядочению учета и сокращению количества пустующих и ветхих домов с хозяйственными и иными постройками в сельской местности».

Конечно, одним из главных документов, определивших задачи местной власти на ближайшую перспективу, стал Указ Президента № 21 «О повышении роли органов местного управления и самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения». Он законодательно закрепил перечень налогов, доходов и других платежей, поступающих в бюджет, также определил расходы, которые финансируются из бюджетов первичного уровня.

В то же время для нашего района перечень доходов и платежей, установленный Указом № 21, не в полной мере охватывает те закрепленные налоги и доходы, которые были определены при планировании бюджета 2007 года.

С выходом указа в бюджеты сельсоветов перестали поступать такие доходные источники, как административные штрафы и экономические санкции, налагаемые уполномоченными органами, а также возмещение потерь, вреда, добровольные взносы. После внесения изменений в решение районного и сельских Советов депутатов (в связи с исполнением требований указа) собственная доходная часть бюджетов сельских Советов уменьшилась на 1759,0 тыс. рублей и была компенсирована за счет увеличения объема дотации из районного бюджета.

На протяжении последних 5 лет бюджеты всех Советов дотируются более чем на 50 процентов, а в отдельных Советах уровень дотации достигает 92—95 процентов (Добровский, Ленинский, Коптевский). Считаю, что необходимо часть подоходного налога оставлять на подведомственной сельскому Совету территории, что будет способствовать наполняемости бюджета первичного уровня.

Решением районного Совета депутатов от 6 марта 2007 г. «Об уточнении отдельных показателей районного бюджета на 2007 год» в бюджетах Советов первичного уровня образованы резервные фонды. Размер такого фонда по сельским Советам района составляет 1,6 млн рублей.

В 2006 году на укрепление материально-технической базы сельских Советов направлено 18,5 млн рублей, а за 9 месяцев 2007 года — 40,3 млн рублей. Очевидно, что увеличившиеся вложения должны способствовать улучшению деятельности системы первичного уровня власти.

**Иван ХОЛЯВА, председатель Горецкого районного Совета депутатов.**

# «ЗМЯНЯЮЧЫ АСЯРОДДЗЕ, ЧАЛАВЕК ЗМЯНЯЕЦЦА САМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У нас пайшла работа з аддзелам адукацыі, з органамі апекі, іншымі арганізацыямі. Не скажу, што гэта лёгка. Не лёгка. Вось паскардзіліся людзі, што будаўнікі здалі дом з няякасным дахам — сёння ён працякае. Мы скаргу прынялі, але паспрабуйце прымусіць будаўнікоў нешта перарабіць... У любым выпадку, мы ведаем праблемы па раёне і ўсе звароты і скаргі людзей трымаем на кантролі.

Вось сёння з раніцы ў мяне на прыёме было ўжо тры чалавекі. Жыхар з вёскі Пуцейкі паскардзіўся, што некалькі дзён не падаецца вада на другі паверх яго дома. Я адразу звязалася з раённай ЖКГ. Яны мне ўжо «пасігналілі», што выехалі на месца... Учора паступіў зварот з Грозаўскага сельсавета — людзі хочуць пабудаваць водаправод. А ўжо сёння старшыня сельскага Савета з раніцы прыехаў у ЖКГ і яму было дадзена даручэнне падлічыць, колькі спатрэбіцца грошай, які аб'ём работ неабходна выканаць жыллёва-камунальнай гаспадарцы, а які застанецца жыхарам...

**— А невырашальных праблем шмат?**

— Ну як невырашальных... Проста па некаторых пытаннях усё робіцца не так хутка, як хацелася б. Возьмем, напрыклад, спілоўванне аварыйных дрэў. Наш раён адным з першых пачаў наводзіць тут парадак, стварылі сваю, вельмі нядрэнную сістэму, падключылі раённую брыгаду Міністэрства па надзвычайных сітуацыях... І даўно вырашылі б усе пытанні, калі б не вышка. Дакладней, яе адсутнасць. Мы вымушаны прасіць вышку ў абласной ЖКГ, і добра, калі два разы на год гэта атрымліваецца... А між тым, звароты, у якіх выказваецца занепакоенасць станам аварыйных дрэў, ёсць у кожным сельсавеце — людзі баяцца, што дрэвы могуць паваліцца раней, чым райсавет знойдзе вышку... Вядома ж, гэта сур'ёзная праблема. Свая вышка абавязкова павінна быць у кожным раёне. Дзе-нідзе яны ёсць — напрыклад, у Салігорску. Але на нашу просьбу аб дапамозе салігорскія службы яшчэ ні разу не адгукнуліся — яны выконваюць сваю праграму, рамантуюць шматпавярховыя будынкі, рыхтуюць іх да зімы.

**— Указ Прэзідэнта № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння людзей» мае на мэце не толькі павысіць адказнасць мясцовых Саветаў, але і аблегчыць ім жыццё. Маю на ўвазе палажэнне аб перадачы сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення, а таксама дарог спецыялізаваным арганізацыям і службам...**

— Сёння задача пастаўлена правільна — перадаць дарогі, перадаць водаправод... На ўзроўні дзяржавы звярнулі, нарэшце, увагу на вялікі пласт работы, якая раней ніякім не ўлічвалася і выконвалася стыхійна... У адпаведнасці з Указам мы правялі інвентарызацыю і ўбачылі, што ў раёне амаль 400 км дарог «вісяць у паветры» — інакш кажучы, не знаходзяцца ні на чыім балансе, што водаправоды ў вёсках абслугоўваюцца сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі, што 98 палігонаў з'яўляюцца нічыйнымі і не маюць зямельных актаў. Тое самае можна сказаць і пра могілкі...

Словам, задачу Указ № 21 паставіў добрую — кожнай «рэчы» знайсці свайго гаспадара. Але не так проста гэта ажыццявіць.

Што датычыцца міні-палігонаў, тут мы рухаемся нядрэнна, ЖКГ гатова іх прыняць. Гатоўнасць заключаецца ў тым, што сёння для абслугоўвання палігонаў мы купляем два бульдозеры, таксама маецца неабходная колькасць машын для збору смецця. Засталося надаць міні-палігонам пэўны статус, зарэгістраваць іх у агенцтве па рэгістрацыі нерухомасці. Але сёлета грошы на такую работу ў бюджэт не закладваліся (а гэта па 1—1,5 млн па кожным палігоне). Таму прынята рашэнне, што на дадзеным этапе рэгістрацыю 8 палігонаў аплаціць райвыканкам.

**— А як будзе вырашацца пытанне па дарогах? Вы сказалі, «нічыйных» — каля 400 кіламетраў?**

— З дарогамі пакуль што пытанне вырашаецца цяжка. Каб надаць ім статус, неабходна, зноў жа, падрыхтаваць адпаведныя дакументы, перадаць іх у агенцтва і аформіць рэгістрацыю.

> **Нам усім трэба вучыцца працаваць у рэжыме няпоўнага фінансавага забеспячэння.**

У першую чаргу мы ўзяліся за дарогі, якія забяспечваюць пад'езды да сацыяльна значных аб'ектаў і праходзяць па тэрыторыі сельгаспрадпрыемстваў. Працягласць такіх дарог — каля 50 кіламетраў. Для рэгістрацыі 1 кіламетра неабходна затраціць у сярэднім 1 млн рублёў. Для 50 кіламетраў — 50 млн адпаведна. Ды яшчэ каля 300 кіламетраў вясковых вуліц застаецца незарэгістраванымі. Раённы бюджэт гэтага дакладна не выцягне.

Як будзе вырашацца пытанне? Што датычыцца пад'ездаў да сацыяльна значных аб'ектаў, тут у нас дасягнута наступная дамоўленасць: калі дарогі праходзяць па землях сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, то разлічвацца за афармленне дакументацыі і рэгістрацыю будуць менавіта СВК.

А вось што рабіць з 300 кіламетрамі «нічыйных» вясковых вуліц, як іх перадаваць і за якія сродкі афармляць документацыю, пакуль не ведаем. Будзем чакаць вырашэння гэтага пытання ў больш высокіх інстанцыях.

Не пастаўлена апошняя кропка і ў пытанні канчатковай перадачы водаправода, хоць на сёння 50 працэнтаў сетак ужо абслугоўваюцца службамі раённай ЖКГ. Некаторыя сельгаспрадпрыемствы лічаць такую перадачу немэтазгоднай, бо тады ім самім давядзецца разлічвацца з ЖКГ за карыстанне вадой па трайному тарыфу. Таму мы папрасілі, каб раённая ЖКГ разгледзела пытанне аб памяншэнні тарыфаў для сельскагаспадарчых арганізацый...

**— Сёння сельскім Саветам дадзена магчымасць выкарыстаць новыя крыніцы для папаўнення сваіх бюджэтаў. Якія з іх могуць рэальна прыйсці ў Капыльскім раёне?**

— Мы разглядалі гэта пытанне са старшынямі сельскіх Саветаў і начальнікам нашага фінаддзела. Сістэма фарміравання бюджэтаў сельскіх Саветаў пакуль што пакідае больш пытанняў, чым адказаў. Усё ж як будзе налічвацца Саветам датацыя? Выходзячы з чаго, з якіх параметраў яе пачнуць вызначаць? А без датацыі ніхто не абыдзецца, бо вызначаныя Указам № 21 крыніцы фінансавання сёння не забяспечваюць у поўнай меры нават зарплату работнікаў сельвыканкамаў.

Пойдзем далей. Сельскія Саветы збіраюць падатак на зямлю: у адных ён большы, у другіх — меншы. У якіх прапорцыях гэты падатак будзе размяркоўвацца па сельсаветах? Ці яго дазволяць пакідаць там поўнасцю?

Хвалюе нас і лёс добраахвотных узносаў. У гэтым накірунку мы ўжо чатыры гады цесна працуем з насельніцтвам і дабіліся пэўных поспехаў. У Грозаўскім сельсавеце збіраюць па 5 мільёнаў рублёў у год, у іншых сельсаветах — па 1—1,5 млн. Гэта не маленькія сумы для вёскі, грошы ідуць выключна на добраўпарадкаванне. Але мы хвалюемся: ці не залічаць іх у сельсаветскі бюджэт нароўні з іншымі паступленнямі, а потым на адпаведную суму зменшаць датацыі? Нам бы гэтага вельмі не хацелася. Бо добраахвотныя ўзносы — вынік асабістай работы старшыні сельскага Савета з грамадзянамі, таму грошы павінны належаць сельсавету як уласны дадатковы даход. Гэтыя грошы нельга залічваць у бюджэт.

Увогуле, тут неабходна ўсё добра пралічыць, перш чым стварацъ сістэму ў рабоце. Нам усім трэба вучыцца працаваць у рэжыме няпоўнага фінансавага забеспячэння.

**— Па вялікім рахунку, асноўная задача Саветаў на месцах — стварыць нармальныя ўмовы для жыцця людзей.**

— І ў гэтым сэнсе ў нас зроблены значны рух наперад. Сёння мы з вамі размаўляем аб праблемах — яны ёсць, і гэта нармальны, звычайны жыццёвы працэс. Разам з тым не магу не адзначыць, што ў нашым раёне створана сістэма работы з людзьмі, знойдзены кантакт, так бы мовіць, кропкі судакранання... Узяць хоць бы прынцып «аднаго акна» — яшчэ пару гадоў таму пра яго ніхто не чуў, а сёння людзі самі цікавяцца наяўнасцю адпаведных працэдур і актыўна карыстаюцца імі.

Я ўжо не кажу пра добраўпарадкаванне... Патрабаванні да кожнага населенага пункта, безумоўна, адрозніваюцца. Калі гэта аграгарадок — значыць, там павінны быць сквер, культурны цэнтр, архітэктурныя ўпрыгажэнні, фантаны, альтанкі... Прычым у кожным — свае. Каб чалавеку ў сваёй вёсцы было цікава, каб не назалялі вочы напаўразваленыя хаты і шэрыя агароджы.

Я кожны дзень бываю ў той ці іншай вёсачцы. Праязджаючы па вуліцы, спыняюся, размаўляю з людзьмі. І ведаеце, якія заўвагі чую? «Не хочам жыць па суседстве з нядобраўпарадкаваным участкам, з пустым домам». Раней людзі на гэта не скардзіліся і нават увагі не звярталі. А цяпер захапіліся акультураннем вёскі, прысядзібнай тэрыторыі. Мяняюць сваё асяроддзе і... мяняюцца самі.

**Гутарыла Наталля КАРПЕНКА.**

*Капыльскі раён.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**Механізатар Сяргей ЛАНКЕВІЧ.**

# З ГАСПАДАРЫ РАДЗІМЫ ПЕСНЯРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Гэта толькі асобны прыклад — у сельгаскааператыве паўсюль заўважны гаспадарскі падыход да справы. Пра свае дасягненні тут гавораць сціпла, хоць прыстойны ўзровень вытворчасці заўсёды вытрымліваецца. Даволі ўдала займаюцца і вытворчасцю малака — агульны статак каля тысячы кароў. Падлічылі, што трымаць такое пагалоўе найбольш мэтазгодна. Зразумела, уся справа не ў лічбах, а ў канкрэтных выніках: летась сярэдні надой ад кожнай каровы склаў больш чым 6,3 тоны. Адпаведная прадукцыя, асабліва цяпер, ва ўмовах павышанага попыту на яе — гэта рэгулярныя паступленні грошай, «жывая капейка». Штодня СВК пастаўляе 12—15 тон малака на адзін са сталічных малочных камбінатаў.

— У прынцыпе грошай ад рэалізацыі малака хапае на выплату заработнай платы, — заўважае Аляксандр Карнічэнка. — Трэба заўсёды жыць па сродках — такога прынцыпу мы ўвесь час прытрымліваемся. Зразумела, дасягнуць пэўнай эканамічнай стабільнасці даволі складана. Для таго, каб паспяхова займацца развіццём жывёлагадоўлі, неабходна стварыць трывалую кармавую базу. Сёлета нарыхтаваць належны запас было няпроста. Заклалі пашы з «наборам» некалькіх траў, але яны пацярпелі ад спякоты. Затое выручылі натуральныя сенажаці — на паплавах ля Нёмана «ўзялі» два важкія ўкосы. Так што за зімоўку хваляваць не давядзецца.

## Задача «нумар адзін»

У сельгаскааператыве «Радзіма Якуба Коласа» цяпер працуюць 310 чалавек. Трэць калектыву — моладзь, якая лічыць, што работа ў СВК даволі прэстыжная. У гаспадарцы з вялікай павагай ставяцца да работнікаў, заўважыў Сяргей Ланкевіч, галоўнае, каб сваю справу кожны выконваў як належыць. Клопат пра людзей — «задача нумар адзін». Старшыня справядліва заўважыў, што толькі з дапамогай згуртаванага калектыву можна дасягнуць станоўчых вынікаў. Сярэдні заробак у гаспадарцы складае больш чым 400 тысяч рублёў. Асобныя, вядома ж, атрымліваюць штомесяц і па 700—800 тыс. — хто як спрацуе. А на сяўбе і ўборцы можна зарабіць яшчэ больш.

Так што стымул для працы вялікі, у гаспадарку прыязджаюць і жыхары з іншых абласцей — Віцебскай, Магілёўскай. Іншыя, калі атрымлівалі першы заробак, казалі, што такіх грошай ніколі ў руках не трымалі. Усім, хто ўладкоўваецца на працу, адразу выдзяляюць часовае жыллё. Спачатку да людзей прыглядаюцца — як яны сябе пакажуць, а праз пэўны час кожны можа атрымаць сучасны катэдж з усімі «гарадскімі» выгодамі (газ, вада, каналізацыя). Сёлета ў СВК «Радзіма Якуба Коласа» сапраўдны будаўнічы «бум» — дзевяць дамоў ужо ўведзены ў эксплуатацыю, а да канца года плануюць здаць яшчэ тры. Як мяркуецца, налета ўлазіны будуць спраўляць яшчэ пяць сем'яў навасёлаў. Домікі ўзводзяць маштабна — цэлымі кварталамі. Такія аб'ёмы будаўніцтва тлумачацца тым, што ў гаспадарцы ёсць чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў. Хтосьці пакуль увогуле не мае ўласнага «кута», асобныя чакаюць магчымасці для пашырэння. Каб хутчэй вырашыць усе гэтыя надзённыя пытанні, і разгарнулі вялікую праграму будаўніцтва.

Да таго ж, і «сацыялку» ўдалося значна «падцягнуць» — летась вёска Любкаўшчына стала аграгарадком. Тут створаны ўсе ўмовы для жыцця: працуюць гандлёвы цэнтр, сталовая, лазнева-пральны камбінат, аддзяленне банка, пошта, Дом культуры, ёсць нават свая невялікая гасцініца на шэсць нумароў. Дзятва займаецца ў тутэйшай школе, а самыя маленькія гаспадары коласаўскіх мясцін наведваюць дзіцячы садок. У апошнім сёлета давялося замест адной групы дзве арганізоўваць, паколькі малых з кожным годам становіцца ўсё больш. Вельмі прыемная тэндэнцыя, ад якой у кожным асобным выпадку неяк святлей становіцца на душы.

...А мясціны тут і сапраўды выдатныя, што ўсе даўно ацанілі — улетку гасцей заўсёды шмат. Аднак іх адпачынак пакуль, на жаль, усё больш неарганізаваны. Таму ў гаспадарцы ўсур'ёз задумваюцца над рэалізацыяй цікавых праектаў у сферы аграгурызму. А што, надзвычай перспектыўны накірунак для сельгаспадпрыемства, тым больш, што акрамя эканамічнай прывабнасці, гэта яшчэ і выдатная магчымасць для стварэння новых працоўных месцаў.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

*Стаўбцоўскі раён.*

**РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ**

# РЭЙД ПА НЕБЯСПЕЧНЫХ МЕСЦАХ

Каб паглядзець, у якім стане знаходзяцца печы, дымаходы, электрычная праводка жыхароў Варнянскага сельсавета, журналіст адправіўся ў рэйд з супрацоўнікамі раённага аддзялення надзвычайных сітуацый. Пра тое, што падчас яго ўбачыў аўтар гэтых радкоў, без болю пісаць немагчыма. Аварыйны стан печаў, дымаходаў, электраправодкі, непрыемны пах, недакуркі пад ложкам, пустыя бутэлькі з-пад спіртнога — атрыбуты многіх з наведаных дамоў.

...У 10 гадзін раніцы разам са старшынёй Варнянскага сельскага Савета Іванам Пляўгай, намеснікам галоўнага дзяржаўнага інспектара па пажарным наглядзе Эдуардам Малышкам, інспектарам дзяржаўнага нагляду старшым лейтэнантам Андрэем Кляўдай едзем у вёску Карвэлі. Там за апошнія 5 гадоў адбылося 5 пажараў, у якіх загінулі 5 чалавек. У Варнянскім сельсавеце гэта сумнае другое месца пасля вёскі Дубнікі.

Спыняемся каля першай хаты. Звонку дом большменш нармальны, толькі чорны комін выдае — штосьці тут не так. На парозе нас сустракае малады хлопец. Заходзім у хату, разглядаем печ. Ёсць вялікія трэшчыны. Гаспадар расказвае, што жыве тут са старэйшым братам. Абодва працуюць у СВК «Варняны», зарплату атрымліваюць. Адрамантаваць печку ёсць за што, але няма часу. Ці жадання?..

Пакуль едзем на другую «кропку», Эдуард Малышка дзеліцца ўспамінамі: «Было гэта на хутары. Муж з жонкай, ужо ва ўзросце, не мелі дзяцей. Родныя таксама да іх не прыязджалі. Вядома, у старых людзей свае дзівоцтвы. Думалі, што калі памруць, свечку ў рукі ім ніхто не дасць. Так і клаліся спаць з запаленымі свечкамі. Аднойчы не прачнуліся. Згарэлі...»

Андрэй Кляўда таксама ўключаецца ў размову. У вёсцы Лазоўка, расказвае, памерла бабуля. Прыехалі родныя, суседзі. Бабку паклалі ў труну і пакінулі адну на ноч з запаленай свечкай. Загарэліся хата і бабуля.

У вёсцы Ліпкі Гудагайскага сельсавета з-за безадказнасці гаспадароў колісь быў пажар. Пенсіянер меў «моду» курыць у хаце. Аднойчы сыну гэта надакучыла. Сказаў бацьку, каб той выкінуў цыгарэту. Стары паслухаў. Выкінуў недакурак у печ, дзе ляжала папера. А дзверцы не зачыніў. З сынам пайшлі па справах. Калі вярнуліся, дома не было...

Вось і новы «аб'ект». Зноў чорны комін. Хата зачынена. Да нас падыходзіць мясцовая жыхарка. «П'юць як і раней, — паведамляе пажарным жанчына. — Ды за што яны адрамантуюць печ? — дзівіцца гаварка жанчына. — Грошы прапіваюць. Вось і сёння ў лес у лісічкі пайшлі. Кілаграм 7 тысяч каштуе! Здадуць і будуць «гуляць»...

Падыходзім да наступнай хаты. Усюды кошыкі, раскіданыя прыстасаванні і прылады. Зайшоўшы ў пакой, дзе стаіць печка, бачым пажылую жанчыну і дзяўчынку. Жанчына паказвае печку, якой карыстаецца. Чорная ад дыму столь пад цяжарам сажы, здаецца, зараз зваліцца на падлогу. Печ, на якой гатуецца ежа, нельга паліць.

У трэцяй хаце таксама не бачым падстаў для радасці. Печ, дымаход, праводка — як і ў папярэдніх аднавяскоўцаў. Гаспадыня расказала, што мае двух сыноў. Адзін адбывае пакаранне на «хіміі», другога з раніцы павезлі да нарколага. На пытанне, чаму, калі ёсць мужчына ў хаце, печ развальваецца, адказала, што сын хворы — «гарэлкавая» эпілепсія.

Пасля апошняга прыпынку ў адным з дамоў Карвэляў працягваць рэйд асабіста мне ўжо не хацелася. У хаце, дзе печ нельга было выкарыстоўваць, электраправодка аказалася злучаная правадамі ад гірлянды. Акрамя трох дарослых, там жывуць двое дзяцей малодшага школьнага ўзросту. У доме антысанітарыя, гаспадары на заў-вагі пажарных адказалі, што «нічога страшнага, жылі так і раней...».

На «работу над памылкамі» пажарныя далі мясцовым жыхарам два тыдні. Калі зрухаў не адбудзецца, вінаватыя заплацяць штраф. Толькі ці будзе гэтага пакарання дастаткова, каб прадухіліць трагедыю?

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

**На тэрыторыі Астравецкага раёна з пачатку 2007 года адбылося 32 пажары, у якіх загінула 6 чалавек. 8 пажараў адбылося на тэрыторыі Гудагайскага сельсавета, 5 — у Астравецкім, 4 — у Гервяцкім, 3 — у Варнянскім, па 2 — у Міхалішкаўскім і Трокеніцкім, па 1 — у Спондаўскім і Кямелішкаўскім сельсаветах.**

# ЧЫМ УДАРЫЦЬ ПА П'ЯНСТВУ?

На тэрыторыі Аўсянкаўскага сельсавета Горацкага раёна колькасць залежных ад алкаголю, на думку старшыні Мікалая Янчанкі, у апошнія гады перастала расці. Проста кажучы — народ выпівае, як і ўсюды.

— У нас у гаспадарцы працуе камісія па барацьбе з п'янствам, — расказвае Мікалай Янчанка. — І засядае вельмі аператыўна: учора выявілі — сёння на разбор. Напярэдадні раніцай абмеркавалі свежы, так бы мовіць, факт. Жанчына працуе на ферме вартаўніком: дзяжурная група гаспадаркі праверыла яе ў 12 гадзін ночы — была цвярозая, а праз колькі гадзін пад'ехаў кіраўнік і заспеў яе ўжо п'янай. Папыталіся: «Чаму выпіла на працы?» А яна шчыра адказвае, што, маўляў, праверылі — дык чаму ж не выпіць на радасцях? Не ведала, што прыедуць зноў. Такое вось жыццё ў жанчыны: муж піў, сужыцель п'е, і яна таксама прыкладаецца да бутэлькі...

Усім, хто хоча пачаць новае цвярозае жыццё, гаспадарка «Аўсянка» дае магчымасць закадзіравацца бясплатна. Праўда, умова такая: пачаў зноў выпіваць раней чым праз 5 гадоў — калі ласка, вярні грошы, ды яшчэ, можа, і штраф. Таму і папярэджваюць кандыдатаў на кадзіраванне, што тут поспех залежыць не толькі ад медыкаў, але і ад сілы волі самога чалавека. Але ўсё ж ёсць у людзей жаданне адмовіцца ад бытавога п'янства: днямі яшчэ некалькі чалавек папрасілі кіраўніцтва «Аўсянкі» аб кадзіраванні.

Сітуацыю пагаршае і несанкцыянаваны гандаль «несапраўднай» гарэлкай. Ці папросту кажучы — вадкасцю, якая ўтрымлівае спірт і разведзеная звычайнай вадой. Разам з участковым інспектарам міліцыі мясцовыя ўлады выявілі на сваёй тэрыторыі два такія пункты. А нядаўна знайшлі новы: у адной з вёсак таннае віно прадавалі ў прыватнай хаце пасля закрыцця крамы і бралі за бутэльку на дзве тысячы рублёў больш.

— Праблема тут не столькі ў тым, каб выявіць нелегальных гандляроў спіртнымі напоямі, колькі злавіць іх, — дзеліцца вопытам старшыня Аўсянкаўскага сельскага Савета. — Як даказаць, што яны займаюцца незаконнай справай, калі чужым гэтыя людзі ніколі нічога не прадаюць? А суседзі, аднавяскоўцы звычайна маўчаць, бо ніхто з іх не хоча непрыемнасцяў. Усе кажуць: «Нам тут жыць!» Але ж цярпець гэта немагчыма.

Старшыня Галіцкага сельскага Савета Клімавіцкага раёна Валерый Філімонаў таксама скардзіцца, што з нелегальнымі гандлярамі разабрацца вельмі няпроста.

— Мы падстаўных пакупнікоў дасылалі, міліцыянераў пераапраналі — і часта без плёну, — прызнаецца ён. — Мяжа з Расіяй у нас побач, спірту хапае. Але мала таго што падпольныя гандляры маюць свой кантынгент і з чужымі спраў не маюць, дык яны яшчэ могуць не бутэльку прадаць, а проста наліць у шклянку. Кліент выпівае на месцы і выходзіць з пустымі рукамі. «А чаго хадзіў сюды?» — «Павітаца са знаёмымі!»

Да таго ж, гавораць, і абследаванне хат нічога не дае, таму што паводле закона чалавеку нельга забараніць трымаць у хаце пэўную колькасць вадкасці, якая ўтрымлівае спірт. А нават з некалькіх літраў пры дапамозе вады з-пад крана падробленай гарэлкі можна зрабіць дастаткова.

Што датычыцца барацьбы з п'янствам, то Валерый Філімонаў лічыць, што не застаецца нічога іншага, як пераконваць людзей. Моцна дапамагаюць «публічныя «поркі» — на сходах і на старонках мясцовай прэсы. Шкада толькі, што вёска працягвае жыць паводле свайго правіла: калі хочаш нешта зрабіць, атрымаць дапамогу — гэта магчыма толькі праз пляшку.

— Што рабіць? — перапытвае старшыня Савета. — Трэба даваць людзям пастаянную працу і плаціць нармальны заробак. У нас тут гаспадарку далучылі да іншай, і цяпер засталася толькі ферма ды нядаўна створаны кааператыў па аказанні паслуг насельніцтву. Так што працы не хапае. А людзям трэба даць магчымасць зарабіць на кавалак хлеба. Можа, тады і яны будуць імкнуцца працаваць і не піць?..

> **Што толькі ні прыдумваюць на месцах, каб змагацца з гэтай навалай. І падстаўных пакупнікоў у падпольныя пункты дасылаюць, і міліцыянераў пераапранаюць...**

На тэрыторыі Бацвінаўскага сельсавета Крычаўскага раёна ёсць дзве гаспадаркі — СВК «Звязда-агра» і імя Суворава. Асноўную работу супраць п'янства вядуць менавіта ў працоўных калектывах разам з участковым інспектарам міліцыі.

Старшыня сельскага Савета Сяргей Жогла яшчэ нядаўна быў абавязаны вазіць работнікаў, якія маюць праблемы з алкаголем, на кадзіраванне.

— Ехалі «пацыенты» добраахвотна. Проста мы іх ставілі ў такія ўмовы: хочаш працаваць — не пі, сам не можаш кінуць — кадзіруйся. Але, на жаль, ніхто з тых, каго я вазіў, больш за год без спіртнога не вытрымліваў. Так што кадзіраванне дапамагае часова, а ўсё астатняе залежыць ад чалавека.

Як і раней, і ў гаспадарцы, дзе існыце цэлая сістэма працы з алкаголікамі (не адштурхнуць, а дапамагчы выкарабкацца з п'янай багны), і ў сельсавеце ёсць свае метады. Сяргей Жогла, калі ўбачыць на вясковай вуліцы нецвярозага чалавека, дзейнічае ў залежнасці ад стану яго свядомасці: можа абысціся выхаваўчай гутаркай і адправіць дадому, а можа і выклікаць участковага, які складзе пратакол аб адміністрацыйным парушэнні, што потым можа скончыцца грашовым спагнаннем.

— Але самае галоўнае, каб не захаплялася алкаголем моладзь, — лічыць старшыня сельсавета. — А цяпер жа і ў нас без бутэлькі піва ў руцэ маладых не пабачыш. Аднак у нашай Бацвінаўцы, якая стала аграгарадком, нядаўна з'явіўся фізкультурна-аздараўленчы комплекс, моладзь пачала захапляцца спортам. Трэба, каб і ў вёсцы чалавек мог кудысьці пайсці і нечым цікавым і карысным заняцца.

Праблема п'янства стаіць востра — так адказваюць на пытанне пра барацьбу з алкагалізацыяй насельніцтва ў многіх сельсаветах. Прычым скардзяцца, што ў вясковага п'янства праглядаецца, так бы мовіць, жаночы твар: прадстаўніцы слабой паловы чалавецтва не працуюць і п'юць горкую бадай што не радзей за мужчын. І не разбярэш — ці то з-за праблем з працай і заробкам, ці то з-за звычайнага бязладдзя.

— Я ўпэўнена, што калі сям'я маладая і там п'юць, трэба ўздзейнічаць на іх любымі метадамі, — гаворыць старшыня Любоніцкага сельскага Савета Кіраўскага раёна Валянціна Драчова. — Трэба выклікаць, пытацца, трымаць на кантролі, дапамагаць з працаўладкаваннем. Вось толькі што я займалася пошукам працоўнага месца для маладой жанчыны, якая мае 4-гадовае дзіця. Яна выпівае і курыць, але жанчыну можна выратаваць. Мы яе не кінем.

Кіпучая энергія Валянціны Драчовай, яе нераўнадушная пазіцыя даюць плён: у Любоніцкім сельсавеце сёлета знялі з уліку тры праблемныя сям'і. Бацькі кінулі піць, дзеці ходзяць чыстыя, прэтэнзій мясцовая ўлада не мае. «Трэба працаваць канкрэтна — тады і вынік будзе», — гаворыць старшыня.

А старшыня Кручанскага сельскага Савета Круглянскага раёна Аляксандр Тарасаў мяркуе, што моцна дапамагае ў барацьбе з п'янствам дэкрэт № 18, паводле якога няўдалыя бацькі павінны несці ў тым ліку і матэрыяльную адказнасць за выхаванне сваіх дзяцей.

— Так, дэкрэт падцягнуў нядбайных бацькоў, — гаворыць Аляксандр Тарасаў. — Адчулі, што можам забраць дзяцей. І баяцца, што далей з п'яніцамі няньчыцца не будуць. Гэта добры рычаг.

Хоць і няма ў Кручанскім сельсавеце вялікіх праблем з п'янствам, але ўсё ж давялося сёлета двух чалавек адправіць на лячэнне ў ЛПП. Таму што, зазначае старшыня, выхаваўчыя гутаркі маюць мала сэнсу: п'яніцы нібыта ўважліва слухаюць, а потым ідуць і праз гадзіну прыкладаюцца да бутэлькі нанова. І штрафы таксама мала дапамагаюць, бо часта з п'яніц узяць няма чаго, у тым ліку і грошай. Але гэта не значыць, што трэба апускаць рукі.

На жаль, даць універсальны адказ на пытанне «што зрабіць, каб людзі перасталі піць?» сёння не можа ніхто. У кожным сельсавеце шукаюць свае шляхі і метады. Мікалай Янчанка лічыць, што магутная зброя — гэта нераўнадушнае стаўленне грамадства да праблемы п'янства.

— Я раю людзям не заставацца ў баку ад праблемы, не быць абыякавымі, — гаворыць старшыня Аўсянкаўскага Савета. — Ад нелегальных гандляроў спіртнымі напоямі могуць пацярпець і вашы сваякі і сябры.

**Ілона ІВАНОВА.**

***■ Магілёўская міліцыя актывізавала працу па прафілактыцы п'янства ў сувязі з рэспубліканскім месячнікам, мэта якога — у тым ліку і процідзеянне незаконнаму абароту і вытворчасці алкагольных напояў.***

***■ Паводле афіцыйнай інфармацыі, кожнае трэцяе злачынства ў рэгіёне ўчыняецца на глебе п'янства. А 80 працэнтаў бытавых злачынстваў учынілі нецвярозыя асобы.***

***■ Сёлета ў Магілёўскай вобласці выяўлена каля 3 тысяч парушальнікаў антыалкагольнага заканадаўства, канфіскавана больш за 130 тон спірту і спіртазмяшчальнай вадкасці, знішчана больш за 50 тон самагону і самагоннай брагі.***

***■ За 9 месяцаў гэтага года ад атручвання сурагатнымі спіртамі памерла 267 чалавек.***

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**

**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**

**МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;**

**САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;**

**СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;**

**СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;**

**ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.**

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.**

***Кантактны тэлефон 292 21 03.***

# НЕ ГАРЫМ, АЛЕ ДЫМ ІДЗЕ

**Дэпутаты Віцебскага абласнога Савета абмеркавалі эфектыўнасць выканання мерапрыемстваў па папярэджанні пажараў, гібелі ў іх людзей, забеспячэнні пажарнай бяспекі.**

Дэпутат Васіль Чэкан, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС, адзначыў, што ў рэгіёне ў цэлым не дапушчаны рост гібелі людзей на пажарах у зімовы перыяд і павелічэнне колькасці пажараў з наступленнем вясенне-летняга пажаранебяспечнага перыяду. Разам з тым больш гінуць на пажарах ва Ушацкім, Браслаўскім, Шумілінскім, Міёрскім і Аршанскім раёнах.

Сур'ёзную занепакоенасць у дэпутатаў выклікае стан матэрыяльна-тэхнічнай базы падраздзяленняў МНС. У прыватнасці, з 589 адзінак рознай тэхнікі 60 працэнтаў перавысілі рэкамендаваны тэрмін эксплуатацыі, іх трэба спісваць. У гарнізонах буйных гарадоў адсутнічаюць у неабходнай колькасці аўтамабільныя лесвіцы і пад'ёмнікі, што выкарыстоўваюцца пры тушэнні пажараў і эвакуацыі людзей са шматпавярховых будынкаў.

У некалькіх раённых цэнтрах і гарадскіх пасёлках наогул няма нармальных умоў для нясення службы, многія будынкі аварыйна-выратавальных частак і пастоў патрабуюць капітальнага рамонту.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

СВАЯ СПРАВА
4 8 1
БІЗНЭС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ
Выпуск № 9 (10)
31 кастрычніка
2007 года



Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 5

## АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯ Ў ДЭКРЭТ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД 7 ЧЭРВЕНЯ 2005 Г. № 6

У адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 101 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь пастанаўляю:

1. Падпункт 1.13 пункта 1 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 г. № 6 «Аб упарадкаванні абарачэння і выкарыстання імянных прыватызацыйных чэкаў «Жыллё» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 91, 1/6504; 2006 г., № 142, 1/7859) выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1.13. перарэгістраваныя ва ўстаноўленым парадку чэкі «Жыллё» не падлягаюць:

індэксацыі, за выключэннем выпадкаў выкарыстання іх грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, для выплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам куплі, пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі) і пазыках юрыдычных асобаў, узятых і выкарыстаных на названыя мэты;

адчужэнню, за выключэннем выпадкаў дарэння іх па натарыяльна засведчанаму дагавору мужу (жонцы), бацькам, дзецям, усынавіцелям, усыноўленым, родным братам і сёстрам, дзеду, бабулі, унукам, пераходу права ўласнасці ў спадчыну або па рашэнню суда.

Пры выкарыстанні чэкаў «Жыллё» грамадзянамі і членамі іх сем'яў на пагашэнне запазычанасці па крэдытах банкаў (уключаючы выплату працэнтаў за карыстанне імі) і пазыках юрыдычных асобаў, узятых і выкарыстаных для выплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыі аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам куплі, пасля завяршэння будаўніцтва, рэканструкцыі, набыцця жылых памяшканняў шляхам куплі патрэбнасць у паляпшэнні жыллёвых умоў вызначаецца на дату прадастаўлення такіх крэдытаў (пазык).

Грамадзяне пры выкарыстанні чэкаў «Жыллё» згодна з абзацам другім часткі першай гэтага падпункта маюць права на індэксацыю чэкаў:

налічаных ім ва ўстаноўленым парадку (уключаючы жыллёвыя квоты асобаў, названых у абзацы трэцім часткі першай гэтага падпункта, аб'яднаныя ў імя гэтых грамадзян);

атрыманых у выніку дарэння ад асобаў, названых у абзацы трэцім часткі першай гэтага падпункта, налічаных дарыльшчыку ва ўстаноўленым парадку (уключаючы жыллёвыя квоты гэтых асобаў, аб'яднаныя на імя дарыльшчыка) або атрыманых дарыльшчыкам па дагаворах дарэння, у спадчыну або па рашэнню суда пры ўмове, што грамадзяне, якім з самага пачатку гэтыя чэкі былі налічаны ва ўстаноўленым парадку (уключаючы жыллёвыя квоты, аб'яднаныя на імя гэтых грамадзян), у адносінах да адоранага ўваходзяць у лік асобаў, названых у абзацы трэцім часткі першай гэтага падпункта;

атрыманых у спадчыну або па рашэнню суда.

Праіндэксаваныя чэкі «Жыллё» могуць быць выкарыстаны для пагашэння кошту будаўніцтва, рэканструкцыі або набыцця толькі аднаго жылога памяшкання.

Чэкі «Жыллё», што падлягаюць выкарыстанню ў адпаведнасці з часткай першай гэтага падпункта, індэксуюцца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь;».

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у двухмесячны тэрмін:

забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Дэкрэтам;

прыняць іншыя меры па рэалізацыі гэтага Дэкрэта.

3. Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму ўстанавіць парадак і ўмовы пералічэння грашовых сродкаў ад індэксацыі чэкаў «Жыллё».

4. Гэты Дэкрэт уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання, з'яўляецца часовым і згодна з часткай трэцяй артыкула 101 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляецца на разгляд Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА.**

*29 кастрычніка 2007 г., г. Мінск.*

# БРАТЭРСКАЯ ЛЮБОЎ ДА ЖЫВЁЛЬНАГА СВЕТУ

У Магілёўскім «ВетЗоаЦэнтры» адносна спакойны дзень. Чорная пудзеліха Дана, якой паставілі кропельніцу, пакорліва ляжыць на каленях у сівавалосага гаспадара. У скрынях сядзяць «п'яныя» ад наркозу каты і кошкі — адыходзяць пасля планаваных аперацый. У адной з іх — маленькае кацяня, якое пакусала драцэну і цяпер пакутуе ад атручэння.

Назіраючы за ўсімі пацыентамі, ветэрынар Аляксандр Шнур распавядае выпадак, якія нядаўна яго ўразіў:

— У цэнтры горада каля прыпынку плакала кацяня з адрэзанай лапай — відаць, пацярпела ад аўтамабіля, — гаворыць ён. — Усе ішлі і проста глядзелі, а жанчына пашкадавала, узяла і да нас прывезла. У нас тут, калі заўважылі, ёсць скрыня «Для бяздомных жывёл», куды людзі кідаюць хоць і дробныя купюры, але вельмі актыўна. Дзякуючы гэтаму безгаспадарных катоў і сабак мы можам бясплатна лячыць. Таму кацяняці мы рану зашылі, яно і на трох будзе цудоўна спраўляцца. А тая жанчына — помнік ёй трэба паставіць — узяла выратаванага да сябе, у кампанію да сваёй кошкі і цяпер няньчыцца з ім.

Гутарку перарывае з'яўленне Рыгора Шнура, старэйшага брата Аляксандра. «ВетЗоаЦэнтр» — гэта свая справа двух маладых братоў-ветэрынараў.

Пакуль самі яны занятыя з пацыентамі, іх маці Марыя Іосіфаўна расказвае, што ўсё пачалося з любові да жывёл. Аказваецца, Рыгор з пяці гадоў марыў стаць ветэрынарам — з тых часоў, калі стаў хадзіць на працу разам з дзедам-жывёлаводам.

Рыгор з задавальненнем даглядаў хамякоў і марскіх свінак, а потым школьнік вырашыўся: калі бацька з'ехаў у камандзіроўку, ён узяў грошы (150 рублёў — немалыя па тых часах) і набыў шчаня. Так у Шнураў з'явіўся любімы эрдэль-тэр'ер Норд, які двойчы ратаваў гаспадыню ад нядобрых людзей, што ламаліся ў кватэру. Калі выскоквваў сабака і пачынаў аглушальна гаўкаць, зладзеі збягалі.

Пасля заканчэння Віцебскай ветэрынарнай акадэміі браты вярнуліся ў Магілёў і пачалі справу.

— Так, гэта мая любімая праца, — усміхаецца Рыгор. — Я пра яе марыў, і ўсё ажыццявілася. Саша вырашыў пайсці за мной. І ніхто з нас не шкадуе, ніводнай секунды.

У час вучобы ў акадэміі Рыгор працаваў на кафедры хірургіі і ў прыватных ветклініках Віцебска, таму не сумняваўся, што трэба адкрываць сваю фірму. Ён — чалавек з незалежным характарам, падпарадкоўвацца начальнікам не любіць і працаваць «ад званка да званка» таксама.

Затое цяпер даводзіцца працаваць значна болей: напрыклад, днямі акурат у 19 гадзін, калі «ВетЗоаЦэнтр» зачыняецца, прынеслі кошку, якой тэрмінова была патрэбна аперацыя. Рыгор таксама ніколі не выключае мабільны тэлефон, і можа на парозе апоўначы спакойна тлумачыць расхваляванаму гаспадару, што рабіць з катом, якога цешча незнарок запіхнула ў канапу.

Попыт на паслугі ветэрынараў ёсць. У клініцы братоў прымаюць у дзень каля двух дзесяткаў пацыентаў. У прыёмнай заўсёды сядзяць некалькі чалавек, якія сутаргава прыціскаюць да грудзей сваіх захварэлых калматых любімцаў.

На аднаго пацыента — як мінімум тры чалавекі для маральнай падтрымкі, таму ў пакоі шматлюдна. Каты і сабакі сядзяць ціха — так на іх уздзейнічаюць медыцынскія пахі і боязь. Урэшце, жывёлы паводзяць сябе вельмі падобна на людзей, якія трапляюць у медыцынскія ўстановы — нібыта ўціскаюць галаву ў плечы і чакаюць сваёй долі.

Цяпер, дарэчы, самы гарачы сезон для ветэрынараў: улетку многія з'язджаюць з жывёламі на лецішчы, а з халадамі вяртаюцца і лечаць хваробы.

— Мы маем прафесію, якая заўсёды дасць магчымасць зарабіць на кавалак хлеба, — гаворыць браты Шнуры. — Яшчэ ў час вучобы жартавалі, што ветэрынары памруць апошнімі, калі наступіць вялікі голад. Таму што людзі заўсёды будуць даглядаць і лячыць сваіх любімцаў.

Каго толькі не давялося лячыць! Кракадзіла, які жыў у мінскім офісе і параніў нагу. Льва з цырка — трэба было пайсці за дрэсіроўшчыкам у клетку. Потым былі яшчэ малпы і нават мядзведзь.

— Мне ўсё роўна, каго лячыць: ад прусака да жырафа! — смяецца Рыгор.

Расцэнкі ў ветклініцы даволі прымальныя, як гаворыць гаспадары — не перавышаюць плацежаздольнасці людзей. Вядома ж, хацелася б большага — у Маскве кошт паслуг ветэрынараў утрая большы, але ёсць рэальнасць.

Браты Шнуры імкнуцца адпавядаць міжнародным стандартам і праводзіць дыягностыку ўсімі даступнымі метадамі. Можна і трэба развівацца далей, але для гэтага патрэбны сёння немалыя грошы. Хацелася б болей работнікаў, стацыянар і гатэль для хатніх жывёл, новае абсталяванне...

Цяпер і маладым спецыялістам ў ветэрынарыі даводзіцца добра пралічваць рызыкі адкрыцця сваіх спраў, бо трэба разлічваць на крэдытныя рэсурсы.

— А таксама думаць пра тое, што ветэрынар, тым больш прыватны, — гэта цяжкая і вельмі адказная праца, — нагадвае Рыгор. — Часам даводзіцца быць не толькі ветэрынарам, але і псіхолагам. Адной рукой дапамагаць жывёліне, а іншай — наліваць карвалолу гаспадару. І вельмі цяжка вытрымаць слёзы гаспадароў і глядзець у вочы жывёл, і прызвычаіцца да гэтага нельга...

Што ж, у клініцы нярэдка плачуць ад гора, і нават суровыя мужчыны. Стары прынёс у кайстры кошку: жывёліна хварэла, яе лячылі, а тут з'ехала гаспадыня — і коцы стала зусім дрэнна. Мужчына спахапіўся і пайшоў да ветэрынараў, але прынёс, на жаль, ужо мёртвую кошку. І зрабіць нічога нельга. На вачах старога — слёзы. Ветэрынар раіць тэрмінова, да прыезду жонкі, узяць у хату кацяня.

На руках у жанчыны — карлікавы сабачка, які скуголіць бесперапынна. На малога незнарок наступіў муж гаспадыні і, на жаль, дапамагчы жывёліне ўжо нельга. Плачуць абодва.

Цяжкая доля — усыпляць безнадзейна хворую жывёліну. Непрыемна і цяжка на душы, уздыхаюць браты. Аднак яшчэ больш прыкра, калі гаспадары самі хочуць і нават патрабуюць усыпіць сваіх хатніх жывёл.

— Ёсць і такія бяздушныя людзі, — пацвярджае Рыгор. — Калі сабака ці кошка захварэла, не хочуць з жывёлінай няньчыцца. Літаральна ўчора гаспадары кокер-спаніэля настойліва прасілі ўсыпіць сабаку. Так, ён захварэў, яму патрэбна аперацыя, але гэта не нагода для эўтаназіі. Уявіце, сем гадоў гэты сабака прыносіў у дом радасць, суцяшаў гаспадароў, калі яны прыходзілі з дрэнным настроем, быў іх аддушынай. А цяпер ён больш не патрэбны. Мы спрабавалі ўгаварыць тых людзей, але яны так і не з'явіліся на аперацыю — відаць, пайшлі да іншых ветэрынараў.

А ў гэты момант маладая аўчарка Тэры, якой выдалялі швы пасля аперацыі, скуголіла на вуха свайму гаспадару, нібыта скардзілася — што ёй балюча і страшна, а мужчына яе суцяшаў. Нібыта ў адказ у сваёй скрыні падняла галаву котка, якая наелася драцэны: відаць, ідзе на папраўку на радасць гаспадыні, якая хутка прыбяжыць па яе з працы.

— Усе людзі розныя, — разважае Аляксандр. — І большасць гаспадароў жывёл змагаецца за здароўе і жыццё сваіх любімцаў да апошняга. І выпадкі нераўнадушша да бяздомных і хворых жывёл таксама не адзінкавыя.

Браты ўзгадваюць, як аднойчы ў клініку патэлефанавала дзяўчына і папрасіла тэрмінова прыехаць, бо аўтамабіль наехаў на сабаку. Вадзіцель з'ехаў, дварняк ляжыць нерухома, а дзяўчына, якая бачыла здарэнне, стаіць і плача. Яна сказала: «Калі выратуеце, буду лячыць і забяру да сябе». Да шчасця, сабака абышлася перапудам, але гаспадыню так і не займела — збегла ад ратавальнікаў пасля абязбольнага ўколу.

Ветэрынар дзеліць людзей на сабачнікаў і кашатнікаў. Абазначыць рысы кожнай групы Рыгор не бярэцца, аднак паводле манеры паводзінаў ніколі не памыляецца. Ён кажа, што гаспадары і іх жывёліны перайманюць адзін ад аднаго нейкія рысы — прычым узаемна.

Паводле ўласнай статыстыкі ветэрынара, магіляўчане ўсё ж больш трымаюць катоў, чым сабак. Прыкладна 60х40. Гэта, хутчэй, звязана не з любоўю да катоў, а з меншымі праблемамі з доглядам. З сабакам трэба выходзіць на шпацыры нават у самае паганае надвор'е.

Дарэчы, любіць кошак Рыгора навучыла жонка, у якой на момант знаёмства быў не толькі сабака, але і кот — самастойная асобіна, якая сама добра ведае, што яна на свеце робіць і як ёй жыць далей.

Той кот цяпер — ганаровы жыхар дома, дзе жыве сям'я Шнураў. Тут трымаюць чатырох катоў — большасць падабрана на сметніку, і двух сабак — аўчарку і дварняка Нану. Яна, дарэчы, атрымала сваё імя ад дзяцей, якія кармілі бяздомнага сабаку на вуліцы: «На!На!» Рыгор забраў жывёліну да сябе і не шкадуе: Нана — вельмі добрая, як жартуе гаспадар, заліжа да смерці.

З усімі хатнімі жывёламі на «ты» 7-месячны сын Рыгора Эрнэст. Вельмі верагодна, што ён працягне дынастыю ветэрынараў: каты побач з ім вольна спяць і не збягаюць, калі малы тузае іх за вушы і хвасты. І зусім не баіцца, калі сабакі паважліва абнюхваюць маладога гаспадара.

Трэба адзначыць, што Аляксандр і Рыгор — у абывацельскім разуменні дзіўныя людзі. Адзін можа ўначы спыніць аўтамабіль, калі бачыць на дарозе сабаку: ідзе гаваць — каб ніхто не збіў. А іншы возіць у машыне корм для бяздомных жывёлін.

— Ён ім асабліва патрэбен у халады, калі зусім дрэнна і выжыць цяжка, — тлумачыць Рыгор. — Я прашу ўсіх не крыўдзіць бяздомных: не штурхаць ката, які падышоў да вас у чарзе, і не кідаць камянямі ў сабаку, калі вам не падабаецца яго кудлатасць. Лепш падзяліцеся ежай. Праўду кажуць, што стаўленне да бяздомных сабак і катоў вызначае ўзровень гуманнасці грамадства. Я не хачу крыўдзіць наша грамадства, але больш за тры балы пакуль паставіць не магу. Па 10-бальнай шкале. Трэба быць больш цярпімымі. Калі людзі будуць больш лагодна ставіцца да бяздомных жывёл, то і грамадства незаўважна стане значна лепшым.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Юрыдычныя асобы і ІП у месячны тэрмін павінны афарміць новыя кнігі ўліку праверак

У Беларусі юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі ў месячны тэрмін павінны афарміць новыя кнігі ўліку праверак (рэвізій), уведзеныя з 18 кастрычніка 2007 года ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў № 1284, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве па падатках і зборах.

У дакументе агаворана, што юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам необходна ў месячны тэрмін запоўніць, пранумараваць, прашнураваць і змацаваць подпісамі і пячаткамі кнігі новай формы. У далейшым яны павінны быць засведчаны ў падатковых органах.

Для таго каб усе плацельшчыкі мелі магчымасць набыць кнігі належнай формы і ў дастатковай колькасці, Міністэрства па падатках і зборах цяпер вызначае цэнтралізаванага вытворцу і распаўсюджвальніка кніг, распрацоўвае парадак іх засведчання і ўліку.

Каб пазбегнуць чэргаў і для забеспячэння прыёму плацельшчыкаў па прынцыпу «аднаго акна» прадугледжана, што засведчыць афармленыя кнігі ў падатковых органах можна будзе да 1 студзеня 2008 года па пэўнаму графіку. Для гэтага юрыдычныя асобы і ІП пры правядзенні праверак прадстаўляюць наяўныя кнігі ўліку праверак (рэвізій), а кантралюючыя органы ўносяць у іх звесткі аб праведзенай праверцы з называнням усіх рэквізітаў, прадугледжаных пастановай урада № 1284. Пры засведчанні новай кнігі ў кнізе, якая выкарыстоўвалася раней (якая замяняецца), пасля запісу аб апошняй праведзенай праверцы падатковым органам будзе зроблены запіс аб даце засведчання і нумары новай кнігі. Пасля ўнясення такога запісу выкарыстанне заменанай кнігі спыняецца.

## КАМПАНІЯ SAMSUNG АФІЦЫЙНА ВЫХОДЗІЦЬ НА БЕЛАРУСКІ РЫНАК

Кампанія Samsung адкрыла сваё афіцыйнае прадстаўніцтва ў г. Мінску. Кіраўнік прадстаўніцтва Samsung у Беларусі і ва Украіне спадар Йон Джэй Чан падзяліўся з журналістамі планамі кампаніі.

На прэс-канферэнцыі ён заявіў, што адкрыццё офіса ў Мінску ўмацоўвае пазіцыі карпарацыі ў Беларусі і сведчыць аб доўгатэрміновых планах развіцця і прасоўвання фірменных прадуктаў на беларускім рынку.

— Беларусь — краіна з высокім узроўнем пранікнення інфармацыйных тэхналогій ва ўсе сферы жыцця. Беларускі рынак прадстаўляе вялікую цікавасць для кампаніі Samsung, — падкрэсліў спадар Йон Джэй Чан. — Так, маніторы Samsung займаюць 1-е месца на долі рынку, разнастайныя прадукты кампаніі былі ўдастоены ўзнагарод «Выбар года». З адкрыццём прадстаўніцтва, — заключыў карэйскі госць, — мы хочам стаць бліжэй да нашых спажыўцоў і партнёраў, лепш арыентавацца на рынку і своечасова прапаноўваць навінкі. Асноўнымі функцыямі беларускага прадстаўніцтва будуць: назіранне за рынкам, сертыфікацыя прадуктаў і маркетынгавая дзейнасць. Поспех кампаніі Samsung і папулярнасць яе гандлёвай маркі тлумачацца высокімі тэхналагічнымі рашэннямі, удасканаленнем прадукцыі з пункту гледжання эргаманомікі і дызайну на аснове пастаянных даследаванняў спажывецкіх пераваг.

**Кар. «Звязды».**

## СА СТУДЗЕНЯ 2008 ГОДА ЧАКАЕЦЦА ЗНАЧНАЕ ПАВЫШЭННЕ ЦЭН НА СТАМАТАЛАГІЧНЫЯ ПАСЛУГІ

**У Беларусі са студзеня 2008 года чакаецца значнае павышэнне цэнаў на стаматалагічныя паслугі. Аб гэтым паведаміў галоўны пазаштатны стаматолаг Міністэрства аховы здароўя Беларусі доктар медыцынскіх навук, прафесар Сямён Навумовіч.**

Паводле яго слоў, апошняе павышэнне цэнаву на гэтыя паслугі праведзена ў маі гэтага года, калі яны павялічыліся на 10—15 працэнтаў. На колькі яны павысяцца на гэты раз, цяпер узгадняецца. Неабходна яшчэ канкрэтызаваць віды стаматалагічных паслуг, якія будуць аказвацца грамадзянам розных катэгорый па-ранейшаму бясплатна.

Мяркуемае павышэнне цэнаў на стаматалагічныя паслугі абумоўлена павелічэннем іх рэальнага кошту. У стаматалогіі Беларусі неабходна ўмацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу і вырашаць пытанні з няхваткай урачоў у сельскай мясцовасці. Трэба прывесці вучэбныя базы стаматалагічных кафедраў БДМУ, ВДМУ і БелМАПА ў адпаведнасць з вучэбнымі задачамі падрыхтоўкі і ўдасканалення навыкаў урачоў-стаматолагаў.

**БЕЛТА.**

## «БАНК МАСКВА—МІНСК»

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка краіны, адкрытае акцыянернае таварыства «Банк Масква—Мінск» створана ў выніку рэарганізацыі ў форме пераўтварэння ўнітарнага прадпрыемства «Замежны банк «Масква—Мінск». Сёння заснавальнікамі гэтай крэдытна-фінансавай установы з'яўляюцца ААТ «Банк Масквы» і яго дачыная кампанія, зарэгістраваная ў Швейцарыі.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

**УПРАВЛЯЮЩИЙ В ДЕЛЕ О БАНКРОТСТВЕ ГТПУП «ЗВЕЗДА» Г. БОРИСОВ, СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

проводят открытый аукцион по продаже кафе «Витязь» (с оборудованием и мебелью), об. пл. 557 кв.м, расположенного по адресу: г. Борисов, ул. Серебренникова, военный городок «Печи». Начальная цена с НДС — 175 817 050 белорусских рублей. Площадь земельного участка — 0,2641 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 31.05.2007 г. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 30 дней со дня проведения торгов. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 15 ноября 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14 ноября 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Тел: (8017) 224 61 34.

**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

Утерянный страховой сертификат «Зеленая карта» Представительства ЗАСО «ТАСК» в г. Минске № 2 серия BY/02 № 1905418 считать недействительным.

## ПАЗБАЎЛЕНЫ ЛІЦЭНЗІІ

У Беларусі за апошнія чатыры гады 26 ігральных устаноў былі пазбаўлены ліцэнзіі і спынілі сваю дзейнасць, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Камітэце дзяржаўнага кантролю.

У ходзе комплексных праверак ў 99 працэнтаў ігральных устаноў выяўляюцца парушэнні, звязаныя як з нявыплатай падаткаў у дзяржбюджэт, так і з фінансава-гаспадарчай дзейнасцю. Так, напрыклад, апошняя праверка вядомага сталічнага забаўляльнага комплексу «Данькаў-клуб» выявіла больш як 10 парушэнняў.

У Беларусі цяпер працуюць 62 казіно. З кожным годам павялічваецца ў рэспубліцы колькасць ігравых аўтаматаў. Толькі за 9 месяцаў гэтага года іх было ўстаноўлена 1,8 тыс., 56 працэнтаў ад гэтай колькасці завезена ў Беларусь з Расіі.

# ІГОЛКА З НІТКАЙ ПАДТРЫМАЕ

**Звычайная жанчына ўсё жыццё адпрацавала швачкай, а перад пенсіяй вырашыла адкрыць сваю справу. Справу зусім маленькую, бо ўсё завязана на іголцы з ніткай.**

Напісаць цікава пра чалавека, які займаецца даволі будзённай справай і спадзяецца толькі на сваю галаву і рукі — няпроста. Даводзілася расказваць пра людзей, якія наладзілі бізнэс і працуюць у ім ужо не адны, а вось каб чалавек застаўся са сваёй справай адзін на адзін, не даводзілася. І вось у чаканні холаду пайшоў шукаць майстра, які ў куртку ўставіў бы новую «маланку». Так і пазнаёміўся з Нінай Калеснікавай.

У маленькай хатцы, за некалькі сотняў метраў ад цэнтральнай вуліцы Леніна, знаходзіцца майстэрня па рамонце адзення. Прышыць гузікі, нешта замяніць, падцыраваць ці падагнаць... вось, бадай, і ўсё, што дазваляе рабіць ліцэнзія.

Дарэчы, у СССР швачкі маглі займацца надомнай працай, хоць такую магчымасць мелі толькі майстры асобных прафесій. Неабходна было ўзяць патэнт і працаваць. Але найчасцей майстрыхі шылі ўцяхую, мелі сваіх кліентаў і вельмі баяліся, што можа нечакана зазірнуць інспектар, таму заказы хавалі ў самых патаемных месцах.

Сёння сітуацыя зусім іншая, але пераважная большасць швачак ідзе працаваць за невялікую зарплату па найме, а не адкрывае сваю справу. Напэўна, гэта звязана з тым, што далёка не кожная жанчына здольная на такі рашучы і адказны крок.

І што прымусіла ўжо немаладую жанчыну стаць індывідуальным прадпрымальнікам, тым больш што працаваць з іголкай у такім узросце даволі цяжка?

— Найперш, тое, што пенсія невялікая, бо ў тых, хто працаваў у лёгкай прамысловасці, зарплаты былі невысокія. А затым у адзін год пахавала маці і мужа і вырашыла сама ўладкавацца на працу. Сёння, калі ты не малады, то асабліва на працу не хочуць браць. А тут знаёмая прапанавала гэтую хатку, і грэх было не паспрабаваць, — кажа Ніна Рыгораўна.

Крыху здзівіла разважлівасць жанчыны, а калі яшчэ думкі ў чымсьці пераклікаюцца з тваімі, то размова атрымліваецца даволі адкрытая.

— Калі хочаш жыць і не будзеш гультаяваць, то грошы заробіш, — працягвае жанчына.

Бацькі Ніны Калеснікавай родам з Белаточчыны, а калі пасля вайны прыехалі ў госці пад Баранавічы, то давялося застацца — Беласток апынуўся на другі бок мяжы.

— Мы заўсёды жылі ў глыбокай нястачы. Бацька быў інвалідам вайны, а пенсію тады плацілі маленькую. Напачатку сем рублёў, затым дзевяць, дванаццаць, — успамінае мая суразмоўца, — і ў калгасе капейкі...

Магчыма, з гэтай прычыны Ніна Рыгораўна асабліва на лёс і не разлічвае.

— Лёс — гэта часта як сам павернеш. Нічога дармавога не звальвалася, калі была маладой, не зваліцца і цяпер, — разважае жанчына.

Заказаў хапае, і пакуль мы размаўлялі, некалькі чалавек зазірнула ў майстэрню. Кліенты не толькі з горада, а яшчэ з Гарадзеі, Ляхавічаў, Гарадзішча... Здараюцца і накладкі. На стале ляжыць цэлы стос заказаў, якія ўжо некалькі гадоў чакаюць сваіх гаспадароў. Людзі прынеслі нешта перарабіць, а забіраць не ідуць. І хоць Ніна Рыгораўна падкрэслівала, што людзям працягвае верыць, але з кліентаў ужо бярэ грошы наперад. А інакш не выходзіць. Хоць з заказчыкамі вялікіх праблем няма — адносіны добрыя. Жанчына лічыць, што праблемы ўзнікаюць там, дзе круцяцца вялікія грошы. А тут калі ўдаецца, то па магчымасці хоць бы сыну чымсьці дапамагчы, а найбольш яна да ўнука хіліцца.

Не ўтрымаўся і спытаў: ці не хацелася б вярнуцца назад у былы Саюз?

— Чаму б не вярнуцца, але толькі не з той зарплатай, — сказала Калеснікава, — а ўсё ж найлепш так, як цяпер. Няма над табой майстра, дырэктара, парторга і ў калгас не гоняць па выхадных. Я адказваю толькі перад заказчыкамі. Ды, увогуле, калі чалавек самастойны, то гэта вялікая справа.

Замена «маланкі» абышлася мне каля 8 тысяч, але гэта танней, чым у атэлье. Ва ўсякім разе, майстрыха паведаміла, што за работу яна бярэ крыху менш, чым другія, і канкурэнцыі не баіцца.

Напачатку тую «маланку» думаў сам замяніць, але калі паглядзеў, колькі работы, а галоўнае, што ўсё трэба зрабіць вельмі акуратна, то ад задумы адмовіўся. Кожны павінен займацца сваёй справай.

Даведаўшыся, што ў Ніны Рыгораўны шмат родных ў Польшчы, пацікавіўся: а як жывуць там?

— У нас не ўсё аднолькава, і там таксама. Многае залежыць ад самога чалавека. Калі галаву мае, то жыве...

Але ў гэтым нічога новага няма, бо жыццё самой жанчыны якраз і сведчыць, што добры спецыяліст, майстра запатрабаваны будзе заўсёды.

Падводзячы рысу пад нашай размовай, падумаў: вось чалавек усё жыццё змагаўся за сваё месца пад сонцам, а прасцей кажучы, за існаванне, бо што можа быць больш празаічным, як з дня ў дзень, з году ў год праходзіць час, схіліўшыся над швейнай машынкай? І ўсё ж жанчына абышла многіх, больш маладых і амбіцыйных — яна адчула, што такое быць вольнай у працы, хоць, напэўна ж, хацелася б свабоды крыху іншай — магчымасці адпачыць, спакойна дажыць свой век.

Але ці заўсёды так бывае?

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

А на мой погляд...

# Цяпер на выбар прафесіі ўплываюць новыя стымулы і магчымасці, якіх не было раней

***Кожны з нас у жыцці аб нечым марыў ці марыць. Я не маю на ўвазе нейкія матэрыяльныя каштоўнасці найперш. Гаворка аб прафесіі, сферы заняткаў чалавека. Як часам бывае: нехта, падаецца, імкнуўся да нечага, упарта рухаўся да пастаўленай мэты і толькі значна пазней зразумеў, што абраная справа — не для яго. Іншы з маленства быў упэўнены ў адным выбары, а цяпер працуе, падавалася б, не па «профілю», але цалкам задаволены жыццём і не прыгадвае пра свае колішнія мары. Па-рознаму бывае...***

***Калі б надалася магчымасць (было б жаданне, сродкі і інш.), у якой іншай сферы вы маглі б (хацелі б) працаваць, магчыма, адкрыць уласную справу?***

**Аляксандр ШОКАЛЬ, дзяржінспектар Лідскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету:**

— Увогуле ў мяне дзве вышэйшыя адукацыі. Па першай я кадравы афіцэр, у 1991 годзе скончыў ваеннае вучылішча ў Львове. Са службы звольніўся ў званні старшага лейтэнанта: часць, у якой я служыў, трапіла пад расфарміраванне. Другая адукацыя ў мяне эканамічная.

Сваёй цяперашняй і працай, і пасадай я цалкам задаволены. Мне вельмі падабаецца мая работа, адчуваю сябе «чалавекам дзяржаўным». Магчыма, таму, што ў ёй спалучаюцца і дысцыпліна накшталт ваеннай, і неабходнасць валодаць пэўнымі эканамічнымі ведамі, паколькі даводзіцца і пратаколы складаць, і памеры нанесенага браканьерамі ўрону вылічваць. Хацеў бы і надалей працаваць у абранай сферы. З іншага боку, памятаеце: дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам?! Думаю, з цягам часу ў жыцці можа «вырысавацца» і яшчэ нешта іншае...

**Святлана САРВІРАВА, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Гомельскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа:**

— Я маю дзве адукацыі: хіміка-біялагічную і эканамічную. Вельмі люблю хімію, якую зараз выкладаю, і біялогію. Праца мне падабаецца, але калі б давялося нешта змяніць у жыцці, хацела б займацца фармацэўтыкай: адкрыць сваю аптэку ці лабараторыю па стварэнні лекавых прэпаратаў. Звышадкрыццяў мне не трэба, проста падабаецца малекулярная біяхімія, блізкай з'яўляецца даследчая работа. Так, зараз акрамя выкладчыцкай дзейнасці я яшчэ працую і з моладдзю. Мне падабаецца, але, скажу шчыра, з кожным годам рабіць гэта становіцца ўсё складаней.

Вы пытаецеся, чаму я раней не абрала крыху іншы шлях у жыцці з улікам уласных памкненняў? Ведаеце, некалі былі крыху іншыя погляды на жыццё. Пасля заканчэння ў савецкія часы Гомельскага ўніверсітэта я па размеркаванні трапіла на работу як педагог, ды так і засталася тут, «уцягнулася», як кажуць (*смяецца*). Другую, эканамічную адукацыю атрымлівала дадаткова, калі надалася такая магчымасць: а раптам спатрэбіцца. Але мара мая пра фармацэўтыку застаецца. Якія рэальныя шанцы ўвасобіць яе ў жыццё? Думаю, працэнтаў 20 (*смяецца*).

**Галіна ГРАЧОВА, юрыст ААТ «Белсувязьбуд»:**

— Цікавае пытанне... Хутчэй за ўсё, занялася б псіхалогіяй. Я захапляюся гэтай навукай, шмат чытаю адпаведнай літаратуры. Упэўнена, што чалавек сам можа змяняць свой лёс. Яшчэ мяне цікавіць ізатэрыка — таксама навука, калі вельмі спрошчана, гаворка пра гараскопы, лініі лёсу, карму. Я ўпэўнена, што кожны чалавек невыпадкова прыходзіць у гэты свет, веру, што душы неабходна вяртацца на зямлю 7 ці 9 разоў, прычым, не проста так, а з тым грузам, які быў дагэтуль, каб нешта выправіць.

...У 1980-я гады, калі я заканчвала Маскоўскі ўніверсітэт, у СССР нічога гэтага не было, стаўленне да той жа псіхалогіі было зусім іншым. Не выключаю, што калі пайду на пенсію, займуся ёй усур'ёз, магчыма, атрымаю адпаведную адукацыю. Гэта прафесія вельмі запатрабавальная, асабліва зараз і найперш для сучаснай моладзі. Ім цяпер жыць складаней, чым іх папярэднікам, у якіх жыццё было фактычна распісана далёка наперад: піянер—камсамолец—абавязковае працаўладкаванне—бясплатнае жыллё... Размаўляючы з моладдзю, я бачу, наколькі ім часам сёння бывае цяжка. І менавіта псіхалогія як навука можа дапамагчы ім зразумець многае, у тым ліку і саміх сябе найперш.

**Канстанцін КОЗЕЛ, дырэктар філіяла «Тралейбусны парк № 2» КУП «Мінскгарэлектранс»:**

— Я з дзяцінства люблю транспарт і з той пары непарыўна звязаны з гэтай прафесіяй. Напачатку скончыў Кіеўскі тэхнікум гарадскога электратранспарту, потым Беларускую політэхнічную акадэмію, ужо калі стаў дырэктарам — Беларускі эканамічны ўніверсітэт. Ніякіх іншых думак пра змену сферы дзейнасці ў мяне ніколі не было. Нават калі пайду на пенсію, хацеў бы быць бліжэй да транспарту, дапамагаць н

# ЕЎРАПЕЙСКІ МЕТРАПАЛІТЭН ДЛЯ ЕЎРАПЕЙСКАГА ГОРАДА

**Карэспандэнт «Звязды» гутарыць з дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскметрапраект» Валерыем ЧЭКАНАВЫМ.**

***«МІНСКМЕТРАПРАЕКТ» створаны ў 1977 годзе як Мінскі філіял Усесаюзнага праектна-вышуковага інстытута «Метрагіпратранс». У 1991-м пераўтворaны ў арэнднае прадпрыемства, у 2000-м — у адкрытае акцыянернае таварыства.***

***У складзе інстытута сем праектных аддзелаў:***

***- праектавання трасы і эксплуатацыі;***

***- распрацоўкі праектаў арганізацыі будаўніцтва;***

***- праектавання будаўнічых канструкцый і архітэктуры;***

***- праектавання электратэхнічных і слабаточных устройстваў;***

***- праектавання цепласантэхнічных устройстваў;***

***- праектавання тунэляў і транспартных збудаванняў;***

***- распрацоўкі каштарыснай дакументацыі.***

***У калектыве працуе 180 вопытных спецыялістаў.***

***Распрацоўвае праектна-каштарысную дакументацыю на будаўніцтва метрапалітэна ў Мінску, а таксама падземных пешаходных пераходаў у буйных гарадах рэспублікі, на ўстройства фундаментаў і мацаванне катлаванаў грамадскіх і камунікацыйных цэнтраў і збудаванняў.***

***На прадпрыемстве дзейнічае сертыфікаваная сістэма кіравання якасцю праектавання ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі MC ISO серыі 9000.***

**— Валерый Уладзіміравіч, дата сур'ёзная, таму маем поўнае права азірнуцца на пройдзены калектывам няпросты шлях, вызначыць найбольш важныя вехі на гэтым шляху...**

— Пасля таго, як Мінск стаў горадам-«мільённікам», вырашыць транспартную праблему мегаполіса можна было толькі з дапамогай метрапалітэна. Праект будаўніцтва яго першай чаргі зацвердзіў яшчэ Савет Міністраў СССР у 1976 годзе. А ў лютым 1977 года старшыня Савета Міністраў СССР падпісаў дакумент «Аб пачатку будаўніцтва метрапалітэна ў г. Мінску». Загад аб стварэнні ў Беларусі спецыялізаванай арганізацыі, якая б займалася праектаваннем нацыянальнага метрапалітэна, быў выдадзены ў маі 1977 года таксама саюзнай структурай — Міністэрствам транспартнага будаўніцтва СССР. У лістапене прызначылі начальніка мінскага філіяла — Юрыя Данілавіча Плотнікава, ён прыехаў у горад (з Ташкента, Кіева, Баку, Харкава) роўна 10 спецыялістаў-праекціроўшчыкаў, якія ўжо мелі вопыт праектавання метрапалітэна. Прыйшлі таксама моцныя спецыялісты з праектных інстытутаў Мінска. І ўжо праз год, ва ўсякім разе — да канца 1978 года, у калектыве налічвалася каля ста «штыкоў». З самага першага дня стварэння калектыву ўсе яны прыступілі да распрацоўкі рабочай дакументацыі для першага ўчастка. Час прыспешваў, бо ўжо 4 лістапада 1977 года быў запушчаны першы шчыт з катлавана станцыі «Парк Чалюскінцаў». А ў наступным, 1978 годзе, ужо будаваліся станцыі «Парк Чалюскінцаў», «Маскоўская» і «Інстытут культуры», крышку пазней прыступілі да будаўніцтва перагонаў. Каравей, на працягу двух гадоў работы пачаліся па ўсёй трасе. Праекціроўшчыкам клопатаў таксама было шмат, бо ўся дакументацыя на айчынны метрапалітэн, пачынаючы з першай лініі, распрацоўвалася з дакладным улікам няпростых інжынерна-геалагічных умоў менавіта «Мінскметрапраектам». За выключэннем хіба што аўтаматыкі руху цягнікоў — гэта спецыфічная работа, якая выконваецца адзін раз у тры—чатыры гады, і потым спецыялісты гэтага профілю «прастойваюць», няма вялікага сэнсу трымаць уласных. Тут нам спачатку дапамагалі кіеўскія калегі, пазней гэтую работу выконвалі ленінградцы ці спецыялісты «Белчыгунпраекта». Але, падкрэслю, асноўны цяжар ляжаў на плячах нашага калектыву. Мы распрацоўвалі таксама тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне, праекты і рабочую дакументацыю для ўсіх наступных участкаў і ліній. Як вядома, сёння ў Мінску дзейнічаюць дзве лініі метро агульнай працягласцю амаль 30 кіламетраў. З прадаўжэннем ад «Усходу» да станцыі «Уручча» атрымаецца 31,3 кіламетра і 25 станцый.

Так што калі азірацца на этапы, то першым і даволі напружаным з'явіўся этап станаўлення калектыву, а самай яркай падзеяй стала здача ў эксплуатацыю першага ўчастка ў 1984 годзе. Для маладой арганізацыі гэта быў першы такі сур'ёзны пуск, ён даў нашым спецыялістам вельмі многае з пункту гледжання набыцця вопыту. У той час нас вельмі падтрымаў галаўны інстытут — «Метрагіпратранс». У адказ на просьбы нашага кіраўніка Юрыя Данілавіча Плотнікава масквічы прысылалі групы сваіх вядучых спецыялістаў, якія разам з намі ўдзельнічалі ў перадпускавым перыядзе, перадавалі нам свае найбагацейшыя веды, навыкі. Дзякуючы чаму ўжо потым мы спраўляліся з гіганцкімі аб'ёмамі работ самі, з перадпускавымі перыядамі таксама.

Надзвычай сур'ёзным перыядам стаў час развалу Савецкага Саюза, услед за якім адбыўся рэзкі спад аб'ёмаў будаўніцтва наогул і Мінскага метрапалітэна ў прыватнасці. І ўсё ж дальнабачная палітыка гарадскіх уладаў не дазволіла «замарозіць» работы, у Мінску будаўніцтва метро ніколі не спынялася, як гэта здарылася ў Расіі ці ва Украіне. У гэтым сэнсе лёс многіх расійскіх і ўкраінскіх калег-праекціроўшчыкаў сумны, некаторыя роднасныя калектывы адчувальна скараціліся свае штаты ці наогул былі ліквідаваны.

У нас тэмпы таксама ўпалі прыкладна ў два разы — у параўнанні з ранейшымі, і мы мусілі асвойваць новыя для сябе накірункі работы. У прыватнасці, пачынаючы з 94-га пачалі ўдзельнічаць у праектаванні аўтадарожных тунэляў у Расіі. Па нашых праектах пабудаваны некалькі аўтадарожных тунэляў на Каўказе і зараз таксама будуецца аўтадарожны тунэль даўжынёй 2,6 кіламетра на другой чарзе абходу горада Сочы.

У перыяд з 2000 па 2005 год распрацоўвалі абгрунтаванне інвестыцый ужо для трэцяй чаргі абходу горада Сочы, а таксама абходаў пасёлка Лазараўскае і горада Туапсе — як генпраекціроўшчыкі. Сумесна з калегамі з Растова ўдзельнічалі ў распрацоўцы абгрунтавання інвестыцый дарогі Абінск — Кабардзінка на дарозе Краснадар — Новарасійск. Акрамя таго, распрацавалі некалькі праектаў рамонту і рэканструкцыі дзеючых аўтадарожных тунэляў на Каўказе — у Кабардзіна-Балкарыі, Паўночнай Асеціі. Гэтая работа стала другой нашай прафесіяй і займае значную ўдзельную вагу ў агульным аб'ёме.

Але калі ў Расіі пачало аднаўляцца будаўніцтва метрапалітэнаў, мы ахвотна прадоўжылі там сваё супрацоўніцтва па асноўным профілі. Праўда, галоўным сваім клопатам лічым беларускую «падземку». За ўвесь час на Мінскім метрапалітэне адбылося дзесяць пускаў, уключаючы абодва электрадэпо і дадатковыя аб'екты метрапалітэна.

У Беларусі акрамя таго праектавалі пешаходныя пераходы, адзін ужо пабудаваны — у Гомелі, пад чыгуначнымі пуцямі. На станцыі Брэст Пасажырскі — будуецца.

Работу «на старане» прапаноўваюць і сёння. Напрыклад, просяць разлічыць умацоўванне глыбокага катлавана для паркінга пад жылым домам, альбо для дома, які «садзяць» на адкосе. Ніхто больш гэтага не робіць, і адмовіць складана. Тым больш, калі запрашаюць на ганаровыя для кожнага праекціроўшчыка аб'екты.

**— Некалькі такіх ганаровых заказаў вам давялося выконваць за тыя два з паловай гады, што прайшлі пасля мінулай публікацыі.**

— Параўнальна нядаўна быў здадзены грамадска-гандлёвы цэнтр «Сталіца» на плошчы Незалежнасці, у якім мы распрацоўвалі два раздзелы: арганізацыю будаўніцтва і будаўнічыя канструкцыі. Сёння дапамагаем «Белдзяржпраекту» выконваць падземную частку на рэканструкцыі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі. У прыватнасці, глыбокія «калодзежы» для функцыянавання сцэнічнага абсталявання і іншыя падземныя збудаванні. На «Мінскарэне» запраектавалі два пешаходныя пераходы пад праспектам Пераможцаў, яны ўваходзяць у комплекс новабудоўлі, якой прыдаецца асаблівая ўвага. Там працуе «Метрабуд», да канца года пераходы будуць здадзены. На субпадрадзе ў «Інжпраекта» выканалі раздзел па арганізацыі будаўніцтва калектара «Цэнтр», узвядзенне якога пачнецца ў хуткім часе з дапамогай сучаснага механізаванага шчыта новага пакалення дыяметрам недзе ў 3 метры. Для яго мы распрацавалі тэхналогію праходкі і мацавання катлаванаў.

**— У саміх мінскіх метрабудаўцаў такога механізаванага шчыта пакуль няма?**

— У свой час мы праектавалі яго прымяненне на ўчастку прадаўжэння 1-й лініі да станцыі «Пятроўшчына», але на набыццё ў заказчыка не было сродкаў. Зараз там жа патрэбна прайсці ўчастак ад «Пятроўшчыны» да «Малінаўкі», мы прыступілі да распрацоўкі архітэктурнага праекта гэтага прадаўжэння ў 1,8 кіламетра. Пабудаваць трэба да 2011 года (як і папярэдні ўчастак прадаўжэння першай лініі — ад станцыі «Інстытут культуры» да станцыі «Пятроўшчына»). Тэрміны каласальна сціснутыя, і без такога высокапрадукцыйнага механізаванага шчыта там не абысціся. Заказчык — гарвыканкам — нас у гэтым падтрымлівае і чакае, пакуль завершым праект, каб правесці тэндар і ўсё ж закупіць такі шчыт. Затым ён будзе выкарыстаны для будаўніцтва першага ўчастка трэцяй лініі. Калі Прэзідэнту краіны нядаўна дакладвалі аб планах будаўніцтва Мінск-Сіці, то прагучала, што туды да 2017 года павінен прыйсці і першы ўчастак трэцяй лініі метро, адкрыецца станцыя метрапалітэна «Аэрадромная».

**— Якія яшчэ задачы стаяць перад калектывам?**

— У наступным годзе мы павінны распрацаваць абгрунтаванне інвестыцый для першага ўчастка трэцяй лініі — ад станцыі «Аэрадромная» да станцыі «Праспект пераможцаў», завяршыць распрацоўку архітэктурнага праекта прадаўжэння ад станцыі «Пятроўшчына» да станцыі «Малінаўка». Далей, у 2009 годзе, завершыць распрацоўку ўжо будаўнічага праекта працягу да «Пятроўшчыны» (архітэктурны праект распрацоўваўся раней). І выканаць шмат іншых важных работ.

**— За 30 гадоў калектыў дэманстраваў нязменны творчы падыход да справы, прымяніў нетрадыцыйныя аб'ёмна-планіровачныя рашэнні, украніў нямала тэхнічных і тэхналагічных навацый. Вам удаецца пастаянна вытрымліваць гэты высокі творчы «градус»? І чым зараз заклапочаны вашы наватары?**

— Калі ў якасці прыкладу ўзяць, скажам, аб'ёмна-планіровачныя рашэнні станцыйных комплексаў, то мы выпрацавалі свае падыходы і цвёрда іх прытрымліваемся: гэта максімальнае выкарыстанне падземнай прасторы і рацыянальная блакіроўка станцыйных збудаванняў адно з адным. Напрыклад, на станцыі «Кунцаўшчына» адзін вестыбюль зблакіраваны з венткамерай, другі — з цягапаніжальнай падстанцыяй. Што дазволіла скараціць даўжыню станцыйнага комплексу больш чым на 40 метраў і зэканоміць сур'ёзныя сродкі. А над платформай змаглі размясціць падвулічны пешаходны пераход і гандлёвыя аб'екты для абслугоўвання пасажыраў.

Блок службовых памяшканняў на станцыі «Спартыўная» размешчаны ў трох узроўнях. Падземная прастора выкарыстоўваецца максімальна, даўжыню станцыйнага комплексу ўдалося скараціць больш чым на 60 метраў супраць традыцыйных рашэнняў.

Прынцып блакіроўкі выкарыстаны і пры праектаванні станцыі «Каменная Горка» і іншых станцый сталічнай падземкі. Адначасова прапануюцца прагрэсіўныя тэхнічныя рашэнні па іх «начынцы» сучаснымі абсталяваннем і матэрыяламі. Скажам, у праектнай дакументацыі на будаўніцтва ўчастка другой лініі ад станцыі «Пушкінская» да «Каменнай Горкі» прадугледжана прымяненне аўтаномнай сістэмы ацяплення на базе прамысловых кандыцыянераў-утылізатараў, што дазволіла адмовіцца ад наружных цеплавых сетак і выкарыстаць для абагрэву службовых памяшканняў лішак цяпла, што выдзяляецца рухомым саставам, працуючым абсталяваннем і нават пасажырамі. Значную эканомію цеплавой энергіі забяспечыла прымяненне электрычных цеплавых завес на ўваходах у станцыі. Прагрэсіўныя тэхнічныя рашэнні дазволілі адмовіцца ад транзітных трубаправодаў з ацынкаваных труб з цеплаізаляцыяй, адчувальна зменшыць памеры водаадліўных установак і плошчу венткамер, адмовіцца ад вонкавых цеплатрас і гэтак далей. А сістэма каляровага тэленагляду, якая мае функцыі запісу, архівавання і перадачы сігналаў у дыспетчарскія пункты станцый і ў інжынерны корпус метрапалітэна, дазволіла ажыццяўляць відэаконтроль за пасажырапатокам у рэальным маштабе часу і павысіць бяспеку руху. І гэта далёка не поўны пералік.

Пытаецеся, чым сёння заняты наватары? Перад намі востра стаіць задача распрацаваць новую канструкцыю верхняга ўстройства чыгуначнага пуці. Яшчэ і зараз рэйкі ўкладваюцца на драўляныя шпалы, якія дастаткова хутка зношваюцца. А мяняць іх на дзеючым метрапалітэне — надзвычай працаёмкая задача. Выконваць работы даводзіцца ў кароткае «начное акно» — усяго чатыры гадзіны даюцца на тое, каб адбойным малатком вырубіць шпалу, пакласці новую, заліць бетонам. Адно звяно шпал мяняюць тры ночы. Трэцяя лінія таксама пойдзе праз цэнтр горада, пад кварталамі жылой забудовы, і патрэбна вырашаць праблему зніжэння вібрацыі і наогул шуму ад дзеючага метрапалітэна. Мы сапраўды прыдумалі новую канструкцыю ўстройства пуці, але патрэбна выпрабаваць яе на доследным участку і ўжо потым атрымаць дазвол на шырокае прымяненне. Між іншым, па выніках распрацоўкі пададзены дзве заяўкі на атрыманне патэнтаў на вынаходніцтва.

**— Яшчэ адно пытанне ў рэчышчы тэмы наватарства: вы планавалі паступова пераводзіць будаўніцтва метро са зборнага жалезабетону на маналітны...**

— У апошніх нашых распрацоўках доля маналітнага жалезабетону значна ўзрасла, у прыватнасці на ўчастку да Пятроўшчыны. Сёння метрабудаўнікі маюць сучасныя апалубачныя сістэмы, і мы з імі вызначыліся, якія канкрэтна канструкцыі ўжо зараз могуць быць з маналітнага жалезабетону — каб пры пераходзе будаўнікі не збавілі тэмп і паспелі з пускам да 2011 года. І важна таксама, каб не прастойваў завод жалезабетонных вырабаў. Таму частка канструкцый (напрыклад, вялікапралётныя перакрыцці, бэлькі перакрыцця) пакуль засталіся зборнымі. Сцены, латкі, унутраныя перакрыцці — маналіт. Тунэлі, якія ўзводзяцца адкрытым спосабам, — яны таксама ў маналіце. Так што пачатак пераходу пакладзены, і гэта стратэгічны, можна сказаць, курс.

**— Ад інтарэсаў будаўнікоў і эксплуатацыйнікаў звернемся да не менш блізкіх вам інтарэсаў спажыўца, радавога пасажыра. Пры мінулай нашай сустрэчы вы гаварылі, што плануецца рэканструкцыя эскалатараў на вузлавой станцыі «Кастрычніцкая»: замест трох павінны быць устаноўлены чатыры, і такім чынам разгрузіцца пасажырапаток у гадзіны пік.**

— Сёлета заказчык правёў тэндар на пастаўшчыка эскалатараў, конкурс выйграў адзін з украінскіх заводаў, зараз мы павінны падкарэктаваць дакументацыю пад гэтыя канкрэтна эскалатары, і ў наступным годзе, да восені, работы па замене трох стужак эскалатара на новыя чатыры павінны быць выкананы.

**— Падчас мінулай нашай гутаркі мы абмяркоўвалі з вамі і магчымасць устаноўкі агароджванняў на платформе, непасрэдна перад выхадам да цягнікоў. Прайшла інфармацыя, што над мэтазгоднасцю такой «перагародкі» задумаліся і ў гарвыканкаме.**

— Гэта пакуль застаецца на ўзроўні ідэі. У свеце такія канструкцыі, якія аддзяляюць пасадачную платформу ад пуцей, існуюць, у асноўным каб выключыць выпадкі суіцыду. Я асабіста бачыў такое агароджванне ў метро Капенгагена, яно зроблена з металу і праціўударнага шкла, ці, магчыма, з празрыстага пластыку. Цягнік спыняецца так, каб дзверы яго вагонаў дакладна супалі з дзвярыма агароджвання — і вось адкрываюцца адны, потым другія дзверы, людзі выходзяць і заходзяць. Можна зрабіць, вядома ж, і ў нас. Але спатрэбяцца вялікія працазатраты, каб дабіцца дакладнага спынення электрычкі, «дзверы ў дзверы». І, што галоўнае, каб рэканструяваць сістэму вентыляцыі: выканаць яе асобна для тунэля і асобна для станцыі. На гэта пакуль няма сродкаў у заказчыка і сілаў у будаўнікоў.

**— Горад усё больш трапляе пад уладу легкавога аўтатранспарту. Адчувальна выручыць сталіцу можа метро — у тым сэнсе, што на яго канцавых, «улётных» станцыях з'явяцца буйныя падземныя паркінгі, дзе жыхары прыгарада ці аддаленых сталічных раёнаў змогуць пакінуць сваіх «жалезных коней», каб перасесці на больш хуткі від транспарту (калі мець на ўвазе, што аўтамабілі трапляюць у бясконцыя «пробкі»). І адправяцца на работу ці па іншых сваіх справах на метро. А ўвечары зноў перасядуць на аўто. Наколькі ўсё гэта рэальна?**

— Праблема пастаўлена мэрам горада Міхаілам Паўлавым перад камітэтам па архітэктуры — каб яны, у прыватнасці, прадугледзелі выдзяленне зямельных участкаў пад паркінгі на «улётных» станцыях. Задачу спрабуюць вырашыць не за кошт гарадскога бюджэту, а шляхам прыцягнення інвестыцый. Калі, напрыклад, побач з лініяй метро будуецца супермаркет, то яго гаспадарам даручаецца прадугледзець і паркінг вялікай ёмістасці. Ім змогуць пакарыстацца не толькі наведвальнікі гэтага гандлёвага аб'екта, але і тыя, хто прыязджае ў сталіцу — каб не забівалі транспартам вуліцы. Так што сёння ў горадзе гэтая праблема вырашаецца. І мы таксама, калі праектавалі станцыю «Уручча», то максімальна, наколькі гэта было магчыма, прадугледзелі надземныя стаянкі. У выніку добрую сотню машын ужо можна прыпаркаваць на будуецца першае гарадское кальцо з транспартнымі развязкамі — каб убраць транспарт з асноўных магістраляў, з цэнтра. Варта мець на ўвазе, што ўсё — будаўніцтва аўтадарог, тунэляў, новых ліній метро цесна звязана адно з другім. Каб, развіваючыся, не перашкаджаць адно аднаму, а дапаўняць і разгружаць. Напрыклад, пры будаўніцтве першага ўчастка трэцяй лініі самым праблемным месцам будзе ўзвядзенне станцыі на перасячэнні вуліц Клары Цэткін і Нямігі. Гэтае перасячэнне перагружана транспартам і сёння. А калі мы там пачнём будаваць метро, то выезд з гарадскога Паўднёвага Захаду ў цэнтр будзе проста паралізаваны. Таму да пачатку нашага будаўніцтва павінен быць пабудаваны ўчастак першага гарадскога аўтамабільнага кальца — пачынаючы ад вуліцы Кальварыйскай да вуліцы Талстога, які і прыме ўвесь транспартны паток. Тады можна будзе пачынаць у гэтым месцы ўзвядзенне ўчастка метрапалітэна.

**— Па выніках 2006-га інстытут названы лепшым экспарцёрам года сярод родных калектываў міністэрства. Вы па-ранейшаму экспартуеце за мяжу свае веды, вопыт — тое, што называецца «мазгамі»?**

— У архітэктурным, мастацкім афармленні станцый мы прытрымліваемся стылю і падыходаў, якія былі выпрацаваны намі яшчэ на першай лініі. Ужо тады ў афармленні адсутнічалі пампезнасць і вычурнасць, прысутнічалі пэўная строгасць і лаканізм, нацыянальныя матывы і прыкметы высокай эстэтыкі. Калі паглядзець на апошнія пушчаныя станцыі — пачынаючы з «Аўтазаводскай», «Магілёўскай», а таксама на новыя станцыі, якія былі пушчаны ў 2005 годзе — «Спартыўная», «Кунцаўшчына», «Каменная горка» — у іх афармленні адчуваюцца тыя ж тэндэнцыі. Іншая справа, што зараз маем магчымасць весці творчы пошук на базе новых, сучасных будаўнічых матэрыялаў. Таму ў архітэктурным афармленні станцый выкарыстоўваюцца прыродныя матэрыялы (граніт, мармур) у спалучэнні са шклом, металам, металакерамікай.

І пры гэтым станцыі адрозніваюцца танальнасцю аддзелачных матэрыялаў, яны кожны раз ствараюць свой настрой — ці то восеньскі, з яе залатым лістападам, ці строгай халоднай зімы. Але стыль і падыход адзіныя, нюансы заключаюцца толькі ў некаторай мастацкай прывязцы да месца, дзе знаходзіцца станцыя. Побач са «Спартыўнай» размяшчаецца Лядовы палац, адсюль тэма зімы ў афармленні. Інтэр'ер станцыі вытрыманы ў халодным каларыце колераў: белы мармур калон, блакітная столь, сцены з нержавейкі — пераносіцца нават атмасфера палаца.

А вось ужо на станцыі «Кунцаўшчына» інтэр'еры выкананы ў сонечнай, вохрыста-залацістай гаме, яго элементы ствараюць атмасферу цёплага восеньскага дня.

Пры распрацоўцы інтэр'ера «Каменнай Горкі» выкарысталі камп'ютарныя тэхналогіі трохмернага мадэлявання, у выніку знайшлі патрэбныя прапорцыі і маштабасць аб'ёму станцыі, змаглі падабраць яркія дэталі афармлення, дасягнуць гармоніі колераў і святла.

У тым жа ключы выкананы і новыя станцыі, якія павінны быць пушчаны гэтымі днямі, у пачатку лістапада — «Барысаўскі тракт» і «Уручча».



**— У працяг тэмы якасці. Вы даўно ўвялі сістэму кіравання якасцю праектавання на аснове міжнародных стандартаў ISO 9000. У вас ёсць неабходнасць у яе ўдасканаленні? І ці ўдаецца ўдасканальваць?**

— Яе мэта — сістэматызаваць работу праекціроўшчыкаў і выключыць памылкі. А калі ўсё ж памылка здарылася, то каб больш не паўтарылася, у тым ліку іншымі спецыялістамі. Сама сістэма прымушае нас працаваць у «зададзеным накірунку», над яе ўдасканаленнем. Бо кожныя пяць гадоў мяняюцца стандарты па сістэме менеджменту якасці, некалькі мяняецца падыход, нават да сістэмы, узнікаюць новыя яе версіі. Пад гэтыя новыя патрабаванні перастройваем уласную сістэму і мы. Многія новыя змяненні скіраваны на спрашчэнне, у тым ліку на змяншэнне дакументабароту.

Створана служба сістэмы якасці, якая гэтым і займаецца. У тым ліку давядзенне патрабаванняў сістэмы да супрацоўнікаў, навучаннем іх рабоце з дакументамі. І, што не менш важна, кантролем за выкананнем.

**— Пытанне да вас як да члена Тунэльнай Асацыяцыі Расіі (на сцяне вашага кабінета вісіць дыплом члена асацыяцыі): а што з беларускімі тунэлямі?**

— Пакуль намечана збудаванне ў сталіцы двух тунэляў, вызначаны і месцы для іх, але пакуль не хапае бюджэтных сродкаў. Калі праблема з транспартнымі развязкамі стане вострa, тады, зразумела, грошы знойдуцца. А пакуль у горада шмат іншых неадкладных патрэб. У Мінску прынята праграма «Дарогі», сёння актыўна ідзе работа па замене трох стужак эскалатара на новыя чатыры павінны быць выкананы.

— Мы прадаўжаем праектаваць комплексы будынкаў электрадэпо для метрапалітэнаў. Лічыцца, што гэта наша спецыялізацыя сярод аднатыпных праектных арганізацый краін СНД, і ў асноўным звяртаюцца да нас. У Маскве і Казані такія дэпо пабудаваны па нашых чарцяжах раней. Сёння праектуем электрадэпо для Омска, будаўніцтва яго пачалося, а пуск намечаны на 2009 год. На 2009 год плануецца і пуск метрапалітэна ў Алматы, мы завяршаем распрацоўку рабочай дакументацыі электрадэпо. На чарзе Краснаярскі і Чалябінскі метрапалітэны. І новыя аўтадарожныя тунэлі — сёння ў сувязі з тым, што горад Сочы стаў сталіцай Алімпіяды 2014 года, там разгортваецца грандыёзнае будаўніцтва алімпійскіх аб'ектаў і пад'язных шляхоў да іх, у тым ліку з тунэлямі. Праекціроўшчыкаў тунэляў у Расіі не хапае, і мы, хутчэй за ўсё, разам з расійскімі калегамі будзем удзельнічаць у гэтай рабоце.

**У заключэнне гутаркі Валерый Уладзіміравіч Чэканаў сказаў:**

— Калектыў пастаянна шліфуе свае прафесійныя навыкі, умацоўвае тэхнічную аснашчанасць. Напрыклад, нядаўна маніторы камп'ютараў памянялі на вадкакрышталічныя, у выніку палепшыліся ўмовы працы для праекціроўшчыкаў, у тым ліку зменшылася нагрузка на вочы. А людзям даводзіцца працаваць многа і напружана, бо работа, якая выконваецца, стаіць у плане, вызначаны канкрэтныя тэрміны. Так што гэта важны фактар.

Але найбольшыя станоўчыя змены адбыліся нават не ў тэхнічнай аснашчанасці, а ў самім калектыве. Зараз у інстытуце працуе ўжо 180 чалавек, прыйшла моладзь з яе аптымізмам і энтузіязмам. Сёлета таксама прынялі на работу 15 маладых спецыялістаў, у асноўным выпускнікоў БНТУ і ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Мы маем магчымасць выбіраць, таму большасць — з чырвоным дыпломам. З іншых праектных інстытутаў не пераманьваем, лічым за лепшае вырошчваць уласныя кадры, бо ёсць каму быць дарадцамі. Замацоўваем моладзь за вопытнымі настаўнікамі і сочым, каб яна хутчэй уключалася ў работу і каб была аддача. Плануем прыняць на працу яшчэ 30—40 перспектыўных спецыялістаў. У спалучэнні маладога задору і высокага прафесіяналізму сталых кадраў бачым перадумову далейшай паспяховай работы, — падкрэсліў Валерый Чэканаў.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Вераніка АРЛОЎСКАЯ. Здымкі прадастаўлены ААТ «Мінскметрапраект».**

***Ад рэдакцыі.** Шчыра дзякуем за дапамогу ў падборы ілюстрацый начальніку АСУП Мікалаю Васільевічу МЯЦЕЛЬСКАМУ і яго калегам.*

## ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

Валерый Уладзіміравіч Чэканаў закончыў Новасібірскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту па спецыяльнасці «інжынер-будаўнік мастоў, тунэляў і метрапалітэнаў». У Беларусь прыехаў у кастрычніку 1977 года, маючы за плячыма вопыт праектавання «падземкі» ў Ташкенце. Працаваў начальнікам групы канструктарскага аддзела, галоўным інжынерам праекта (ГІПам). Ужо праз два гады быў прызначаны галоўным інжынерам праектнага інстытута. У 1984-м стаў яго дырэктарам і такім чынам узначальвае калектыў больш за 20 гадоў.

З'яўляецца заслужаным будаўніком Рэспублікі Беларусь і ганаровым будаўніком Расійскай Федэрацыі. Па выніках работы за мінулы год прызнаны «Кіраўніком года» ў катэгорыі «Праектныя арганізацыі» і ўзнагароджаны ганаровым дыпломам Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі.





## НА ЗДЫМКАХ:

**1. На «Спартыўную» прыбывае састаў...**

**2. Па такіх «сонечных» тунэлях возяць нас электрацягнікі метро.**

**3. Архітэктары «Мінскметрапраекта»: гэта яны клапоцяцца, каб кожная станцыя сталічнай «падземкі» мела ўласны твар: выразлівы, самабытны, прыгожы.**

**4, 5, 6 — Станцыі айчыннага метро называюць палацамі, і гэта — чыстая праўда. Знізу ўверх: «Уручча» (Праект. Рыхтуецца да пуску), «Магілёўская» (дзеючая), «Барысаўскі тракт» (Праект. Рыхтуецца да пуску).**

**7. У многім дзякуючы дружнай сумеснай рабоце і ўзаемаразуменню ўсіх зацікаўленых бакоў Мінскі метрапалітэн паспяхова развіваецца. Гатоўнасць дзвюх новых станцый да пуску ацэньваюць (злева направа) дырэктар ААТ «Мінскметрапраект» Валерый ЧЭКАНАЎ, начальнік дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Васіль ЖЫБУЛЬ (дарэчы, як кіраўнік вырас у калектыве «Мінскметрапраекта»), начальнік УП «Мінскметрабуд» Аляксей СЯРОГІН і кіраўнік КУП «Мінскі метрапалітэн» Мікалай АНДРЭЕЎ.**

**8. Галоўным інжынерам праекта гасцініцы для сталіцы будучых Алімпійскіх гульняў — горада Сочы з'яўляўся галоўны інжынер ААТ «Мінскметрапраект» Віктар ПАЛІШЧУК.**

**9. Прадстаўнікі калектыву «Мінскметрапраекта» ўдзельнічалі ў пропуску пробнага цягніка да станцыі «Уручча».**

# «НОВАЯ ЗЯМЛЯ» ДЗЯДЗЬКІ АНТОСЯ

**Малавядомыя старонкі з жыцця Якуба Коласа**

Не ўсе ведаюць, што Язэп і Антон Лёсікі — родныя браты маці Якуба Коласа Ганны Юр'еўны. І родныя дзядзькі Якуба Коласа.

Асаблівыя адносіны склаліся ў паэта з дзядзькам Антосем.

Антон Юр'евіч Лёсік (1872-1950), настаўнік, моваznавец. Нарадзіўся ў Мікалаеўшчыне Стаўбцоўскай воласці Мінскай губерні ў сям'і беззямельных сялян Юркі і Хрысціны Лёсікаў, якія арандавалі зямлю ў князёў Радзівілаў. Бацькі мелі 7 сыноў і 3 дачкі.

З успамінаў Міхася Міцкевіча, брата Якуба Коласа:

*«Пачатковае навучанне Костуся адбывалася сярод сям'і, у таго дарэктара, якога Колас не абмінуў у сваёй паэме «Новая зямля», альбо неяк саматугам, з дапамогай дзядзькі Антося, які, відаць, з добрым поспехам прайшоў пачатковую школу. Быў старэйшы Коласа на 10 гадоў. У дзядзькі змалку выраблілася практычныя погляды на жыццё.*

Якуб Колас успамінае пра свайго дзядзьку: « У 15 гадоў паступіў я ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Падрыхтаваў мяне Антон Лёсік» (аўтабіяграфія 1926 г.).

Антон Лёсік настаўнічаў у Ноўгарад-Северску на Чарнігаўшчыне. У гэты час ён заканчвае Пецербургскі ўніверсітэт. Яго жонкай стала былая артыстка Імператарскага тэатра Алена Яфімаўна Уралава. Яе муж і два сыны загінулі на франтах грамадзянскай вайны. А для дзвюх дачок, Ларысы і Веры, Антон Юр'евіч стаў бацькам.

З 1923 года Антон Лёсік быў навуковым супрацоўнікам Інбелкульта, разам з братам Язэпам вывучаў пытанні беларускага правапісу, выкладаў беларускую мову ў Мінскім педагагічным тэхнікуме. У 1926 годзе ў сааўтарстве з братам быў напісаны артыкул «Да рэформы беларускага правапісу». Захавалася стэнаграма пасяджэння правапіснай камісіі 1927 г. у выданні «Працы Акадэмічнае канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі», дзе Антон Лёсік неаднаразова выступае і ўносіць слушныя прапановы.

У 1927 г. у другім выданні «Сынтаксісу беларускай мовы» Язэп Лёсік заўважае: «Папраўкі ў тэксьце зроблены з заўваг брата майго і настаўніка Антона — старога практыка педагога, за што вялікае яму дзякуй».

**Антон Юр'евіч ЛЁСІК (1929 г.) — выкладчык Мінскага тэхнікума імя Ўс. Ігнатоўскага.**

Аднойчы Язэп сказаў Антону: «Калі я праходжу па вуліцах Мінска і чую беларускую мову, то слухаю яе, як музыку».

...У 1933 годзе, з-за рэпрэсіяй супраць брата Язэпа, Антон быў звольнены з тэхнікума з забаронай займацца выкладчыцкай дзейнасцю. Да вайны ён заставаўся ў Мінску і зарабляў прыватнымі ўрокамі.

Падчас нямецкай акупацыі (з лістапада 1942 года) Антон працуе ў выдавецтве школьных падручнікаў і літаратуры для моладзі. У 1943 г. Антон Лёсік апрацаваў і выдаў кнігу «Беларускі правапіс».

22.VIII.1944 г., пасля вызвалення Беларусі, Ігнат Юр'евіч Міцкевіч, сваяк Якуба Коласа, дырэктар Мікалаеўшчынскай школы, у адказ на ліст Коласа пісаў: «Рады былі атрымаць ад цябе вестку. Бясконца рады будзем сустрэцца з Вамі. Браты і сёстры твае жывы. Ад Міхася меў ліст напярэдадні баёў пад Свержанам. Дзе зараз Міхась, не ведаем. Няма чутак аб дзядзьку Антосю, які ўвесь час заставаўся ў Мінску»....

І толькі праз год Колас піша Ігнату Юр'евічу: «... Нядаўна да мяне заходзіў Антось Лёсік. Прыехаў з Чэхаславакіі. Мытарыўся ў лагерах. Худы, змучаны, ледзве трымаецца на нагах. Што з ім зараз, не ведаю. Болей не паказваецца, даў трохі грошай яму. Бяда мне з імі».

А праз месяц наступны ліст:

11.IX. 1945. «Сягоння адвожу ў Смольню дзядзьку Антося. Ён, дзівак і наіўны чалавек, думаў знайсці ў Мінску службу сабе. Звычайна такіх людзей пасылаюць шмат далей. Яго ж, відаць, пакінулі ў Мінску толькі таму, што ён мог спаслацца на мяне. Я прасіў тут, каб пазванілі ў раён і каб там не чынілі перашкод для ўсялення ў хату Міхася. Ты мімаходам пагавары са сваякамі, каб яны аказалі сякую-такую дапамогу Антосю. Ён стары чалавек, і працаваць яму трудна. А жыць трэба.»...

Дзякуючы заступніцтву Якуба Коласа, Лёсік атрымаў дазвол жыць у роднай Мікалаеўшчыне. Там Антон займаўся прыватнымі ўрокамі. Прыгнятала старога чалавека і тое, што сістэматычна прыходзілася з'яўляцца ў НКУС ў Стоўбцы. І заўсёды ўпікалі, што ён родны брат Язэпа Лёсіка, і што пры немцах жыў і працаваў у Мінску.

Колас дапамог, каб яго пакінулі ў спакоі з выклікамі ў Стоўбцы, але выкладаць у школе яму было забаронена.

А зараз звернемся да дакументаў — пісем, якія захоўваліся ў коласаўскім архіве.

З лістоў Ігната Юр'евіча Міцкевіча да Якуба Коласа.

25.II.1946. «Антось пад дбайным доглядам Алены Яфімаўны крыху ліпіць. Працуе над методыкай рашэння задач у пачатковай школе. Яны не маюць жылля, харчоў. Хто як можа дапамагае.».. .

Люты 1947 года. «Пра Антося я пісаў ужо табе, у якім стане ён знаходзіцца. Цяжка глядзець на тое, якую нястачу церпіць ён. З дасланых табою грошай ім адразу трэба было аддаць запазычанасць каля 300 рублёў, а зараз яны ізноў без сродкаў. Тым часам сам Антось, як той філосаф, спакойна і цярпліва пераносіць нястачы, цікавіцца ўсім, што адбываецца ў свеце, што пішуць у газетах і новых кнігах, як ідуць справы ў нашай школе. Не выяўляе смутку і тое, што Церабяжы не за гарамі. Рад пагаварыць і нават пасмяяцца, напрыклад, з прыгаворкай, якая калісь была ў граматыцы Язэпа: «Цешыўся старац, што перажыў мараць, а прыйшоў май — панеслі старца ў гай».

03.XII.1948. «Антосю нямнога засталося жыць на гэтым свеце і жыве літаральна ўпрогаладзь. Не пакідай яго, Костусь. Цябе мікалаеўцы лічаць Крэзам... а дзядзьку Антося жаль — не за грахі свае пакутуе.»..

**З лістоў Антося Лёсіка Якубу Коласу.**

23.08.1946.

«Дарагі Костусь!

Шлём табе найвялікшае прывітанне і найвялікшую падзяку за тваё шчодрае падтрыманне нашай старасці. Гэтую невыразімую словамі падзяку табе і Марыі Дзмітраўне мы заўсёды насілі ў сваім сэрцы. Як і ў тыя часы, калі мы сустракаліся з табою, так і цяпер, калі разлучаны некаторай адлегласцю.... Пры такім тваім здароўі цяжка быць народным паэтам і служыць Той справе, на якую ты стаў з самага юнацтва. Ужо з таго часу, як пісаў свае «Песні жальбы», ты злучыў свой лёс з лёсам таго народу, з якога ты выйшаў. «Сонца» тваё «не заходзіць, яно не павінна заходзіць. Яно свеціць ярка, будзе свяціць Беларусі і беларускаму народу».

«З усіх, каму ты памагаеш, мы займаем выключнае палажэнне, усе маюць хоць невялікія рэсурсы да жыцця, а у нас няма ніякіх рэсурсаў і, нагол, нічога няма — ўсё згарэла, а за гэты час зусім абнасіліся. У такіх умовах жыццё вельмі цяжкае».

27.XI.1948. «Зразумела, што ў сваім жыцці няма каго вінаваціць, апроч сябе. Часта жыццё складваецца не так, як хочаш. Пэўна, я мог жыць не так, як цяпер. Але ўжо аб гэтым позна думаць. Вельмі прашу прабачэння за твае турботы аба мне. Шчырае дзякуй табе, Дарагі Костусь, за ўсё дараванае мне. Цяпер я не буду мерзнуць ні ў хаце, не на дварэ.

Я сышоў са сцэны жыцця ўжо ў 1933 г., калі перастаў працаваць у школах, а цяпер ужо памаленьку сабіраюся ў Церабяжы, бо ўсё хварэю, але мне яшчэ вельмі хочацца сустрэцца з табою і развітацца, як блізкія родныя».

06.VIII. 1949. «Алена Яфімаўна хоча ўстанавіць сваю пенсію, якую яна атрымоўвала да вайны ў Мінску (150 р.) за мужа і 2-х сыноў, якія загінулі за савецкую ўладу ў грамадзянскую вайну. У Мінску паведамілі, што справа аб пенсіі не захавалася і ўстанавіць яе можна толькі сведчымі паказаннямі».

Антон Лёсік просіць дапамогі ў Якуба Коласа. Аднак у гэтай справе і народны паэт аказаўся бяссільным.

Антось быў кінуты ў вельмі складаныя, жабрацкія ўмовы. Змучаны жыццём, апальны. Пастаянна дапамагаў яму Якуб Колас.

Ён да самай смерці пісаў, складаў методыку выкладання матэматыкі ў тэхнікумах.

**Захавалася пісьмо Антона Лёсіка да Данііла Канстанцінавіча, сына Коласа.**

«Дарагі Данік!

Калі ласка, схадзіце ў Міністэрства Народнай Асветы ў метадычны аддзел і вазьміце ў метадысткі Сіўко рукапіс Антона Юркаўца «Методыка рашэння арыфметычных задач». Гэты рукапіс перадаў Ігнась Юр'евіч як аўтар, але сапраўдны аўтар — я пад псеўданімам «А. Юркавец».

**З успамінаў Якуба Коласа**

12.II.1946. «Як дзядзька Антось? Памагай, братка, яму, чым і як можаш. Мы ж у такім ужо веку, што павінны паглядаць на Церабяжы. Няхай нашы апошнія сцежкі будуць хоць трохі роўныя, каб мы пашкадавалі аб гэтым свеце, бо другога няма».

Люты 1950 г. Апошні ліст Антося.

«Дарагі Костусь!

Пішу табе прадсмертнае пісьмо. Пішу карандашом у пасцелі. Бо ўстаць за стол не могу. Звяртаюся да цябе, дарагі Костусь, з вялікаю просьбай: не забывай Алены Яфімаўны. Уміраць мне вельмі цяжка з-за таго, што я астаўляю Алену Яфімаўну адну, хворую, працаваць яна не можа, пенсіі не выклапатала і застаецца адна без усякіх сродкаў для жыцця. Ёй нават няма дзе галаву прыкланіць. Дочкі яе памагаць не будуць. Ларыса з двума дзецьмі жыве ў страшнай галечы, а Вера не будзе дапамагаць па свайму характару. А я перад Аленай Яфімаўнай вельмі вінаваты: праз мяне яна страціла свой дом і сядзібу, але мяне захавала да глыбокай старасці. Каб не Алена Яфімаўна, то мае косці ўжо даўно згнілі б у зямлі. Вось чаму я звяртаюся да цябе, дарагі Костусь, не забывай Алену Яфімаўну.

Шчыра і вельмі дзякую табе, за ўсё, што ты зрабіў для нас. А я табе яшчэ ўдзячны за тое, што дзякуючы табе я знайшоў вечны пакой на Бацькаўшчыне.

Прашчай, дарагі, мілы, добры Костусь.

Прашчайце, Міхаська і Данік.

Жадаю вам усім усяго добрага ў жыцці, жывіце на карысць дарагой радзімы!

А мой жыццёвы шлях ужо закончыўся.

Апошні з сям'і Юркі — дзядзька Антось».

Дата смерці ўказана ў пісьме Алены Яфімаўны: 31 сакавіка 1950 г.

Колас не змог прыехаць на пахаванне. Захаваўся тэкст тэлеграмы:

*«Столбцы. Николаевщина. Ураловой.*

*Скорблю вместе с вами приехать не могу»*

Пасля пахавання сястра Юзя прыслала Коласу пісьмо:

«Дарагі братка! Дзядзьку Антося мы пахавалі надзвычай добра. Сабраліся ўсе сваякі. Збілі труну, абабілі яе палатном, а вучанікі навязалі вянкоў і ўсе праважалі дзядзьку на могілкі».

Родная зямля стала для Антося ўсім: калыскай, хлебам, песняй, любоўю і магілай».

**Антаніна ГАРОН,**
**галоўны захавальнік фондаў Літаратурнага музея Якуба Коласа.**

**Якуб Колас з землякамі.**

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.07 | 16.38 | 9.31 |
| Віцебск — | 7.00 | 16.24 | 9.24 |
| Магілёў — | 6.57 | 16.28 | 9.31 |
| Гомель — | 6.49 | 16.29 | 9.40 |
| Гродна — | 7.22 | 16.54 | 9.32 |
| Брэст — | 7.18 | 16.59 | 9.41 |

**Месяц**

***Апошняя квадра***

***31 кастрычніка.***

***Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Златы, Андрэя, Іосіфа, Лукі, Сяргея, Юльяна;*

***К.*** *Антаніны, Аўгуста, Вольфгана, Лукі, Сатурніна, Урбана.*

## Надвор'е на заўтра

Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## ...у суседзяў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +10 — +12 °С | МАСКВА | +4 — +6 °С, Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | +6 — +8 °С | РЫГА | +10 — +12 °С |
| КІЕЎ | +8 — +10 °С, Без ападкаў | С-ПЕЦЯРБУРГ | +8 — +10 °С |

## Дзве даты — 31 кастрычніка

**1917 год** — у Мінску адкрыўся з'езд воінаў-беларусаў Заходняга фронту. Удзельнічалі таксама прадстаўнікі Паўночнага і Румынскага франтоў, Балтыйскага флоту. З'езд выказаўся за аўтаномію Беларусі, за адкрыццё беларускага нацыянальнага ўніверсітэта, стварыў Часовы выканаўчы камітэт Цэнтральнай беларускай вайсковай рады, які ўзначаліў Сымон Рак-Міхайлоўскі.

**1517 год** — Марцін Лютэр у Вітэнбергу (Германія) абвясціў 95 тэзісаў супраць індульгенцый, якія адмаўлялі асноўныя дагматы каталіцызму. Пачатак Рэфармацыі ў Еўропе. Неабходна адзначыць, што ідэі Рэфармацыі былі прыняты значнай часткай тагачаснага беларуска грамадства і нават на працягу нейкага часу евангельская вера была пануючай у нашай краіне. Сярод знатных прадстаўнікоў ВКЛ, якія падтрымлівалі ідэі кальвінізму, былі, напрыклад, Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Астафій Валовіч. Прыхільнікамі Рэфармацыі былі Сапегі, Вішнявецкія, Валовічы, Глябовічы, Агінскія, Нарушэвічы і іншыя прадстаўнікі славутых беларускіх радоў залатога веку.



Цытата дня

*«Талентам суразмоўцы вызначаецца не той, хто ахвотна гаворыць сам, а той, з кім ахвотна размаўляюць іншыя».*

**Жан дэ Лабруер (1645—1696), французскі пісьменнік і публіцыст.**

## Усміхнёмся!

**«Таврия» — сур'ёзны аўтамабіль. Калі іх такіх збярэцца ў чараду штук пяць, яны лёгка могуць адгрызці брызгавік у КамАЗа.**

☺

Вяртаецца позна ноччу дзядуля дадому, а ад яго пахне тытунём, гарэлкай і бабулямі.

☺

**— Як сумна! Кожную ноч прачынаюся, пад бокам ляжыць жонка і ніякай табе рамантыкі...**

**— А ты пагуляй з ёй у сэксуальныя гульні.**

**— У якія?**

**— Ну, напрыклад, у згвалтаванне.**

**— Ха! Ды яна са мной не справіцца!**

# ЯЙКА СУПРАЦЬ ЯЙКА: ГУЛЬНЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА?

**Погляд**

**Здавалася б, «яйкавая» эпапея, аб якой мы пісалі раней, завершана. У выніку разбору Вярхоўны Суд прыйшоў да высновы, што МТС у сваёй дзейнасці выкарыстоўвае самастойныя абазначэнні, не залежныя ад твораў «Яйкаквадраты» паэта Алеся Разанава і мастака Віктара Маркаўца, гэта было выкладзена ў матывіровачнай частцы судовага рашэння. Лагатып мабільнага аператара, зразумела, працягвае тыражыравацца, Алесь Разанаў адбыў за мяжу, у Віктара Маркаўца адкрыецца чарговая персанальная выстава... Нібыта ўсё спакойна ў каралеўстве дацкім, пануе гэткае зацішша... Ці не перад бурай яно? Быць буры ці не быць, пакажа час, а мы з вамі пакуль паслухаем саміх «дзеючых асобаў».**

## «Бізнэс і мастацтва не павінны супрацьстаяць»

Да чаго апелявалі прадстаўнікі МТС пры абароне сваіх інтарэсаў у судзе? Ці варта казаць пра шкоду дзелавой рэпутацыі мабільнага аператара? Уздыхнулі ў МТС з палёгкай ці чакаюць, чым гэта яшчэ адгукнецца, улічваючы, што Алесь Разанаў і Віктар Маркавец падалі пярэчанне супраць рэгістрацыі таварнага знака, якім карыстаецца кампанія і правы на які належаць расійскаму ЗАТ «Сістэма тэлекамунікацый, інфарматыкі і сувязі». Высвятляем у **Дзмітрыя Ходаса — дырэктара Прадстаўніцтва ААТ «МТС» у Беларусі:**

— Таварны знак МТС — самастойны аб'ект прававой аховы, які не перасякаецца з аўтарскімі творамі спадароў Маркаўца і Разанава. Мы імкнуліся падкрэсліць той факт, што проста абсурдна прэтэндаваць на ўнікальнасць выяў, калі аналагічныя з'яўляліся раней. Далёка не ўсе прыклады спалучэння авалаў і квадратаў у мастацкай і прамысловай дзейнасці нам удалося прадставіць на судзе (акрамя выяў таварных знакаў кампаній «Huevo duro», «Ovofood», «Hartmann» і іншых у судзе аглядаліся дапаможнікі па тэорыі жывапісу і нават «Гульнявыя задачы для дашкольнікаў», а самым цікавым экзэмплярам аказалася кніга Дж.Э. Эслемонта «Баха-ула і новая эра», дзе чырвоны яйкавідны выраз на белым фоне вокладкі змяняецца белым яйкавідным выразам на чырвоным фоне на адваротным баку кнігі. — **Аўт.**). Мы маем звесткі і пра тое, што ў адной з мастацкіх галерэй Лондана выстаўлена праца Навума Габо з выявай белага яйка (не авала) на чырвоным фоне. Нягледзячы на неправамернасць абвінавачванняў ніякіх прэтэнзій да аўтараў «Яйкаквадратаў» мы прад'яўляць не будзем, наогул у нас няма ніякага жадання сварыцца з людзьмі мастацтва, нам не хацелася б гэтага супрацьстаяння (прынамсі, у судзе прадстаўнікі МТС афіцыйна папрасілі прабачэння ў тады яшчэ істцоў Алеся Разанава і Віктара Маркаўца за тое, што рэбрэндынг кампаніі мог нейкім чынам паўплываць на іх творчую дзейнасць. — **Аўт.**). Справе сапраўды надалі агалоску, і даволі шырокую. Мы на працягу ўсяго судовага разбору ўстрымліваліся ад каментарыяў, хоць нам і давалі магчымасць выступіць у прэсе (да рашэння суда ў інтэрв'ю адмаўлялі і карэспандэнту «Звязды». — **Аўт.**). Аднак сам факт іску і судовы разбор наўрад ці былі ўспрыняты негатыўна ў дачыненні да МТС. Аб міравым пагадненні размова наогул не ішла, улічваючы неправамернасць абвінавачванняў, тым не менш мы хацелі пазбегнуць суда хоць бы для таго, каб не ставіць мастакоў у нязручнае становішча і каб сітуацыя не была спрынята як «сціплыя дзеячы беларускага мастацтва змагаюцца з вялікім бізнэсам». Бізнэс і мастацтва не павінны супрацьстаяць і з'ядаць адно аднаго. Ужо толькі з-за гэтага мы былі гатовы спансіраваць нейкую прэзентацыю ці выставу для творцаў — не больш за тое. У мастакоў жа, на наш погляд, было жаданне не знайсці аб'ектыўную ісціну ў гэтай спрэчцы, а надаць пэўную агалоску справе. Пры ўсёй, так бы мовіць, беспадстаўнасці сітуацыі, мы ставімся да яе надзвычай сур'ёзна, сочым за развіццём падзей з аспрэчваннем таварнага знака ў Апеляцыйным савеце Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці і гатовы да ўсіх наступстваў.

## Ці быць рэваншу?

Пасля бойкі кулакамі не махаюць ... аднак усё ж хацелася б ведаць, ці разлічваюць Алесь Разанаў і Віктар Маркавец на рэванш? На што ўскладваюць спадзяванні? Наколькі стратнай была для іх справа? Як настроены творцы? Распытваем Віктара Маркаўца, члена Саюза мастакоў Беларусі:

— Судовы працэс толькі раскрыў масу праблем, пытанне да МТС не здымаецца. Рашэнне суда я ўсё яшчэ не атрымаў, хоць мы яго і заслухалі, таму ніякіх захадаў пакуль зрабіць не магу. Абскарджанне не выключана (нагадаем, што рашэнне Вярхоўнага Суда абскарджанню і апратэставанню ў касацыйным парадку не падлягае, зрабіць гэта можна толькі ў нагляднай інстанцыі. — **Аўт.**), але, натуральна, трэба параіцца з Алесем Разанавым і нашымі прадстаўнікамі. Што да выдаткаў, дык мы з Алесем Разанавым выплацілі дзяржаўную пошліну ў памеры 620 тысяч рублёў кожны, а астатняе... На прадпрыемстве гэта назвалі б камерцыйнай тайнай, я скажу так: мая асабістая справа. На што мы спадзяёмся пры аспрэчванні таварнага знаку ў Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці? Вядома ж, на закон. Я не вораг ніякім фірмам, аднак лічу, што кожная з іх павінна клапаціцца пра чысціню ўласнага брэнда. Нашы «Яйкаквадраты» — наватвор (такога спалучэння раней не было), які існаваў, існуе і будзе існаваць. Прынамсі, аўтара таварнага знака, якім карыстаецца МТС і які прызналі самастойным творам, так дагэтуль ніхто і не назваў. Паведамілі толькі, што распрацоўкай займалася брытанская фірма, але ж у самастойнага твора павінен быць канкрэтны аўтар... Наогул настрой у мяне творчы — 28 кастрычніка адкрылася мая персанальная выстава.

У аддзеле апеляцый інфармацыю аб пярэчанні супраць рэгістрацыі выяўленчага таварнага знака, падпісаным спадарамі Маркаўцом і Разанавым, пацвердзілі. Паведамілі таксама і тое, што тэрмін рашэння такіх спраў складае 6 месяцаў, а гэта значыць, што прынята яно будзе не пазней за 10 красавіка 2008 года. Пасяджэнне калегіі Апеляцыйнага савета прызначана на 16 студзеня: там павінны прысутнічаць заяўнікі і ўладальнік рэгістрацыі (нагадаем, што ўладальнікам таварнага знака з'яўляецца расійская кампанія).

## Пазіцыя суда

У кожнага бока свая праўда, аднак апошняе слова, вядома ж, за судом. Пазіцыя Вярхоўнага Суда адлюстравана ў адпаведным рашэнні: суд не знайшоў падстаў для здавальнення іску, паколькі «істцы не прадставілі суду доказаў таму, што абазначэнні ў выглядзе яйка ў квадраце, якімі карыстаецца адказчык, з'яўляюцца вынікам перароблі ці іншай перапрацоўкі твораў істцоў «Яйкаквадраты». У той жа час прадстаўнікі МТС прад'явілі доказы таго, што «аналагічныя па сваёй форме і зместу выявы (спалучэнне яйка — авала ў квадраце, прамавугольніку, у тым ліку і ў бела-чырвоным і чырвона-белым колеры) з нязначнымі змяненнямі і дапаўненнямі існавалі і раней, да стварэння істцамі твораў «Яйкаквадраты». Такім чынам, «СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» ў сваёй дзейнасці выкарыстоўвае самастойныя, не залежныя ад твораў істцоў, абазначэнні».

## Цікавыя факты і перапетыі

Істцы і іх прадстаўнікі на судзе не раз казалі пра амаль стопрацэнтнае супадзенне лагатыпа МТС і асобных яйкаквадратаў: форма, прапорцыі, каляровая гама і іншае. Пры гэтым яны так і не здолелі даказаць, што арыгіналы жывапісных твораў Алеся Разанава і Віктара Маркаўца дэманстраваліся ў вертыкальным стане да таго часу, калі адбыўся рэбрэндынг кампаніі. Ёсць і іншыя «непадабенствы». Лагатып мабільнага аператара — не проста яйка ў квадраце, а камбінаванае абазначэнне, якое складаецца з двух квадратаў: у адным размешчана яйка, а ў другім — абрэвіятура «МТС». У сувязі з гэтым таварны знак мае чатыры рэгістрацыйныя пасведчанні — асобна зарэгістраваны квадраты з яйкам і абрэвіятурай «МТС» у бела-чырвонай і чырвона-белай гаме. Тое, што на лагатыпе МТС адлюстравана менавіта яйка, відаць проста па форме, а вось тое, што менавіта яйкі, а не авалы, размешчаны на жывапісных палотнах Алеся Разанава і Віктара Маркаўца, становіцца зразумелым толькі з назвы серыі твораў («Яйкаквадраты») і дадатковых тлумачэнняў адносна канцэпцыі. Улічваючы прастату элементаў тых выяў, якія аспрэчваліся ў судзе, нельга не дапускаць думкі, што розныя іх варыяцыі сустракаліся і раней за 1992 год, якраз гэта прадстаўнікам адказчыка і ўдалося даказаць у судзе.

***

Адным з самых спрэчных пытанняў, якія закраналіся падчас судовага разбору, было «Ці патрэбна мастацтвазнаўчая экспертыза?». Так, сапраўды, параўнаць мастацкі твор і лагатып было б няблага, толькі вось якім чынам, паводле якіх крытэрыяў. Аб правядзенні мастацтвазнаўчай экспертызы хадайнічалі прадстаўнікі істцоў, аднак судом ім было адмоўлена ў гэтым на падставе таго, што пытанні, падрыхтаваныя для экспертаў, мелі прававы характар, а значыць мастацтвазнаўчых ведаў для іх высвятлення не патрабавалася.

***

Судовую справу суправаджалі дзіўныя перапетыі, напрыклад, іскавая заява двойчы ўдакладнялася. Даведаўшыся пра тое, што распрацоўкай лагатыпа займалася брытанская кампанія, прадстаўнікі істцоў хадайнічалі аб прыцягненні яе ў якасці суадказчыка, зняўшы прэтэнзію па перапрацоўцы «Яйкаквадратаў» з МТС і накіраваўшы яе ў адрас патэнцыйнага суадказчыка. Аднак судом было адмоўлена ў гэтым хадайніцтве, паколькі ў суадказчыкаў павінны быць аднолькавыя прававыя падставы, а прэтэнзіі да МТС і брытанскага прадпрыемства адрозніваліся. І вось цікавы паварот «сюжэту»: прадстаўнікі істцоў вярнуліся да першапачатковага варыянту іску, дзе зноў сцвярджалі, што менавіта МТС здзейсніў перапрацоўку жывапісных твораў. Прадстаўнікі істцоў нават патрабавалі адводу старшынствуючага суддзі, спаслаўшыся апроч іншага і на тое, што старшынствуючы выказаў сваё меркаванне адносна справы, аднак прыгадаць канкрэтныя выслоўі яны не змаглі. Абгрунтаванні былі прызнаны судом беспадстаўнымі, таму ў адводзе было адмоўлена.

***

Суд ужо вырашыў, чыя праўда ў гэтай справе, а пачуем мы яе рэха ці не, прагназаваць пакуль не будзем. Рэзюмаваць лепш, чым у судовым рашэнні, таксама наўрад ці атрымаецца, толькі звернем вашу ўвагу на тое, што ў рабочым кабінеце Дзмітрыя Ходаса, апроч іншых прадметаў мастацтва, ёсць і праца Віктара Маркаўца... Як бы там ні было, нягледзячы на тое, што ў іску Алесю Разанаву і Віктару Маркаўцу было адмоўлена, як і ў кампенсацыі іх фінансавых выдаткаў, пасля гэтага судовага разбору людзей, інфармаваных пра існаванне «Яйкаквадратаў», бяспрэчна, стала значна больш.

**Ала МАЧАЛАВА.**

**Шайбу, шайбу!**

## ФРЭЙЗЕР РАЗЛІЧВАЕ НА КАЛЮЖНАГА

Галоўны трэнер нацыянальнай хакейнай зборнай Курт Фрэйзер выклікаў у зборную 8 навічкоў. Гэта варатар Дзмітрый Мільчакоў («Віцебск»), абаронцы Дзмітрый Парахонька («Віцебск»), Ігар Шведаў («Хімік-СКА»), Яраслаў Масленікаў («Гомель»), Андрэй Антонаў («Керамін»), а таксама нападаючыя Ягор Філін («Юнацтва»), Раман Магдзееў («Хімвалакно») і Арцём Сянькевіч («Хімік-СКА»). Днямі дэбютанты і вопытныя ігракі адправяцца на этап «Еўравыкліку». З 9 па 11 лістапада яго прыме нарвежскі Хамар. Акрамя беларусаў, у ім возьмуць удзел гаспадары, палякі і літоўцы.

Пасля наведвання сустрэч экстралігі трэнер заўважыў, што беларускім ігракам не хапае жорсткасці. І адзначыў: «Беларускі хакей часам нагадвае паўночнаамерыканскі, на пляцоўцы дастаткова кантактнай гульні». Днямі Фрэйзер вярнуўся з Расіі, дзе назіраў за выступленнем нашых легіянераў у Суперлізе. Асабліва настаўніка ўразіла гульня галкіпера магнітагорскага «Металурга» Андрэя Мезіна. «У мінулым сезоне яго праследавалі траўмы, — нагадаў амерыканскі спецыяліст, — а зараз Мезін знаходзіцца на піку формы і не прапускае шайбу ў свае вароты на працягу пяці матчаў». Таксама Фрэйзер ацаніў майстэрства нападаючых Дзмітрыя Мялешкі («Спартак»), Канстанціна Кальцова («Салават Юлаеў») і Аляксея Калюжнага (Омскі «Авангард»), які каторы год не прыязджае ў зборную Беларусі, і выказаў спадзяванне, што на чэмпіянаце свету-2008 у Канадзе Калюжны зможа дапамагчы нашай камандзе. Трэнер разлічвае і на капітана зборнай Алега Антоненку з МУС, і на заакіянскі дэсант у складзе братоў Касціцыных, Міхаіла Грабоўскага і Руслана Салея.

— У параўнанні з першынством свету ў Расіі чэмпіянат у Канадзе будзе больш складаным, — перакананы Курт Фрэйзер. — Таму мы павінны сабраць аптымальны склад, каб быць канкурэнтаздольнымі і выступіць на высокім узроўні. Нам удалося б паказаць лепшы вынік і ў Маскве, калі б нашых асноўных ігракоў не падкасілі траўмы (пашкоджанні былі ў Цвяткова, Чупрыса, Мялешкі), а клубы адпусцілі Андрэя Касціцына і Грабоўскага. Спадзяюся, што ў гэтым сезоне траўмы абмінуць нашых хакеістаў, а каманды адпусцяць нашых ігракоў у зборную без турбот.

Ці пабачым у Квебеку ў складзе зборнай Калюжнага і іншых зборнікаў экстракласа, пакуль сказаць цяжка. Аптымізм усяляюць словы генеральнага менеджара зборных камандаў нашай краіны Святаслава Кісялёва, які паведаміў, што старшыня Федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў асабіста звяжацца з кіраўніцтвам «праблемных» клубаў, якія не хочуць адпускаць беларускіх легіянераў у зборную Беларусі.

**Ірына ПРЫМАК.**

**Восеньскія нататкі**

# «Я спазнілася сустрэць з табой світанне»

Выхадным вечарам, калі ідзе перадача па радыё «Помні імя сваё», заўсёды бываю на кухні і міжволі слухаю. Добрую справу, несумненна, робяць: дапамагаюць людзям знайсці адзін аднаго, сустрэцца сябрам, родзічам, аднакурснікам. Але заўсёды звяртаю ўвагу на адналькавыя, так бы мовіць, жаночыя гісторыі. Зачытваюцца пісьмы прыкладна такога кшталту: У далёкім 51-м, 53-м, 59-м годзе яна сустрэлася з хлопцам. Іскрынку прамільгнулага кахання ці то не распазналі, ці не змаглі захаваць. Былі кароткія сустрэчы, спатканні, потым жыццё па нейкіх прычынах разваліла маладых людзей у розныя бакі. Але ўсе гэтыя гады аўтарка пісьма захоўвала памяць пра тую сустрэчу ў нейкім патаемным куточку душы. А вось зараз муж памёр, дзеці выраслі, і яна хацела б сустрэцца з тым, хто служыў напамінам пра маладосць усё жыццё. Пры гэтым называюцца прозвішча, імя, імя па бацьку рэальнага чалавека з просьбай адгукнуцца.

Так і хочацца крыкнуць: «Мілыя спадарыні! А калі чуе ўсё гэта яго раўнівая і сварлівая жонка? Вы можаце ўявіць сабе наступствы такіх, няхай сабе і нявінных адкрыццяў?»

Цалкам зразумелае імкненне жанчын знайсці тое, да чаго можна прыхінуцца душой, асабліва калі спасцігае адзінота. Нават далёкі тэлефонны суразмоўца можа стаць астраўком у пустыні. Калі быць шчырымі, то якая з нас не носіць маленькіх таямніц у куточках сэрца? Але ж нездарма кажуць, што не ўвойдзеш у адну і тую ж рэчку двойчы.

Гадоў з дзесяць таму на мой рэдакцыйны стол трапіла пісьмо з Кіева. Вельмі кароткае і незвычайнае. Супрацоўніца навукова-даследчай установы, выпускніца філасофскага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта прасіла адшукаць чалавека, які, паводле яе звестак, працуе ў адной з брэсцкіх ВНУ, і сказаць яму, што дваццаць гадоў таму яна зрабіла памылку, яна не мела рацыі. Абзваніўшы аддзелы кадраў абодвух універсітэтаў, я даведалася, што названы чалавек у іх ніколі не працаваў. Можна было спакойна спісваць ліст у архіў, але нейкі адчай, крык душы, якія так і адчуваліся з пісьма, не давалі гэта зрабіць. Пісьмо ляжала ў папцы месяц, другі, а потым я нарэшце прыдумала, што зрабіць. З чарговай падборкай пісьмаў чытачоў напісала маленькі зварот да таго самага чалавека, каб ён прыйшоў і забраў ліст з Кіева, калі часам прачытае гэту газету. І недзе праз тыдзень у кабінет зайшоў мужчына і назваў сваё прозвішча. Аказалася, выпускнік прэстыжнай маскоўскай ВНУ расчараваўся ў сваёй прафесіі, як гэта часам здараецца з філосафамі, і прыехаў у Кобрынскі раён, на радзіму бацькоў, каб заняцца сельскай гаспадаркай. Жыў адзін. Я ўзрадавалася страшэнна. Проста прадчувала рамантычную гісторыю са шчаслівым фіналам....

А ён узяў ліст, прачытаў яго, і твар, а затым уся постаць ператварыліся ў здзіўленне: «Ну і ну! І адносіны ў нас жа былі чыста... тэарэтычныя», — адзінае, што ён сказаў і зачыніў за сабой дзверы. У мяне было адч

Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Завод керамзітавага гравію г. Новалукомль» Міхаіл ЛАЗАРАШВІЛІ:

# «БЕЛАРУСАМ СТАНЕ ДАСТУПНЫ СУЧАСНЫ, ЦЁПЛЫ, ЭКАЛАГІЧНА ЧЫСТЫ БУДАЎНІЧЫ МАТЭРЫЯЛ»



1

3

2

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы ўжо задумаліся над тым, што на прадпрыемстве неабходна рэалізоўваць інвестыцыйныя праекты, звязаныя з аховай навакольнага асяроддзя. Верагодна, што гэта стане нашай першачарговай мэтай. Плануем у 2009 годзе скончыць будаўніцтва газаачышчальных збудаванняў з выкарыстаннем электрамагнітных фільтраў. Гэта дазволіць у разы зменшыць выкіды пылу ў атмасферу. Хоць, вядома ж, гліняны пыл не столькі ўплывае на экалогію, колькі на эстэтыку. Як бы там ні было, гліна ўсё ж натуральны матэрыял. Як аказалася, гліняны пыл — яшчэ і даволі карысны прадукт, які можна нават няблага прадаваць. Пыл, які мы сёння збіраем у «цыклонах», выкарыстоўваецца ў якасці аднаго з кампанентаў кармавых дабавак для буйной рагатай жывёлы. У ім вельмі многа мікраэлементаў.

Кошт першай чаргі газаачышчальных збудаванняў даволі важкі — каля трох мільярдаў беларускіх рублёў. Хочацца спадзявацца, што пасля яе ўвядзення нам удасца справіцца з ачысткай адыходзячых газаў. У выпадку неабходнасці ўвядзення другой чаргі ачышчальных збудаванняў давядзецца ўкласці яшчэ звыш двух мільярдаў рублёў.

6

Натуральна, такі праект — малаакупны, як і любыя прыродаахоўныя мерапрыемствы. Але гэта неабходна рабіць і мы гэта рабіць будзем. А вось пасля рэалізацыі інвестыцыйнага праекта экалагічнай накіраванасці, мы ўжо пачнём думаць пра дадатковыя магутнасці вытворчасці. Гэта значыць, пасля 2009 года. Спадзяюся, што 800 тысяч кубаметраў керамзітавага гравію ў год — нашай магутнасці і магутнасці Лідскага СП — на гэты час хопіць.

**— Як паўплывае з'яўленне ў Беларусі прамысловых ліній па выпуску керамзітабетонных блокаў на работу вашага цэха па вытворчасці блокаў «ТэрмаКамфорт»?**

— Мы лічым нашу ўласную вытворчасць не столькі прамысловай, колькі доследна-прамысловай. На сваім прадпрыемстве ў першую чаргу працуем над новымі відамі керамзітабетонных вырабаў, якія маглі б мець абсалютна новыя ўласцівасці і характарыстыкі. У гэтым сэнсе мы павінны апераджаць буйных вытворцаў, ствараць новыя тэхналогіі, віды прадукцыі, якія ўжо потым можна будзе ўкараняць на аўтаматызаваных тэхналагічных лініях.

Вытворчасць нашмат больш гібкая, калі яна невялікая. У такім выпадку значна прасцей і танней памяняць аснашчанасць, рэцэптуру, канструкцыі і г. д. Так, у бліжэйшы час мы плануем на аснове керамзіту засвоіць выпуск блока вентыляцыйнага канала, аблiцовачнага блока. Лічу, што прыйшоў час задумацца і над стварэннем сценавога блока адразу з фасаднай паверхняй, чаго пакуль не робяць ні ў адной краіне свету. Такое рашэнне дазволіць адысці ад працаёмістых работ на фасадзе будынкаў і, думаю, вельмі зацікавіць будаўнікоў.

**— Распрацоўкай новых відаў прадукцыі на заводзе займаецца нейкае спецыялізаванае падраздзяленне?**

— Нейкага спецыяльнага аддзела новых распрацовак у нас няма. Гэтыя задачы ў першую чаргу ставіць аддзел маркетынгу, які збірае інфармацыю па выкарыстанню нашых матэрыялаў, вывучае патрэбы будаўнікоў, працаёмістасць тых ці іншых работ. На падставе гэтых звестак тэхнічныя службы прадпрыемства ствараюць часта абсалютна новыя віды прадукцыі, якая будзе запатрабавана на рынку. Дарэчы, гэтыя рэчы агавораны сістэмай менеджменту якасці ISO 9000, дзе дастаткова дакладна прасочваецца сувязь вытворцы са спажыўцом. Не на ўсіх прадпрыемствах яна працуе так, як павінна. Мы ж укаранялі менеджмент якасці не для таго, каб адпаведны сертыфікат павесіць на сцяну і заспакоіцца, а каб сістэма прыносіла адчувальную карысць. Ну не можа сёння вытворца працаваць у адрыве ад спажыўца. Дыктат апошняга павінен быць ва ўсім. Ідэі стварэння новых відаў прадукцыі мы чэрпаем менавіта ў нашых цяперашніх ці перспектыўных спажыўцоў.

4

Адна з такіх ідэй — стварэнне на аснове керамзіту матэрыялаў для добраўпарадкавання. Напрыклад, фасадная плітка. Керамзіт — настолькі пластычны, падатлівы матэрыял, што з яго паспяхова можна адліць штучны камень: пясчанік, скол скалы ці нават... дрэва, якое з адлегласці ў некалькі дзесяткаў сантыметраў нельга адрозніць ад натуральнага.

Паспрабавалі мы выраблять і тратуарную плітку. Здавалася б, навошта вынаходзіць веласіпед, калі зараз няма ніякага дэфіцыту ў звычайнай бетоннай плітцы, дарэчы, больш танней, якой выкладзены тратуары ў многіх беларускіх гарадах... Аднак прычына была. Мы прааналізавалі інфармацыю з Чэхіі, Славакіі пра тое, што там папулярнасць набывае двухслойная керамзітабетонная плітка з пескабетонным абарочным слоем. Чаму? Аказалася, што такая незвычайная плітка вельмі эфектыўна дазваляе пазбаўляцца ад галалёду. Цеплаізаляцыйных уласцівасцяў керамзітабетону дастаткова, каб тратуар не пакрываўся наледдзю. Натуральна, выкарыстоўваць яе паўсюдна — вельмі дорага. Але ж выкласці з яе ганак ці прыступкі цалкам апраўдана. Мы вырабілі эксперыментальную партыю такой пліткі і выклалі ёй усе дарожкі на тэрыторыі прадпрыемства... Ужо другі сезон не ведаем, што такое галалёд і пясчана-салевая сумесь!

2

9

Яшчэ адна перспектыўная з нашага пункту гледжання распрацоўка, якая можа знайсці шырокае выкарыстанне ў ландшафтным дызайне, — каляровы дрэнаж. Па сутнасці гэта каляровы керамзітавы гравій, які можа выкарыстоўвацца ў якасці дэкаратыўных засыпак клумбаў, газонаў... Ён значна танней шы за мармуровую ці граніт ную крошку, і нашмат больш даўгавечны. Падчас дажджу керамзітавая засыпка не пачне тануць, прасядаць і пакрывацца граззю, як гэта адбываецца з іншымі матэрыяламі. Мы вывучалі рынак -- інтарэс да такой прадукцыі ёсць практычна ва ўсіх. Пробныя ўзоры ўжо выраблены, выканана тэхнічнае апісанне на вытворчасць такога керамзітавага дрэнажу. Зараз любое прадпрыемства, любая фірма можа прыступіць да выпуску гэтай прадукцыі. Вось такім чынам мы стварылі яшчэ адну нішу для спажывання нашай прадукцыі.

10

Мы імкнёмся пастаянна аналізаваць якасці вырабаў і матэрыялаў на аснове керамзіту, шукаем станоўчыя бакі, адметныя асаблівасці і выкарыстоўваем іх.

**— У ідэале ўсім гэтым павінен займацца галіновы інстытут...**

— У прынцыпе, так. Але накірункаў у будаўніцтве, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў вялікае мноства. І адзін інстытут не можа ўсё адсачыць. Ды і хто лепш за вытворцу можа дэталёва і найбольш глыбока вывучыць уласцівасці матэрыялу? Учарашні студэнт ці аспірант? Мала верагодна. А некалі даволі сур'ёзная лабараторыя лёгкіх запаўняльнікаў у Навукова-даследчым інстытуце будаўнічых матэрыялаў па аб'ектыўных прычынах, на жаль, ліквідавана. Такім чынам, навуковай базы для вытворчасці лёгкіх запаўняльнікаў у краіне ўжо не засталося. У Расіі нашым накірункам займаецца НДІ «Керамзіт».

**— Вы адсочваеце нейкія іх новыя напрацоўкі?**

— Ведаеце, мы практычна заўсёды былі вымушаны на крок апераджаць нашых расійскіх калег. Чаму? Практычна заўсёды кошт энерганосьбітаў для нашага прадпрыемства быў вышэйшым, чым для падобных расійскіх прадпрыемстваў. Ілюзій на гэты конт не было — мы рыхтаваліся да горшага. І таму ў плане тэхналогій, эканоміі энергарэсурсаў, расійскіх вытворцаў керамзіту наша прадпрыемства апераджае на 5—7 гадоў. Як вынік — мы выклікаем большую цікавасць у таго ж НДІ «Керамзіт», чым ён у нас. Тым не менш, мы супрацоўнічаем з усходнімі суседзямі. Уваходзім у той жа Саюз вытворцаў керамзіту, па меры магчымасці аказваем ім некаторую дапамогу... Але ж нельга тое, што зроблена тут, бяздумна перанесці на іншыя заводы. Нельга скапіраваць тэхналогію, бо не бывае аднолькавай гліны нават у межах аднаго радовішча. Нават найсучаснейшае тэхналагічнае абсталяванне без вопыту, напрацовак, жадання ўдасканальвацца — нішто. Наша прадпрыемства, напрыклад, дасягнула еўрапейскага ўзроўню энергаёмістасці прадукцыі і еўрапейскай жа якасці на стандартным савецкім абсталяванні... Так, мы многае мадэрнізавалі, давялі да ладу. За кошт выкарыстання другасных крыніц энергіі — адбіраем цяпло, якое зыходзіць ад печы апальвання, з 2002 года завод змог поўнасцю адмовіцца ад закупак цеплаэнергіі. Калі найбольш аптымальным палівам стаў газ — пабудавалі газаправод і газаразмеркавальную станцыю. Зараз жыццё вымушае працаваць над альтэрнатыўнымі крыніцамі энергіі. Многія прадпрыемствы ў Еўропе выкарыстоўваюць пылавугальную сумесь. Магчыма, і мы пойдзем па гэтым шляху. Пакуль узважваем усе «за» і «супраць». Аднаго простага параўнання кошту энергарэсурсаў недастаткова — вельмі важны ўдзельны расход на выпуск адзінкі вырабу, эканамічны эфект і г. д. Не менш важны і экалагічны фактар. Той жа вугаль згарае не поўнасцю, і прадукты гарэння выкідваюцца ў атмасферу. Літаральна днямі мне патрапілася інфармацыя пра тое, што ў ЗША энергетычныя кампаніі, якія выкарыстоўваюць вугаль, заплацілі велізарныя штрафы за забруджванне навакольнага асяроддзя... Будзем даследаваць, вывучаць, разбірацца і лічыць.

**— Міхаіл Гурамавіч, падчас нашай леташняй сустрэчы вы неяк адзначылі, што завод вытрымае павышэнне цаны на газ да 90 долараў...**

— Сённяшні дзень паказвае, што амаль двухразовае павелічэнне кошту газу прадпрыемства вытрымала нармальна. Безумоўна, мы і да гэтага не ляле вытворцам керамзітабетонных блокаў эканоміць на цэменце.

**— Як вы адзначылі вышэй, тэхналогіі — гэта важна, але ж гліну абпальваюць людзі... Без вопыту, напрацовак, «ноў-хаў», прафесіяналізму тут не абысціся...**

— Абсалютна правільна. І мы не без падстаў ганарымся сваім калектывам. Увогуле, наша прадпрыемства адзінае ў Беларусі, дзе захаваўся навуковы і інжынерны патэнцыял па керамзітнай тэматыцы.

Натуральна, Новалукомль — горад невялічкі. Набраць тут кваліфікаваны персанал на момант адкрыцця завода было немагчыма. Таму першыя спецыялісты прыйшлі на прадпрыемства 30 гадоў таму з віцебскага завода «Керамік». Зараз у нас адбываецца абнаўленне калектыву — тыя 25—30-гадовыя работнікі, што стаялі каля вытокаў прадпрыемства, выходзяць на пенсію. Аднак нейкага кадравага дэфіцыту не будзе. У тым ліку і па прычыне таго, што справу бацькоў паспяхова працягваюць дзеці. Вельмі важна, што маладыя людзі прыходзяць да нас з веданнем асаблівасцяў вытворчасці, загадзя добра ўяўляюць, што іх чакае на заводзе. Гэта значна скарачае час адаптацыі маладых спецыялістаў. Сёння ў нас працуе даволі многа «керамічных» дынастый.

## «Будучыню прадпрыемства даверылі маладым»

**Старшыні назіральнага савета і спецыялісту па каштоўных паперах ААТ «Завод керамзітавага гравію г. Новалукомль» Гураму Ільічу ЛАЗАРАШВІЛІ** днямі споўнілася 70 гадоў. Ардэнаносец, Заслужаны работнік прамысловасці БССР, гэта ён у далёкіх 70-х з праекта пачынаў будаўніцтва прадпрыемства, па ўсіх неабсяжных


11


5

прасторах былога СССР збіраў абсталяванне і спецыялістаў, а потым 23 гады паспяхова кіраваў заводам.

— І ў той далёкі час лёгка не было. Аднак мы свята верылі, што робім вялікую, патрэбную людзям справу. Працавалі на ўздыме, азартна, з энтузіязмам. Ведалі толькі слова «патрэбна». Пад гэтым лозунгам у 1987-м пасля мадэрнізацыі печаў павялічылі выпуск прадукцыі адразу на 40 працэнтаў, а ў 1989-м — вывелі завод на другое месца ў Савецкім Саюзе па аб'ёме выпуску керамзіту...

Калі прадпрыемства ўзначаліў сын — я вельмі хваляваўся: гэта вялікая адказнасць кіраваць такім калектывам, ды і час для галіны быў не лепшым. Міхаіл справіўся. І гэта ацэнка не бацькі, а спецыяліста, які з 1963 года працуе на керамзітавай вытворчасці. Бацьку хваліць сына заўсёды лёгка і прыемна, таму скажу толькі адно: у цяперашніх вельмі жорсткіх для вытворцы ўмовах працаваць так, як ён я б не змог.

Сёння з упэўненасцю магу сцвярджаць — я шчаслівы чалавек: усе гэтыя гады я кожную раніцу з вялікім жаданнем ішоў на завод і з не меншым жаданнем пасля працы спяшаўся дадому.

## «Завод стаў сям'ёй, а сям'я — на заводзе»

**Галіна Міхайлаўна ХАРКЕВІЧ, намеснік дырэктара па эканоміцы**, прыйшла працаваць на новалукомльскі керамзітавы завод у 1979 годзе з Лідскага камбіната будаўнічых матэрыялаў. 28 гадоў адпрацавала галоўным бухгалтарам. Поруч з ёй працуюць яе муж — Аляксандр Трафімавіч (начальнік аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння), сын Аляксандр (дыспетчар) і нявестка Аляксандра (эканаміст).

— Работнікі, якія стаялі каля вытокаў прадпрыемства і працуюць па сённяшні дзень, разам з заводам перажылі і савецкую стабільнасць, і наступныя падзенні, і цяперашні ўзлёт, — расказала Галіна Міхайлаўна. — Аднак, думкі — некуды сысці — не ўзнікала нават у самыя цяжкія часы (1999—2000 гг.), калі прадпрыемства прастойвала, не вылазіла з крэдытаў, а я, як галоўны бухгалтар, у банк хадзіла як на працу...

У тым, што завод сёння стабільна працуе, развіваецца, вялікая заслуга нашага дырэктара. Міхаіл Гурамавіч — кіраўнік ужо новай фармацыі, які арыентуецца ў рынкавых умовах, як рыба ў вадзе, не баіцца рызыкаваць. Нездарма ж з чатырох падобных прадпрыемстваў у Беларусі выжыла толькі наша... Сёння самае складанае не вырабіць прадукт, а яго прадаць. З чым мы, дзякуючы сувязям, наладжаным кіраўніцтвам, паспяхова і спраўляемся.

Асабліва многа зроблена за апошні год. Змянілася нават аблічча завода: паўсюль чысціня, клумбы, кветкі, дарожкі з пліткі, прыгожыя будынкі... На Дзень пажылых людзей запрашалі ветэранаў прадпрыемства. Яны проста не пазналі завод, якому аддалі многія гады жыцця.

## «Людзі ганарацца сваім прадпрыемствам»

**Начальнік цэха вытворчасці керамзіту Рыгор Пятровіч ЦІМАФЕЕЎ** і яго жонка эканаміст Галіна Вікенцьеўна пераехалі ў Новалукомль і прыйшлі на завод яшчэ за два месяцы да яго пуску — у жніўні 1977 года. Рыгор Пятровіч пачынаў простым электраманцёрам, потым працаваў энергетыкам, начальнікам кар'ера, дыспетчарам. Сёння на прадпрыемстве працуюць двое іх сыноў — Дзмітрый (загадчык склада) і Вячаслаў (абпальшчык у цэху бацькі), нявестка Марыя (юрыст).

— За гэтыя гады завод вырас, набраў моц, — расказаў Рыгор Цімафееў. — Пачыналі мы ўсяго з дзвюх печаў, сёння іх пяць. Значна змянілася і аблічча прадпрыемства, умовы працы, быту. Работа стала больш аўтаматызаванай, аднак па-ранейшаму канчатковы вынік залежыць ад людзей. Спецыялісты на прадпрыемстве падабраны высакакласныя. А галоўнае, людзі ганарацца сваёй працай, сваім заводам.

**Сяргей ПРОТАС, Алена ДАЎЖАНОК. Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

## НА ЗДЫМКАХ:

**1. Дырэктар новалукомльскага керамзітавага завода Міхаіл ЛАЗАРАШВІЛІ: «Гэта сцягі тых еўрапейскіх краін, куда мы экспарціруем сваю прадукцыю».**
**2. Кіраўнік аддзела маркетынгу Георгій ЛАЗАРАШВІЛІ і яго калектыў.**
**3. Сховішча гліны. Сюды дастаўляюць сыравіну, здабытую ў кар'еры.**
**4. Здымшчык гатовай прадукцыі Васіль ПАЗНЯК.**
**5. Намеснік галоўнага бухгалтара Святлана Гарбатых.**
**6. У руках сапраўдных майстроў звычайны керамзіт можа набыць нават выгляд толькі што разрэзанага ствала дрэва.**
**7. Тут працуюць магутныя печы.**
**8. Георгій КРЫЦКІ — адзін з самых вопытных абпальшчыкаў.**
**9. Прадукцыю цэха керамзітабетонных вырабаў аглядаюць майстар Руслан ГЛЕЧАН і здымшчык Іван СЫЦІК.**
**10. Ганчары Алена РЫЖАНКОВА і Настасся ШЛЯХЦІЧ.**
**11. Першы дырэктар завода Гурам ЛАЗАРАШВІЛІ.**
**12. Рознакаляровы керамзіт вельмі спатрэбіцца азеляніцелям і ландшафтным дызайнерам. Прыклад таму — афармленне тэрыторыі перад галоўнай прахадной завода.**

12